У Беларусі ў гэты перыяд *не праводзяцца рэгулярныя сацыялагічныя апытанні аўдыторыі ўсяго медыясектара*, але ёсць рэгулярныя апытанні такіх яго сегментаў, як тэлебачанне і радыё, а таксама анлайн-даследаванне кампаніяй Gemius аўдыторыі сайтаў (яны даступны замоўцам, у адкрытым доступе публікуюцца фрагментарна). Апошняе апытанне медыясектара незалежнымі сацыёлагамі адбылося ў 2015 годзе (SATIO research commissioned by Internews in 2015. Research was conducted in 2015 by face to face interviews; respondents of 18 and older, living in cities). У 2019 годзе была апублікавана справаздача аб правядзеннні сацыялагічнага апытання аўдыторыі медыясектара, які ў 2017-2019 гадах праводзіў Інфармацыйна-аналітычны цэнтр пры Адміністрацыі прэзідэнта Беларусі (ІАЦ). У красавіку 2019 года ІАЦ быў ліквідаваны. У 2019 годзе па заданні Міністэрства інфармацыі сацыялагічнае даследаванне асаблівасцяў функцыянавання нацыянальнага інфармацыйнага поля праводзіў Цэнтр сацыялагічных і палітычных даследаванняў БДУ.

## Абмежаванне дзейнасці журналістаў і яе наступствы

Да знешніх фактаў уздзеяння на медыяасяроддзе ў Беларусі можна аднесці перыядычнае «закручванне шрубак» перад, у працэсе і пасля электаральных кампаній. У 2015 годзе прэзідэнцкія выбары, у 2017 годзе мясцовыя выбары і ў 2019 годзе парламенцкія выбары адбываліся ў заведама неканкурэнтных умовах, без інтрыгі і без цікавасці грамадства. Гэта суправаджалася кропкавымі рэпрэсіямі і зменай медыйнага заканадаўства (пра гэта ніжэй).

У прэзідэнцкія выбары 2020 года Беларусь увайшла на фоне глыбокага палітычнага крызісу і на піку непапулярнасці прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі. Адбылося абуджэнне грамадства, з'явіўся інтарэс масавай аўдыторыі да палітычнай сферы. Недзяржаўныя беларускія медыя і замежныя медыя, якія працуюць для беларускай аўдыторыі, актыўна асвятлялі выбарчы працэс, вулічныя акцыі, пісалі пра масавыя затрыманні пратэстоўцаў і збіццё затрыманых, давалі трыбуну для экс-кандыдата ў прэзідэнты Святланы Ціханоўскай, якая не прызнала абвешчаныя ЦВК вынікі выбараў і ў чыю перамогу на выбарах верылі шматлікія апаненты кіроўнага рэжыму. У адказ *кіроўны рэжым перайшоў ад кропкавых рэпрэсій* («справа БелТА», пераслед журналістаў, якія без акрэдытацыі пры МЗС Беларусі працуюць на замежныя СМІ) *да сістэмных* — журналістаў затрымліваюць на несанкцыянаваных акцыях у незалежнасці ад наяўнасці пасведчання, рэдакцыйнага задання і адмысловага абазначэння на вопратцы; усе беларускія грамадзяне, якія працуюць на замежныя СМІ, былі пазбаўлены акрэдытацыі пры МЗС Беларусі і адпаведна атрымалі забарону на працу ў Беларусі ў якасці замежных карэспандэнтаў; журналістаў пачалі прыцягваць не толькі да адміністрацыйнай, але і да крымінальнай адказнасці за прафесійную дзейнасць; шэраг сайтаў незалежных СМІ быў заблакаваны для доступу беларускай аўдыторыі.

Абмежаванне магчымасцяў журналістаў у 2020 годзе прысутнічаць на вулічных акцыях пратэсту заканамерна прывяло да пашырэння рэдакцыямі выкарыстання кантэнту, створанага карыстальнікамі (User-Generated Content, UGC) замест фота і відэа, зробленага на прафесійным абсталяванні і прафесійнымі журналістамі. Рэдакцыі набылі навыкі ментарынгу стварэння UGC, сартыроўкі і праверкі кантэнту, які паступае ад ананімных карыстальнікаў. Былі зафіксаваны некалькі спробаў падмануць рэдакцыі і падсунуць ім фэйкавы кантэнт.

Абмежаванне доступу да некантралюемых беларускай дзяржавай сайтаў на некалькі сутак пасля выбараў 9 жніўня 2020 году прымусіла шэраг СМІ адкрыць каналы ў мэсэнджары Telegram і размяшчаць там поўнавартасныя матэрыялы, бо яны там былі даступны прынамсі ў тэкставым рэжыме. Гэта ў сваю чаргу прывучыла аўдыторую сачыць за навінамі не на сайтах, а ў Telegram.

Самы папулярны інтэрнэт-рэсурс Беларусі TUT.BY з 1 кастрычніка 2020 года па загадзе Міністэрства інфармацыі на тры месяцы быў пазбаўлены статусу СМІ. 3 снежня 2020 года Эканамічны суд Мінска па зыску Мінфінарма зусім пазбавіў гэты партал статусу СМІ. Рэдакцыя TUT.BY працягнула сваю працу, заснаваўшы праэкт Zerkalo.

## Змены заканадаўства

Змены Закона «Аб сродках масавай інфармацыі» за справаздачны перыяд былі прыняты 20 снежня 2014 года, 11 мая 2016 года і 17 ліпеня 2018 года. *Адказнасць гаспадароў сайтаў за распаўсюд выказванняў наведвальнікаў* пры змене Закона «Аб СМІ» была ўведзена ў 2015 годзе. Многія з выдаўцоў адключылі каментары, бо не мелі лішніх грошай на іх мадэрацыю.

*Рэгістрацыя інтэрнэт-СМІ.* З 1 снежня 2018 года ўступілі ў дзеянне папраўкі ў Закон «Аб СМІ», якімі ўводзіцца такое новае паняцце, як «сеткавае выданне» — гэта інтэрнэт-рэсурс, які прайшоў дзяржаўную рэгістрацыю. Паказальна, што інтэрнэт-рэсурс, не зарэгістраваны ў якасці сеткавага выдання, СМІ не з'яўляецца. На незарэгістраваныя інтэрнэт-рэсурсы распаўсюджваюцца абавязкі СМІ, але не правы, статус СМІ будзе распаўсюджвацца толькі на тых, каму дзяржава дазволіць гэты статус мець. У 2019 годзе Мінінфарм зарэгістраваў 20 сайтаў у якасці сеткавых выданняў (14 дзяржаўных, 6 недзяржаўных).

*Забарона ананімных каментароў.* Яшчэ адна з інавацый — забарона з 1 снежня 2018 года ананімных каментароў. У законе сказана: «не дапускаць размяшчэнне на інтэрнэт-рэсурсе, у сеткавым выданні інфармацыйных паведамленняў і(або) матэрыялаў (у тым ліку каментаванне) іншымі карыстальнікамі без іх папярэдняй ідэнтыфікацыі». 23 лістапада 2018 года Савет міністраў Беларусі прыняў Пастанову № 850 «Аб зацвярджэнні Палажэння аб парадку папярэдняй ідэнтыфікацыі карыстальнікаў інтэрнэт-рэсурсу, сеткавага выдання». У адпаведнасці з нарматыўным актам, «уладальнік інтэрнэт-рэсурсу ажыццяўляе актывацыю ўліковага запісу карыстальніка шляхам адпраўкі кода актывацыі ў СМС-паведамленьні на паказаны пры запаўненні карыстацкай дамовы нумар мабільнага тэлефона карыстальніка ці з выкарыстаннем іншых ідэнтыфікацыйных дадзеных і тэхнічных сродкаў, якія дазваляюць ідэнтыфікаваць асобу карыстальніка. Пры гэтым адзін нумар мабільнага тэлефона і(або) адзін камплект іншых ідэнтыфікацыйных дадзеных могуць быць выкарыстаны для рэгістрацыі не больш аднаго ўліковага запісу карыстальніка на кожным канкрэтным інтэрнэт-рэсурсе».

З кастрычніка 2014 года пры Міністэрстве інфармацыі Беларусі дзейнічае Рэспубліканская экспертная камісія па ацэнцы інфармацыйнай прадукцыі на прадмет наяўнасці (адсутнасці) у ёй прыкмет праяўлення экстрымізму. Паводле

апошніх даступных дадзеных, па стане на 1 кастрычніка 2019 года гэта камісія правяла даследаванне 1900 узораў інфармацыйнай прадукцыі і ў 591 з іх зафіксавала наяўнасць прыкмет праявы экстрымізму (распальванне расавай, нацыянальнай або рэлігійнай варажнечы або розні, прапаганда выключнасці, перавагі або непаўнавартасці грамадзян па прыкмеце іх адносін да расавай, нацыянальнай, рэлігійнай прыналежнасці, прапаганда і публічная дэманстрацыя нацыянальнай сімволікі або атрыбутаў). Міністэрства інфармацыі вядзе Рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў, у якім па стане на 31 снежня 2020 года значылася 172 пазіцыі (інфармацыйная прадукцыя, друкаваныя выданні, кнігі, брашуры, літаратурныя творы, відэаматэрыялы, тэксты песень, CD-дыскі). Адным з прыкладаў актыўнасці гэтай камісіі ў 2018 годзе зрабілася т.зв. «справа Regnum» (суд прызнаў вінаватымі ў распальванні нацыянальнай варожасці трох беларускіх аўтараў агенцтва Regnum і прысудзіў іх да 5 гадоў пазбаўлення волі з адтэрміноўкай выканання прысуду).

## Статыстыка па рэгістрацыі СМІ

Станам на 1 лістапада 2020 года ў Беларусі было зарэгістравана 1628 друкаваных СМІ (722 газеты, 865 часопісаў, 31 бюлетэнь, 8 каталогаў, 2 альманаха), з іх дзяржаўных — 438 (214 газет, 213 часопісаў, 11 бюлетэняў), недзяржаўных — 1190 (508 газет, 652 часопіса, 20 бюлетэняў, 8 каталогаў, 2 альманахі). У ліку дадзеных СМІ — 136 дзяржаўных рэгіянальных друкаваных СМІ, заснавальнікамі якіх выступаюць абласныя, гарадскія і раённыя выканаўчыя камітэты (118 раённых, 9 абласных, 9 гарадскіх). У сегменце масава-палітычных СМІ дамінуе дзяржаўная прэса: агульны разавы тыраж вядучых рэспубліканскіх масава-палітычных газет склаў 263,7 тыс. асобнікаў, дзяржаўнай рэгіянальнай прэсы — 636,5 тыс. асобнікаў (у тым ліку раённыя газеты — 482 тыс. асобнікаў, абласныя газеты — 154,5 тыс. асобнікаў). На тэрыторыі Беларусі распаўсюджваецца каля 3 тыс. замежных друкаваных СМІ, больш за 80% з якіх расійскія.

Станам на 1 лістапада 2020 года ў Беларусі зарэгістравана 261 тэлерадыёвяшчальных СМІ (з іх 180 — дзяржаўнай і 81 — недзяржаўнай формы ўласнасці) living рознай тэматычнай накіраванасці. У Беларусі ажыццяўляюць дзейнасць 98 нацыянальных тэлевізійных СМІ, з іх 44 — дзяржаўных, у тым ліку 10 рэспубліканскіх тэлепраграм: «Беларусь 1», «Беларусь 2», «Беларусь 3», «Беларусь 5», «Беларусь 5 Інтэрнэт», «Беларусь 24» і «НТВ-Беларусь» (заснавальнік — Белтэлерадыёкампанія); «Агульнанацыянальнае тэлебачанне» (ОНТ, заснавальнік — ЗАТ «Другі нацыянальны тэлеканал»); «Сталічнае тэлебачанне» (СТВ) і «Расія-Беларусь» (заснавальнік — ЗАТ «Сталічнае тэлебачанне»).

Станам на 1 лістапада 2020 года ў Беларусі зарэгістравана 163 радыёпраграмы. З іх дзяржаўных — 136, недзяржаўных — 27. Ажыццяўляюць вяшчанне ў FM-дыяпазоне 64 радыёпраграмы.

# Краўдфандынг у Беларусі: імклівае развіццё і сучасны стан

Марыля Гіліца

Пачаткам краўдфандынгу ў Беларусі лічаць 2011 год, калі з'явілася першая пляцоўка па зборы сродкаў «МаеСэнс» — аўкцыён, дзе можна набыць сустрэчу дзеля падтрымкі дабрачынных праектаў. Праз два гады ствараецца Talaka — анлайн-платформа пошуку каманды і аднадумцаў для рэалізацыі ўласных ідэй. Амаль у гэты ж час з'яўляецца Ulej — новая крауд-пляцоўка, якая больш арыентуецца на бізнес-праекты, чым на сацыяльныя і дабрачынныя кампаніі. У 2018 годзе анлайн-часопіс «ИМЕНА», што асвятляў сацыяльныя праблемы ў Беларусі, стаў функцыянаваць і як фондавая пляцоўка, арганізуючы шматлікія зборы сродкаў для вырашэння гэтых праблем. Нарэшце ў 2019 годзе запускаецца MolaMola — падплатформа Ulej, дзякуючы якой можна хутка і аператыўна збіраць грошы на патрэбныя праекты ці вырашэнне грамадскіх праблем.

Досыць доўга сфера краўдфандынгу ў Беларусі заканадаўча спецыяльна не рэгулявалася. Удзельнікі краўдфандынгавых адносін мусілі кіравацца агульнымі нормамі грамадзянскага заканадаўства. Між бакамі маглі заключацца дамовы дарэння, ахвяравання ці прадастаўлення спонсарскай дапамогі альбо дамовы пазыкі ці куплі-продажу[1]. Такім чынам, асноўныя тыпы беларускага краўдфандынгу, якія мелі развіццё, прадугледжвалі кампаніі на аснове дабрачынных, дармовых ахвяраванняў альбо на аснове спансавання праекта ў абмен на пэўны прадукт (кнігу, квіток на канцэрт, дыск, гульню, адзенне і да т.п.). Рэалізоўваць у чыстым выглядзе тып «краўдінвестынг» існыя законы не дазвалялі[2].

У лістападзе 2021 года набыў моц Указ № 196 «Аб сэрвісах анлайн-пазыкі і лізінгавай дзейнасці», прыняты з мэтай урэгуляваць сферу краўдфандынгу. Згодна з ім, у якасці краўдфандынгавых пляцовак могуць выступаць толькі тыя

[1] Каким бывает краудфандинг // «Белорусы и рынок». — 30.01.2022: https://belmarket.by/news/2019/08/06/news-40381.html.

[2] Вот кому белорусы готовы отдавать свои деньги: Talaka о рынке краудфандинга // Probusiness.io. — 26.01.2022: https://probusiness.io/opinion/5503-vot-komu-belorusy-gotovy-otdavat-svoi-dengi-talaka-o-rynke-kraudfandinga.html.

арганізацыі, што былі ўключаны ў адмысловы рэестр Нацбанкам, які мае кантраляваць краўдфандынгавую сферу ў Беларусі. Указ набыў моц адносна нядаўна, і на дадзены момант у публічнай прасторы цяжка знайсці меркаванні і ацэнкі экпертаў наконт таго, як указ паўплывае на развіццё краўдфандынгу ў краіне.

Дабрачыннасць, культура і адукацыя — такімі былі асноўныя кірункі беларускага краўдфандынгу да 2020 года. Напрыклад, значную частку культурніцкіх кампаній складаюць пераклады і выданні кніг, шмат з якіх — на беларускай мове. Дабрачынныя праекты часта запускаюць з мэтай дапамагчы сацыяльнай групе і вырашыць сацыяльныя праблемы, якія не вырашаюцца ў неабходнай ступені на дзяржаўным узроўні. Нярэдка кампаніі запускаюць вядомыя асобы і дзеячы. А вось інавацыйныя тэхналагічныя праекты так і не сталі надта папулярнымі на беларускіх краўд-пляцоўках. Ёсць меркаванне, што беларусы больш цэняць практычныя і сацыяльна значныя праекты[3].

Нельга не сказаць пра ролю беларускага краўдфандынгу падчас барацьбы з пандэміяй COVID-19. Пры неадназначнай палітыцы з боку дзяржавы датычна мераў супраць распаўсюду новай каранавіруснай інфекцыі, вясной 2020 года актыўна запускаліся кампаніі па зборы сродкаў для дапамогі медыкам, установам аховы здароўя, уразлівым сацыяльным групам. Самая буйная ініцыятыва — ByCovid19 — за тры месяцы сабрала каля 360 тыс. долараў. Напэўна, можна і варта адзначыць і мабілізацыйны эфект гэтых кампаній: беларусы аб'ядналіся ў вырашэнні маштабнай праблемы[4].

На дадзены момант з краўдфандынгавых платформ у Беларусі функцыянуе толькі Talaka. З чэрвеня 2020 года страцілі магчымасць працаваць Ulej і MolaMola. У ліпені 2021 года падчас хвалі ліквідацыі арганізацый грамадзянскай супольнасці Беларусі ўладамі было прынята рашэнне аб ліквідацыі платформы «ИМЕНА». Пры гэтым за 2020 год былі запушчаны некалькі значных ініцыятыў дапамогі пацярпелым ад рэпрэсій: BY_help, BYSOL, а таксама адмысловыя фонды ў падтрымку медыкаў, спартыўных і культурных дзеячоў. Яны па сёння збіраюць сродкі і аказваюць дапамогу беларусам у патрэбе, паколькі палітычны крызіс у Беларусі на бягучы момант не вырашыўся.

Паспрабуем каротка апісаць развіццё асноўных краўдплатформ і кампаній у апошнія гады.

---

[3] Вот кому белорусы готовы отдавать свои деньги: Talaka о рынке краудфандинга // Probusiness.io. — 26.01.2022: https://probusiness.io/opinion/5503-vot-komu-belorusy-gotovy-otdavat-svoi-dengi-talaka-o-rynke-kraudfandinga.html.

[4] Пра ўплыў досведу кампаній і ініцыятыў падчас першай хвалі пандэміі COVID-19, а таксама агулам такой з'явы як краўдфандынг на змены ў характары беларускага грамадства нярэдка кажуць эксперты.

## Talaka

Краўдфандынгавая платформа Talaka[5] была запушчана ў Беларусі ў 2013 годзе. Напачатку гэта была анлайн-платформа, праз якую можна было толькі знайсці каманду і аднадумцаў для рэалізацыі ідэй і праектаў. Праз два гады, у 2015-м, на Talaka з'явілася магчымасць збіраць грошы на ажыццяўленне праектаў праз адмыслова запушчаны анлайн-сэрвіс «Талакошт».

Важна акцэнтаваць, што сама Talaka з'яўляецца не толькі платформай для збору сродкаў, але і супольнасцю актыўных людзей. На сайце зарэгістравана больш за 53 тыс. чалавек, якія пазначылі свае ўменні і навыкі і могуць быць гатовы дапамагчы праектам ў выкананні канкрэтных задач. Аўтары праектаў, у сваю чаргу, могуць самі звязвацца з патрэбнымі адмыслоўцамі і прапаноўваць ім удзел. У тым ліку ў гэтым заснавальнік платформы Яўген Клішэвіч бачыў розніцу паміж Talaka і, напрыклад, вядомай пляцоўкай Kickstarter[6].

Ніжэй на графіку прадэманстравана, як суадносяцца тэматыкі праектаў на Talaka (актуальных і завершаных, са зборам сродкаў і без).




[5] Слова «талака» называе ў беларусаў і іншых славянскіх народаў даўні народны звычай калектыўнай дапамогі ў гаспадарчых работах.
[6] Што такое «прынцып талакі» // «Наша Ніва». — 19.01.2022: https://nashaniva.com/?c=ar&i=139433.

Больш за палову ўсіх праектаў складаюць культурніцкія, дабрачынныя і адукацыйныя праекты. Такія тэндэнцыі беларускіх краўдфандынгавых пляцовак неаднойчы адзначалі іх заснавальнікі і эксперты[7-8].

Сёння на платформе Talaka 2455 актыўных праектаў, з іх 621 кампанія са зборам сродкаў[9]. За ўвесь час існавання пляцоўкі было сабрана не менш за 1436782 беларускіх рублёў. Вось некалькі найбольш яскравых і важных праектаў: падтрымка папулярных курсаў беларускай мовы «Мова Нанова», першы ў Беларусі помнік Тадэвушу Касцюшцы, рэстаўрацыя абсерваторыі мінскага планератыя, арганізацыя маштабнага свята да 100-годдзя БНР, падтрымка прыватнага футбольнага клуба «Крумкачы», падтрымка праекта-часопіса «ИМЕНА». Апошні праект стаў самым маштабным зборам у Беларусі на 2017 год (сабраў 21526 беларускіх рублёў, альбо 10700 долараў).

Платформа Talaka дзейнічае па сёння, у адрозненне ад сітуацыі з іншымі краўдфандынгавымі пляцоўкамі Беларусі, гаворка пра якія пойдзе далей.

## Ulej

Краўдфандынгавая платформа Ulej пачала працаваць з красавіка 2015 года. Ініцыятарам стварэння быў Эдуард Бабарыка. Партнёрам у сферы прымання пераводаў ад фізічных асобаў выступіў «Белгазпрамбанк».

У адрозненні ад іншых краўд-пляцовак, Ulej першапачаткова арыентаваўся больш не на дабрачынныя ці сацыяльныя праекты, а на бізнес, які займаецца вытворчасцю новых прадуктаў у сферы b2c. Карысць пляцоўкі бачылася ў магчымасці для бізнесу бяспечна пратэставаць прадукт і ў выпадку поспеху запусціць вытворчасць.

Па словах заснавальнікаў, кожны трэці праект на Ulej быў паспяховы, а сярод літаратурных праектаў патрэбную (ці большую) суму збіралі 60% праектаў[10]. Сярэдні чэк па рэалізаваным праектам складаў 4000-5000 беларускіх рублёў[11], а сярэднія ахвяраванні беларусаў — 30-40 беларускіх рублёў.

[7] Вот кому белорусы готовы отдавать свои деньги: Talaka о рынке краудфандинга // Probusiness.io. — 26.01.2022: https://probusiness.io/opinion/5503-vot-komu-belorusy-gotovy-otdavat-svoi-dengi-talaka-o-rynke-kraudfandinga.html.

[8] Пры чытанні графіка трэба ўлічваць: лічба ўнутры сектара азначае, што столькі праектаў належаць у тым ліку да дадзенай катэгорыі, але не толькі да яе. Гэта абумоўлена параметрамі сайта, якія дазваляюць размяркоўваць праекты адначасова да некалькіх катэгорый.

[9] Дадзеныя сайта www.talaka.org.

[10] Краудфандинг в Беларуси: как и благодаря чему это работает // myfin.by. — 25.01.2022: https://myfin.by/stati/view/10296-kraudfanding-v-belarusi-kak-i-blagodarya-chemu-eto-rabotaet.

[11] Інфармацыя на 2018 год.

«З нашага досведу можам дакладна сказаць, што найбольш ахвотна беларусы фінансуюць праекты ў сферы музыкі, літаратуры і мастацтва, а таксама праекты сацыяльнага характару. Мне здаецца, гэтак адбываецца не ў апошнюю чаргу з прычыны наяўнасці фізічнага (матэрыяльнага) выніку: потым можна паслухаць альбом, атрымаць новую кніжку ці схадзіць на прэм’ерную пастаноўку ў тэатр», — зазначала PR-менеджарка Ulej Вольга Мжэльская[12].

Агулам за гады працы (2015-2020) на Ulej быў запушчаны 951 праект, 357 праектаў (≈ 37,5%) скончыліся паспяхова і былі рэалізаваны. Таксама цікава, што сярод іх: 112 выдадзеных кніг, большасць якіх — на беларускай мове, 37 мерапрыемстваў па краіне, 29 дызайнерскіх прадуктаў, 29 лічбавых медыяў забаўляльнага кантэнту, 29 музычных альбомаў і кліпаў, 20 фільмаў і спектакляў[13]. З шэрагу праектаў, рэалізаваных на Ulej, паўсталі бізнесы.

З 11 чэрвеня 2020 года функцыянаванне Ulej і MolaMola (гаворка пра якую ідзе ніжэй) прыпынілася ў сувязі з блакіроўкай рахункаў кампаніі партнёрам «Белгазпрамбанкам»[14].

## MolaMola

MolaMola, як падплатформа пляцоўкі Ulej, з’явілася ў сакавіку 2019 года. Яе заснавалі грамадскі актывіст Антон Матолька і Эдуард Бабарыка. Партнёрам таксама выступіў «Белгазпрамбанк».

За ўвесь час працы (каля 15 месяцаў) на платформе MolaMola запусцілася каля 2000 кампаній, завяршылася — каля 550 праектаў. Асобна варта адзначыць шматлікія праекты дапамогі, паўсталыя ў сувязі з пандэміяй COVID-19. Існаванне пляцоўкі MolaMola адыграла вялікую ролю ў магчымасці рэалізаваць такія зборы грошай на дапамогу медыкам, установам аховы здароўя і інш. Менавіта на MolaMola праходзіў збор сродкаў асноўнай «супрацькавіднай» кампаніі ініцыятывы ByCovid19.

Летам 2020 года заснавальнікі пляцоўкі ажыццявілі запуск MolaMola ва Украіне. А таксама адзначылі, што шукаюць варыянты аднаўлення працы платформы ў Беларусі[15].

---

[12] Народны стартап // 34mag.net. — 25.01.2022: https://34mag.net/ru/post/narodny-startap.

[13] Інфармацыя поста з Фэйсбук-старонкі Ulej. — 26.01.2022: https://www.facebook.com/ulejby/posts/2546294032297649.

[14] Апошняе можа быць звязана з заведзенымі ў дачыненне да банка крымінальнымі справамі, а таксама фактам, што заснавальнікам платформ быў Эдуард Бабарыка — сын прэтэндэнта ў кандыдаты ў прэзідэнты Віктара Бабарыкі. Гл.: «Белгазпромбанк» заблокировал счета краудфандинговых платформ MolaMola и Ulej // «Еўрарадыё». — 29.01.2022: https://euroradio.fm/ru/belgazprombank-zablokiroval-scheta-kraudfandingovyh-platform-molamola-i-ulej.

# «ИМЕНА»

«ИМЕНА» — гэта некамерцыйная дабрачынная медыяплатформа, якая распавядае гісторыі пра сацыяльныя праблемы, што існуюць у Беларусі, і ажыццяўляе збор сродкаў для грамадскіх арганізацый, якія гэтыя праблемы вырашаюць.

Платформа з’явілася 11 красавіка 2016 года як анлайн-часопіс. А з 2018 года стала функцыянаваць і як фонд, агулам маючы два дабрачынныя рахункі: на дапамогу сацыяльным праектам і на падтрымку самой платформы.

Мэта платформы — развіваць сацыяльную інфраструктуру Беларусі. Пры гэтым акцэнт робіцца не на кропкавай грашовай дапамозе асобнаму чалавеку, а на фінансавай падтрымцы некамерцыйных праектаў і грамадскіх інстытутаў, якія дапамогаюць многім людзям, вырашаюць канкрэтныя грамадскія праблемы.

За час існавання праект «ИМЕНА» сабраў каля 7 млн беларускіх рублёў, запусціў каля 40 праектаў і дапамог больш за 47 тыс. чалавек. Як правіла, праекты на платформе збіраюць ад некалькі дзясяткаў да амаль 300 тыс. беларускіх рублёў.

Каб мець уяўленне пра кірункі праектаў на платформе «ИМЕНА», можна абагульніць іх наступным чынам:

- дапамога дзецям;
- дапамога людзям з генетычнымі захворваннямі;
- падтрымка жанчын, якія церпяць сямейны гвалт;
- падтрымка бесхацінцаў;
- дапамога людзям з псіхічнымі захворваннямі, а таксама іх родным і іншыя напрамкі.

Сярод найбольш вялікіх збораў варта выдзеліць праект «Няня вместо мамы», які сабраў больш за 633 тыс. беларускіх рублёў. Праект накіраваны на дапамогу і ўход за малышамі-сіротамі, які ажыццяўляюць нанятыя на сабраныя грошы сацыяльныя няні. Згодна інфармацыі на сайце платформы, да 2015 года ў бальніцах Беларусі не была прадугледжана пазіцыя такіх спецыялістаў.

У час пандэміі COVID-19 платформа «ИМЕНА» рэалізоўвала шэраг праектаў дапамогі («Дапамога медпрацаўнікам у барацьбе з COVID-19», «Добры тэлефон» для людзей сталага веку падчас каранавірусу», «Сродкі абароны для настаўнікаў падчас каранавірусу»), брала ўдзел у сумеснай кампаніі ByCovid19.

Пасля падзей жніўня 2020 года «ИМЕНА» запусцілі праект дапамогі пацярпелым падчас пратэстаў. Лячэнне і рэабілітацыя ў клініках, медыцынскія даследаванні, аперацыі, набыццё медыцынскага абсталявання, псіхатэрапеўтычнае лячэнне — усё гэта забяспечвалася для пацярпелых у межах праекта.

[15] Mola Mola запускается в Украине // dev.by. — 20.01.2022: https://dev.by/news/mola-mola-ukraine.

Кампанія сабрала непараўнальна вялікую суму — больш чым 1 млн 109 тыс. беларускіх рублёў.

У ліпені 2021 года падчас хвалі ліквідацый некалькі сотняў НДА Беларусі было прынята рашэнне Мінгарвыканкама аб ліквідацыі платформы «ИМЕНА». З таго часу праца пляцоўкі замарожана, рахункі арыштаваны. Заснавальніца платформы адзначыла, што праз гэту сітуацыю больш за ўсё пацерпяць праекты, для якіх «ИМЕНА» былі адзінай альбо асноўнай крыніцай фінансавання[16].

## Ініцыятывы, паўсталыя ў сувязі з палітычным крызісам 2020 года

### BY_help

Грамадская ініцыятыва BY_help узнікла яшчэ ў сакавіку 2017 года на хвалі масавых арыштаў пасля пратэстаў супраць т.зв. «дэкрэта аб дармаедах». Тады збор сродкаў на дапамогу сем'ям пацярпелых запусціў праваабаронца і грамадзянскі актывіст Андрэй Стрыжак разам з Аляксеем Лявончыкам і Юліяй Дарашкевіч.

З нарастаннем палітычнага крызісу 2020 года BY_help пачаў аказваць фінансавую дапамогу людзям, якіх аштрафавалі ці арыштавалі за ўдзел у акцыях пратэсту у падтрымку незалежнасці Беларусі.

Пачынаючы з чэрвеня 2020 года, ініцыятыва дапамагае пацярпелым ад рэпрэсій падчас перадвыбарчай кампаніі і ў выніку падзей пасля выбараў. Дапамога ініцыятывы ўключае аплату штрафаў і кампенсацыі за адбытыя суткі, аднаразовыя кампенсацыі на лячэнне і рэабілітацыю цывільных асобаў, якія пацярпелі ад разгонаў пратэстаў і падчас затрыманняў, выплаты сем'ям загінулых падчас пратэстаў ці затрыманых у СІЗА і турмах, аплата паслуг адвакатаў[17]. За 15 месяцаў працы ініцыятывай было сабрана больш за 12 млн беларускіх рублёў, дапамогу атрымалі каля 12,5 тыс. чалавек[18].

У першай палове верасня 2020 года ініцыятыва BY_help запусціла асобную кампанію па падтрымцы незалежных медыяў і журналістаў, якія пацярпелі ад рэпрэсій — Media Solidarity Belarus Campaign. Сабраныя грошы ідуць на абарончыя сродкі для журналістаў, стыпендыі і дапамогу журналістам у патрэбе, забеспячэнне часовай рэлакацыі, а таксама на падтрымку рэдакцый, якія шукаюць

[16] Власти Беларуси закрывают «Имена», лишая помощи тысячи белорусов // dw.com. — 20.01.2022: https://www.dw.com/ru/vlasti-belarusi-zakryvajut-imena-lishaja-pomoshhi-tysjachi-belorusov/a-58757680.

[17] Інфармацыя з сайта BY_help. — 24.01.2022: https://www.belarus97.pro.

[18] Фэйсбук-старонка BY_help. — 25.01.2022: https://www.facebook.com/BYhelpBY.

новыя легальныя крыніцы даходу ва ўмовах ціску і абмежаванняў з боку дзяржавы[19]. Ацэньваючы маштабы кампаніі, можна прывесці статыстычныя дадзеныя за першыя 12 месяцаў яе дзейнасці: было сабрана больш за 488 тыс. еўра, падтрымана 144 заяўкі на дапамогу ў рэлакацыі (гэта запыт аказаўся найбольш папулярным), 65 журналістаў былі забяспечаны стыпендыямі, а таксама атрымала дапамогу 61 рэдакцыя СМІ[20].

14 снежня 2021 года рашэннем МУС ініцыятывы BY_help, а таксама Media Solidarity Belarus Campaign былі прызнаны «экстрэмісцкімі фармаваннямі», іх дзейнасць на тэрыторыі Беларусі была забаронена. Кіраўнікі BY_help адзначылі, што будуць працягваць сваю працу.

## BYSOL

Фонд салідарнасці BYSOL быў створаны ў сярэдзіне жніўня 2020 года для падтрымкі і дапамогі тым, хто быў звольнены з працы па палітычных матывах, і тым, хто быў вымушаны з'ехаць з краіны, а таксама структурам, якія ладзяць у Беларусі палітычныя забастоўкі. Кіраўнік фонда — сузаснавальнік BY_help Андрэй Стрыжак.

Як адзначана на сайце BYSOL, за 2020 год выплаты фонда склалі 2,9 млн еўра. У 2021 годзе акрамя сваіх асноўных кірункаў фонд выдаткаваў больш за 17 тыс. еўра на выплаты ветэранам на 9 мая, а таксама больш за 11 тыс. еўра на падтрымку падрыхтоўкі ў школу дзяцей, чые бацькі з'яўляюцца палітзняволенымі.

Фонд вызначае свае асноўныя кірункі: падтрымка дваровых ініцыятыў (акцыі, сімволіка, навучанне і г.д); фінансавая падтрымка сем'яў палітзняволеных; тэрміновая эвакуацыя фігурантаў крымінальных спраў у бяспечнае месца; перанавучанне і працаўладкаванне звольненых па палітычных матывах, а таксама персанальныя зборы пацярпелым ад рэпрэсій.

Асноўную крыніцу фонда складаюць грашовыя ахвяраванні ад людзей з Беларусі, беларусаў замежжа ды неабыякавых грамадзян іншых краін.

Як адзначаў кіраўнік BYSOL у адным з інтэрв'ю, самы пікавы час па запросах аб дапамозе быў у жніўні-лістападзе 2020 года[21].

Кажучы пра маштабы грашовых збораў, можна адзначыць, што за першыя чатыры з паловай месяцы працы фонд сабраў каля 3,3 млн еўра[22].

---

[19] Інфармацыя з сайта Media Solidarity Belarus Campaign. — 24.01.2022: https://sites.google.com/belarus97.pro/media/home.

[20] Інфармацыя Фэйсбук-старонкі Media Solidarity Belarus Campaign. — 25.01.2022: https://www.facebook.com/mediasolidarity/posts/365009975342531.

[21] Андрэй Стрыжак: «Кампаніі BySol і Byhelp сумесна перадалі людзям каля 7 млн эўра» // «Радыё Свабода». — 26.01.2022: https://www.svaboda.org/a/31551031.html.

[22] Інфармацыя з сайта BYSOL. — 20.01.2022: https://bysol.org/be/about/stats.

Таксама варта дадаць, што ў 2020-2021 годзе былі створаны профільныя спецыялізаваныя фонды салідарнасці, як то: Беларускі фонд культурнай салідарнасці (Беларуская Рада культуры)[23], Беларускі фонд спартыўнай салідарнасці[24], Фонд медыцынскай салідарнасці Беларусі[25]. Адзін з адметных праектаў апошняга часу — стварэнне платформы лекарскіх анлайн-кансультацый «eЗдароўе» (супольна з ініцыятывай «Голас»)[26] для дапамогі беларусам падчас складанай палітычнай і эпідэміялагічнай сітуацыі ў краіне. Фонды знаходзяцца ў камунікацыі з BYSOL.

[23] Інфармацыя Фэйсбук-старонкі «Беларуская Рада Культуры». — 25.01.2022: https://www.facebook.com/bcsfbel.

[24] Інфармацыя з сайта «Беларускага фонда спартыўнай салідарнасці». — 25.01.2022: https://bssf.team/%20.

[25] Інфармацыя з сайта «Фонда медыцынскай салідарнасці Беларусі». — 25.01.2022: https://bymedsol.org.

[26] Сайт платформы «Голас». — 26.01.2022: https://belarus2020.org/home.

# Роль пророссийских общественных организаций в Беларуси

Татьяна Чулицкая

Влияние России на гражданское общество в бывших советских странах находится в центре внимания многих политиков, журналистов и исследователей. Ряд исследовательских работ зарубежных авторов (Kłysiński & Żochowski 2016; Lutsevych 2016; Mazepus et al. 2021), а также связанных с Беларусью исследовательских центров (в частности, iSANS) анализируют тему российского влияния в Беларуси.

При определенной разнице в фокусах исследований большинство из них сходится в том, что одним из главных субъектов проведения российских интересов в Беларуси является институт православной церкви (ISANS 2019; Kłysiński and Żochowski 2016). Беларусская православная церковь (БПЦ) институционально подчинена и является частью Российской православной церкви (РПЦ). Значительное влияние в таких исследованиях уделяется также организациям, которые либо институционально связаны с Россией (при помощи поддержки, получаемой непосредственно от российского посольства, Россотрудничества и пр.), либо открыто заявляют о своей пророссийской направленности и идентичности (например, казаки, трансформировавшееся в партийную инициативу движение «Союз» и пр.). Вместе с тем, степень реального влияния и поддержки данных организаций беларусским обществом остается малоизученным.

Данный обзорный материал основан на исследовании влияния внешних акторов (ЕС и России) на ситуацию в Беларуси и Украине, проведенном в рамках проекта EU-STRAT[1]. В исследовании рассматривались инициативы, в которых российское влияние и присутствие наиболее очевидны.

[1] В том числе опубликованной по итогам исследования статьи: Mazepus et al. (2021): Civil society and external actors: how linkages with the EU and Russia interact with socio-political orders in Belarus and Ukraine, East European Politics в журнале East European Politics.

## Содержательные/идейные основания деятельности пророссийских организаций в Беларуси

В содержательном отношении организации, связанные с Россией (здесь и далее по тексту — пророссийские[2]), фокусируются на общей истории, традиционной идентичности, связанной с общими языком и культурой. В целом они основаны на прославлении прошлого, традиционных ценностей и сохранении существующего (недемократического) status quo в Беларуси, которое во многом обусловлено связями с Россией. Зачастую эти содержательные основания выстраиваются на противопоставлении идее «Запада».

С позиций России, Беларусь и происходящие в ней события рассматриваются в контексте понятия «близкое зарубежье», тем самым подчеркиваются общность географических, идейно-ценностных и культурных связей. Одна из важных концепций здесь — понятие «русский мир». Оно отражает амбиции России распространять свое влияние как на региональном, так и глобальном уровнях, а также претензии влиять и участвовать в решении любых вопросов, касающихся данного региона. Концепт «русского мира» также предполагает видение России как самодостаточной цивилизации, которая утратила порядка 25 миллионов своих (русскоязычных) соотечественников после распада СССР. Эти люди, в рамках такого политического подхода, нуждаются в поддержке и даже в защите в случае необходимости[3]. Близким к данному концепту является нарратив о «(восточно-)славянском единстве». Такое «единство» продвигает идею предобусловленного и «естественного» единства россиян, украинцев и беларусов, при этом последние вообще не рассматриваются в качестве самостоятельных наций (Fedor et al. 2017; Mazepus et al. 2021).

Наряду с этими «большими нарративами» мы можем говорить о том, что в случае Беларуси Россия обеспечивает свое влияние посредством продвижения более приземленных, прагматических целей дальнейшей интеграции в политической и экономической сферах в рамках проекта Союзного государства и других продвигаемых Россией интеграционных проектов (в частности, Евразийского экономического союза).

## Механизмы влияния и пророссийские организации в Беларуси

Самыми очевидными с точки зрения определения российского влияния являются организации, создаваемые в регионе в целом и в Беларуси в частности при прямой поддержке российского правительства, посольства или агентств.

[2] Хотя само название «пророссийские» является своего рода упрощением.

[3] Такие идейные основания использовались, в частности, при оккупации Россией Крыма.

Среди последних наиболее влиятельными являются федеральное агентство по делам Содружества независимых государств (СНГ), соотечественников, проживающих за рубежом и по международному гуманитарному сотрудничеству (Россотрудничество), фонд «Русский мир» и Фонд поддержки публичной демократии им. Горчакова (Hudson 2017; Lutsevych 2016; Saari 2014; Mazepus et al. 2021).

В Беларуси эти «агенты русского мира» (Lutsevych 2016) работают со своими партнерами и связанными с ними организациями. Одним из структурных центров, который фокусируется на работе с российской диаспорой, является Координационный совет российских соотечественников (КСОРС) в Беларуси, который функционирует на базе российского посольства (Kłysiński & Żochowski 2016). У Россотрудничества в Беларуси есть три центра в Минске, Бресте и Гомеле, основными направлениями деятельности которых являются: взаимодействие с соотечественниками, культура и искусство, исследования и образование, язык, публичная дипломатия и пр. Фонд «Русский мир» имеет представительство в Брестском государственном университете с 2014 года. Кроме того, в Минске функционирует принадлежащий России Московский центр международного сотрудничества «Московский дом», который, по мнению некоторых исследователей (Kłysiński & Żochowski 2016), играет роль неформального координационного центра пророссийских организаций в Беларуси.

При этом (за исключением БПЦ) беларусское авторитарное правительство не поддерживает (про-)российские инициативы и институты, которые напрямую приходят или заимствуются из России либо ставят целью продвижение российского влияния на политическом уровне. Например, в Беларуси не смогли зарегистрировать в качестве общественной организации инициативу «Бессмертный полк»[4], а проведение ее акций беларусские власти стараются «вписать» в свои собственные мероприятия, посвященные 9 мая. Отказ в регистрации получила и широко анонсированная в начале 2021 года пророссийская партия «Союз»[5]. Очевидно, власти не хотят терять свою «монополию на Россию» в пользу неконтролируемых ими акторов. При этом беларусские власти, будучи сами в орбите российского культурного и идейно-ценностного влияния, не всегда ограничивают или, скорее, не ограничивают взаимодействие с Россией на

---

[4] Более подробно об истории нерегистрации «Бессмертного полка» в Беларуси см.: «Бессмертному полку» в Беларуси отказали в регистрации // Naviny.by [доступ: 20.05.2021]: https://naviny.online/article/20190327/1553694517-bessmertnomu-polku-v-belarusi-otkazyvayut-v-registracii.

[5] О ситуации с инициативой партии «Союз» см: Оспаривать не будем: партия «Союз» прокомментировала отказ в регистрации // Sputnik Беларусь [доступ 20.05.2021]: https://sputnik.by/politics/20210505/1047550841/Osparivat-ne-budem-partiya-Soyuz-prokommentirovala-otkaz-v-registratsii.html.

уровне государственных чиновников или беларусских государственных-негосударственных организаций (ГОНГО).

В качестве примеров прямого влияния России на деятельность общественных организаций в Беларуси мы рассмотрим три группы организаций: культурные, экспертно-образовательные и спортивно-военные. В дополнение мы кратко представим ситуацию с российским влиянием в беларусских ГОНГО.

## Культурные организации

Организации в сфере культуры в Беларуси являются одним из направлений поддержки со стороны российских правительственных агентств и фондов. Содержательно близки к ним и организации по поддержке соотечественников.

Большинство организаций в данной группе относительно «старые» и были основаны еще в 1990-х годах, мы также можем охарактеризовать их как относительно «стабильные». Вместе с тем, они немногочислены (в их состав входит порядка 20-100 человек) и ограничены в наборе своих действий (Union State 2012). Социальной базой таких организаций являются молодежь, женщины, пенсионеры и учителя. Для этих целевых аудиторий предлагаются традиционные образовательные мероприятия, а также образовательные или другие возможности в России. Медийная активность таких организаций ограничена, часто у них нет даже веб-сайтов или страничек в социальных сетях. В целом, несмотря на большое количество, эти организации практически незаметны и неизвестны широкой публике. Примерами относительно активных организаций в данной группе являются: «Русский дом» (в Витебске и Могилеве), «Дом Москвы» (Минск) и маргинальный по количеству, но относительно активный «Белорусский славянский комитет».

## Организации, работающие в сфере образования и исследований

Другой тип пророссийских акторов в Беларуси — это образовательные организации. Они, как правило, работают с молодежью и студентами. На уровне формальных связей и учреждений образования некоторые российские университеты имеют свои филиалы в Беларуси (например, Российский государственный социальный университет, Российский университет экономики в Минске), а также существуют и отдельные российско-белорусские вузы — например, Белорусско-российский университет в Могилеве. Это учебные заведения, которые предлагают образовательные программы, т.е. нельзя сказать, что они созданы исключительно для осуществления российского влияния. Однако при

этом они могут проводить отдельные пророссийские мероприятия (Mazepus et al. 2021).

Как уже отмечалось выше, у фонда «Русский мир» есть представительства в региональных университетах Беларуси — и их целями являются продвижение русского языка, образования и культуры. Кроме того, в Беларуси существуют и другие пророссийские образовательно-экспертные организации. Так, до зимы 2020 года регулярно сообщалось об активностях «Российско-белорусского экспертного клуба», однако в последний год сайт и страницы организации в соцсетях не обновлялись. Также можно отметить деятельность некоторых учреждений и организаций, претендующих на статус экспертных. Например, республиканское общественное движение «Народное согласие», которое выступает с акциями и заявлениями в «защиту русскоязычных», а также презентовало в мае 2021 года претенциозный доклад «Грибница. Цели и методы финансирования белорусской оппозиции странами Запада».

Говоря о международном научном сотрудничестве, российские институты и российское финансирование являются наиболее привлекательными (и доступными в силу разных причин) для беларусских исследователей (Toshkov et al, 2019, 18; Mazepus 2021). Необходимо также отметить, что связи между Россией и Беларусью укрепляются в силу доминирования в образовательной системе Беларуси на всех уровнях русскоязычной учебной и научной литературы.

## Военизированные и спортивные организации

В Беларуси существуют военизированные и спортивные организации, которые поддерживают пророссийскую повестку дня и идеи. Это достаточно широкий круг организаций, включая казачьи, афганские, клубы боевых единоборств и др. (Kłysiński & Żochowski 2016; Lutsevych 2016). Они, как правило, разделяют и продвигают идеи православия и традиционных ценностей, зачастую совмещая их с ностальгией по Советскому Союзу и поддержкой Сталина. Они также продвигают идею славянского единства, патриотизма и противодействия влиянию западных ценностей. На институциональном уровне казаки участвуют в инициируемых БПЦ мероприятиях, а также сами проводят милитаризированные летние лагеря для молодежи. В частности, проведенные в Гродненской области в 2014 году мероприятия привлекли много внимания со стороны экспертов и СМИ[6].

[6] Более подробно об организованных казаками лагерях см.: Навошта казакі трэніруюцца са зброяй у беларускіх лясах // «Еўрарадыё» [доступ 20.05.2021]: https://euroradio.fm/navoshta-kazaki-treniruyucca-sa-zbroyay-u-belaruskih-lyasah.

Эти организации существуют в форме спортивных или военизированных клубов. Информация об их деятельности ограничена, а деятельность, как представляется, носит локальный и спорадический характер. Кроме того, беларусские власти сами не приветствуют и/или даже ограничивают деятельность таких организаций.

## Беларусские ГОНГО как партнеры России

В Беларуси, как и в других недемократических государствах, существуют общественные структуры, которые создаются и используются правительством как для имитации гражданского общества, так и в целях обслуживания интересов власти (ГОНГО). Они получают финансирование из бюджета и, как правило, декларируют широкий охват граждан и большое количество членов[7]. Хотя высокие количественные показатели во многом объясняются принуждением к вступлению и крайне затрудненным (если вообще возможным) выходом из таких организаций.

Получая поддержку со стороны беларусских властей, ГОНГО параллельно довольно активно сотрудничают с различными российскими партнерами и реализуют совместные проекты. Так, к примеру, список партнеров БРСМ включает Россотрудничество, Парламентскую ассамблею Союза Беларуси и России, Белорусскую православную церковь (БПЦ) и другие российские организации[8]. Эта же организация (БРСМ) активно сотрудничает с поддерживаемым российским правительством Российским союзом молодежи (РСМ), регулярно организовывая различные события, связанные со Второй мировой войной и продвижением идей «братства» и «единства» молодежи двух стран. БРСМ поддерживает студенческие отряды, которые регулярно участвуют в мероприятиях с российским участием либо проводящиеся в России[9]. Аналогичные примеры сотрудничества с российскими организациями или даже российскими правительственными структурами можно найти и у других беларусских ГОНГО. Однако необходимо отметить, что данное сотрудничество в реальности может иметь достаточно формальный характер (Mazepus et al. 2021).

---

[7] Например, более 4 млн человек в Федерации профсоюзов Беларуси (ФПБ), 140 тыс. членов в Белорусском союзе женщин (БСЖ).

[8] О партнерах БРСМ см.: Партнеры // БРСМ [доступ 20.05.2021]: https://brsm.by/partners/.

[9] Один из примеров такого сотрудничества: БРСМ и Российские студотряды разработали дорожные карты сотрудничества // БелТА [доступ 20.05.2021]: https://www.belta.by/society/view/brsm-i-rossijskie-studotrjady-razrabotali-dorozhnye-karty-sotrudnichestva-371542-2019.

## Заключение

Подводя итоги, можно говорить о том, что несмотря на значительное количество и разнообразные сферы активностей пророссийских организаций в Беларуси, их реальное влияние на общество является достаточно ограниченным. Связи с Россией, которые существуют на уровне политики, экономики, культуры и религии, являются настолько устоявшимися и сильными, что деятельность общественных организаций (за исключением БПЦ) является во многом формальной и часто направлена скорее на получение ресурсной поддержки, чем на реальную работу с обществом. Уровень реальной поддержки и популярности таких организаций в Беларуси неизвестен.

Вместе с тем, структурные связи Беларуси с Россией через православную церковь, через связь крупных беларусских ГОНГО с российскими политическими акторами и общественными организациями, влияние посредством культуры, медиа и образования представляются более глубокими. Парадоксальным образом параллельно беларусское правительство и Александр Лукашенко пытаются не допустить регистрации, не способствовать и даже в какой-то степени ограничивать деятельность российских инициатив (например, «Бессмертный полк»), пророссийских политических организаций (партия «Союз») или военизированных структур (казачьи лагеря). Частично это можно объяснить уже упомянутым нежеланием потери «монополии на отношения с Россией», а также тем, что в случае российских инициатив, которые связаны с символически значимыми смыслами (например, 9 мая), беларусские власти сами пытаются использовать их для укрепления своей легитимности. В случае политических структур таким ограничителем могло выступать стремление не допустить возникновения любых потенциально значимых оппонентов; а в отношении милитаризированных организаций действует принцип ограничения или недопущения функционирования таких организаций в Беларуси.

## Источники


1. «Belorusskiy Partizan». 2018. «Rossiya khochet sdelat' Mogilev tsentr 'russifikatsii'?" Belorusskiy Partizan, April 18. Accessed March 4, 2021. https://belaruspartisan.by/politic/422377/.
2. «Белорусский партизан». 2018. «Rossiya khochet sdelat' Mogilev tsentr 'russifikatsii'?" Belorusskii Partizan, April 18. Accessed March 4, 2021: https://belaruspartisan.by/politic/422377/.
3. Hudson, V. (2017) 'Russia's Soft Power in the Post-Soviet Space' in Kuhrt, N. & Feklyunina, V. (eds) *Assessing Russia's Power: A Report*, London: King's College.
4. ISANS 2020. Why the Kremlin needs Belarusian political parties. Available at https://isans.org/articles-en/why-the-kremlin-needs-belarusian-political-parties.html.

5. Kłysiński, K., & Żochowski, P. (2016). 'The End Of The Myth of a brotherly Belarus? Russian soft power in Belarus after 2014: the background and its manifestations'. *OSW STUDIES 58*, November 2016.
6. Kulakevich, T. (2014) "Twenty Years in the Making: Understanding the Difficulty for Change in Belarus." *East European Politics and Societies 28(4)*: 887-901.
7. Lutsevych, O. (2016) 'Agents of the Russian World: Proxy Groups in the Contested Neighbourhood', *Chatham House Research Paper* (April): 1-45.
8. Lutsevych, O. (2016) 'Agents of the Russian World: Proxy Groups in the Contested Neighbourhood', *Chatham House Research Paper* (April): 1-45.
9. Mazepus, Honorata, Antoaneta Dimitrova, Matthew Frear, Tatsiana Chulitskaya, Oleksandra Keudel, Nina Onopriychuk & Natallia Rabava (2021): Civil society and external actors: how linkages with the EU and Russia interact with socio-political orders in Belarus and Ukraine, East European Politics.
10. Russkiy Mir (2021). Russian Centers of the Russkiy Mir Foundation, available at https://russkiymir.ru/en/rucenter/.
11. Sedelmeier, U. 2014. "Anchoring Democracy from Above? The European Union and Democratic Backsliding in Hungary and Romania after Accession." JCMS: Journal of Common Market Studies 52 (1): 105-121.
12. Saari, S. (2014) 'Russia's Post-Orange Revolution Strategies to Increase its Influence in Former Soviet Republics: Public Diplomacy porusskii', *Europe-Asia Studies* 66(1): 50-66.
13. Toshkov, Honorata Mazepus, Tatsiana Chulitskaya, Ina Ramasheuskaya, and Natallia Rabava: Effects of Limited Access Orders on Science Policy and Scientific Cooperation, EU-STRAT Working Paper No. 15, January 2019, 'The EU and Eastern Partnership Countries — An Inside-Out Analysis and Strategic Assessment' (EU-STRAT). Available at: http://eu-strat.eu/wp-content/uploads/2019/03/EU-STRAT-Working-Paper-No.-15_Final-Version.pdf (accessed April 4, 2020).
14. Union State (2012) Interview with leader of 'Rus' organization Ivan Korda (in Russian). Available at https://www.postkomsg.com/interview/196647/.
15. Fedor, Julie, Simon Lewis, and Tatiana Zhurzhenko. "Introduction: War and Memory in Russia, Ukraine, and Belarus." In *War and Memory in Russia, Ukraine and Belarus*, pp. 1-40. Palgrave Macmillan, Cham, 2017.

# Культурніцкі сектар Беларусі ў часы лібералізацыі: з канца 2014 года да пачатку 2020 года

Мірон Лідскі

Перыяд развіцця культурніцкага сектара Беларусі, пра які будзе размова ў гэтым артыкуле, можна акрэсліць не толькі датамі, а і падзеямі, якія паклалі яго пачатак і паўплывалі на яго сканчэнне.

Пачатак прыпадае на час актыўнага разварочвання вайсковага канфлікту на ўсходзе Украіны ў другой палове 2014 года, а канец звязаны з правядзеннем у Беларусі прэзідэнцкіх выбараў 9 жніўня 2020 года і далейшымі пратэстамі супраць іх вынікаў.

Гэты перыяд розныя эксперты называюць па-рознаму: «лібералізацыя», «адліга», «мяккая беларусізацыя».

Пра «лібералізацыю» гаварылі ў эканоміцы, грамадскім сектары, у новай, хутка растучай галіне — IT. А Беларусі ўсё часцей як незалежныя, так і дзяржаўныя СМІ давалі сінонім — «IT-краіна».

«Мяккая беларусізацыя» — яшчэ адзін тэрмін, якім часта вызначаюць акрэслены перыяд.

Даследчык і кіраўнік BISS Пётр Рудкоўскі ў артыкуле за 2019 год пра нацыянальную ідэнтычнасць вызначае такія тэндэнцыі:

*«У дзяржаўнай палітыцы працягваецца трэнд "мяккай беларусізацыі":*

- *умацоўванне нацыянальнай тоеснасці шляхам прасоўвання ідэі "доўгай гісторыі" беларускай дзяржаўнасці і культывавання ідэнтыфікацыйнай ролі беларускай мовы;*
- *на ўзроўні грамадскай думкі назіраецца рост "прасавецкіх" настрояў;*
- *заўважаецца трэнд да "беларусацэнтрычнага" асэнсоўвання савецкай спадчыны – як на ўзроўні дзяржаўнай палітыкі, так і на ўзроўні грамадскай думкі;*

- *успрыманне БНР пераходзіць са стадыі "ацэньваю адмоўна" ў стадыю "не ведаю", і гэта таксама тычыцца як грамадскай думкі, так і дзяржаўнай палітыкі»*[1].

Тэрміны «мяккая беларусізацыя» і «беларускі нацыяналізм» для характарыстыкі гэтага перыяду актыўна выкарыстоўвала і расійская прапаганда, але ў негатыўным сэнсе, асцерагаючыся, што ў Беларусі будзе «как на Украине»[2].

Агулам, калі ацэньваць гэты перыяд, то адназначна можна сказаць, што ён характарызаваўся значным паляпшэннем умоў для грамадскай дзейнасці, культурніцкай актыўнасці і вядзення бізнесу з яскрава выражаным нацыянальным характарам.

Можна вылучыць шэсць кірункаў культурніцкай дзейнасці, якія сталі найбольш заўважнымі ў гэты перыяд у медыйнай прасторы і паспяховымі, вымяраючы іх уплыў на працэсы ў краіне:

- з'яўленне і развіццё публічных крэатыўных прастораў, творчых хабаў, культурніцкіх цэнтраў, галерэй;
- актыўнае развіццё ініцыятыў у фармаце публічных курсаў беларускай мовы;
- пашырэнне шматлікіх ініцыятыў, звязаных з папулярызацыяй і прасоўваннем нацыянальных сімвалаў, з'яўленне камерцыйнага складніку ў іх дзейнасці;
- актыўная інтэграцыя бізнесу ў грамадскі і культурніцкі сектар;
- правядзенне масавых грамадсказначных мерапрыемстваў з вялікай колькасцю людзей у фармаце велапарадаў, фестываляў, оўпэн-эйраў, марафонаў;
- манументальнае мастацтва: ад стрыт-арту да конных помнікаў.

## Прастора

У параўнанні з колькасцю публічных прастораў у 2010-2013 гадах, сітуацыя ў наступныя гады вельмі хутка пачала змяняцца ў лепшы бок. Так, напрыклад, напачатку 2012 года ў Мінску фактычна існавалі дзве асноўныя пляцоўкі, дзе свае мерапрыемствы безперашкодна маглі праводзіць грамадскія арганізацыі — гэта Галерэя «Ў» і культурная пляцоўка «Арт Сядзіба».

У наступныя гады сітуацыя хутка пачала змяняцца. Адчыняліся ў розных кропках горада адна за адной новыя прасторы: «ЦЭХ», «Балкі», Space, Korpus8, «Верх».

У гэты ж час пачынае працу абсалютна новая для Беларусі пляцоўка — стартап-хаб Imaguru. Насця Хамянкова, адна з заснавальніц прасторы, казала,

---

[1] *Пётр Рудкоўскі.* Нацыянальная ідэнтычнасць: дзяржаўная палітыка і грамадская думка // «Наше мнение»: https://nmnby.eu/yearbook/2019/page12.html.

[2] Soft Belarusization // Wikipedia: https://en.wikipedia.org/wiki/Soft_Belarusization.

што «Imaguru — гэта першы ў Беларусі стартап-хаб: каворкінг для сумеснай працы стартапаў, навучання і нэтворкінгу. Дзейнасць клуба факусуецца на двух асноўных кірунках: прадпрымальніцтва і інавацыі».




Адзначым таксама, што арганізацыя давала свае пляцоўкі для правядзення мерапрыемстваў грамадскім ініцыятывам абсалютна розных кірункаў.

У 2017 годзе пры ўдзеле «Белгазпрамбанка» на вуліцы Кастрычніцкая, якая на той момант ужо стала адным з самых папулярных тусовачных месцаў сталіцы, адчыніўся вялікі культурны хаб ОК16, на гэтую ж вуліцу пераехала і прастора «ЦЭХ»[3].

[3] Вось як пра гэтую з'яву ў 2016 годзе пісала дзяржаўная газета «Звязда»: Творчыя прасторы // «Звязда». — 20.03.2016: https://zviazda.by/be/news/20160320/1458481438-tvorchyya-prastory.




## Беларуская мова

З развіццём інфраструктуры для публічных мерапрыемстваў расце і разнастайнасць фарматаў. Сярод іх — бясплатныя публічныя курсы беларускай мовы. У 2013-2014 гадах з'яўляюцца ў Мінску і хутка набіраюць папулярнасць моўныя курсы «Мова ці кава», якія праходзяць у прасторах Галерэя «Ў» і «ЦЭХ», з'яўляюцца прадстаўніцтвы ў іншых гарадах і краінах.

У 2014 годзе пісьменнік і мовазнаўца Аляксей Шэін распачынае свае моўныя курсы «Моваведа», якія праходзяць у бізнес-цэнтры «Валео» і на пляцоўцы «Арт Сядзіба». Курсы суправаджаюцца крэатыўнымі рэкламнымі ролікамі, якія становяцца віруснымі[4].

Таксама ў 2014 годзе журналіст Глеб Лабадзенка і філолаг Алеся Літвіноўская распачынаюць свае курсы «Мова Нанова», якія праходзяць спачатку ў Галерэі «Ў», а затым у кафэ «Грай». Праект пачынае актыўна развівацца: акрамя штотыднёвых афлайн-сустэч адбываюцца YouTube-трансляцыі, выходзяць падручнікі курсаў, анлайн-урокі, выдаюцца студэнцкія білеты. Курсы пачынаюць самастойна дзейнічаюць у Астраўцы, Браславе, Бабруйску, Баранавічах, Барысаве, Брэсце,

[4] Напрыклад: 300 мовазнаўцаў // YouTube: https://youtu.be/SAHZB-RW5-M.

Віцебску, Гродне, Гомелі, Магілёве, Маладзечне, Рэчыцы, Светлагорску і Салігорску[5].




22 лютага 2015 года каманда «Арт Сядзібы» і культурніцкая пляцоўка «Беларуская Прастора» ўпершыню збіраюць у стартап-хабе Imaguru шматлікія беларускамоўныя творчыя ініцыятывы, моўныя курсы, бізнес-праекты, вытворцаў сувеніраў і паштовак, цікавых музыкаў і адметных творцаў разам на «Свяце роднай мовы», каб паказаць, што беларуская мова не толькі жыве і развіваецца, але натхняе шматлікіх людзей на цікавыя і яскравыя праекты, акрыляе на добрыя справы.

З кожным годам традыцыя святкаванняў Міжнароднага дня роднай мовы набірае ўсё большыя маштабы. У выніку, 22 лютага 2020 года ў мінскім культурным хабе ОК16 «Арт Сядзіба» пры падтрымцы генеральнага партнёра «Аліварыя» збірае разам 50 беларускіх кампаній, арганізацый, ініцыятыў і творчых калектываў на маштабным свяце «Мова Фэст», якое ў той дзень наведала каля дзесяці тысяч чалавек[6].

---

[5] На сайце праекта на сённяшні дзень прадстаўлена больш за 200 заняткаў на розныя тэмы: https://www.movananova.by/zaniatki/.

[6] Сайт «Мова Фэст»: http://movafest.by.




## Адказны бізнес

У «моўныя праекты» пачынае актыўна ўключацца бізнес. Кампанія А-100 гучна пераводзіць камунікацыю з кліентамі на сваіх запраўках на беларускую мову, бровары «Аліварыя» і «Лідскае» беларусізуюцца і выкарыстоўваюць беларускую мову не толькі на этыкетках, у роліках і сацыяльных сетках, а і робяць беларускамоўныя фестывалі, нацыянальныя дыктоўкі, актыўна супрацоўнічаюць з грамадскімі ініцыятывамі, якія займаюцца папулярыхацыяй роднай мовы.

Завод «Луч» выпускае некалькі серый гадзіннікаў, прысвечаных беларускай мове, а кампанія Mark Formelle — калекцыі моднай вопратак і шкарпэтак з беларускамоўным зместам. Дзяржаўны банк «Москва-Минск» праводзіць рэбрэндынг і становіцца банкам «Дабрабыт», падтрымлівае «Мова Фэст», здымае ролікі па-беларуску[7] і ставіць на ўваходзе ў галоўны офіс помнік з «Пагоняй».

А найбунейшы мабільны аператар Беларусі — кампанія А1— ставіць ва ўсіх абласных гарадах інтэрактыўныя пляцоўкі «МОВА» і дадае падтрымку беларускай мовы ў якасці аднаго з прыярытэтаў праграмы карпаратыўнай сацыяльнай адказнасці.

[7] Запрашаем усіх на ўнікальнае свята «Мова Фэст», прымеркаванае да Міжнароднага дня роднай мовы // «Банк Дабрабыт». — 14.02.2020: https://bankdabrabyt.by/by/about/news/novosti_banka/zaprashaem-usikh-na-nikalnae-svyata-mova-fest-prymerkavanae-da-mizhnarodna-ga-dnya-rodnay-movy/.




За апошняе пяцігоддзе можна прывесці сотні такіх прыкладаў актыўнага ўдзелу бізнесу ў прасоўванні беларускай мовы.

Яшчэ адным яскравым кірункам у папулярызацыі беларускай мовы сталі «Беларускія ўікэнды». «Беларускія ўікэнды» — праект, у якім вядомыя акцёры і дзеячы шоу-бізнесу агучваюць па-беларуску хіты і навінкі сусветнага кінематографа, каб гледачы маглі ўбачыць іх у найлепшых кінатэатрах Мінска і іншых гарадоў Беларусі[8].

Праект створаны ў 2016 годзе кампаніяй «Кінаконг», а з 2017 года пераклад, агучку, дыстрыбуцыю фільмаў каманда выконвае пры падтрымцы партнёра — кампаніі velcom (пасля рэбрэндынгу ў 2019 годзе — А1). За два з невялікім гады жыцця праекта фільмы «Беларускіх уікэндаў» паглядзела каля 57 тыс. гледачоў. Пракат кіно на беларускай мове ахапіў больш за 60 кінатэатраў у 40 гарадах краіны.

Акрамя А1, самай заўважнай кампаніяй, якая актыўна спансуе грамадскаінзначныя беларускія праекты, становіцца «Белгазпрамбанк» пад кіраўніцтвам Віктара Бабарыкі.

[8] 57 тысяч гледачоў «Беларускіх уікэндаў»: як у velcom атрымалася падтрымаць кіно на беларускай мове // Marketing.by. — 22.02.2019: https://marketing.by/keysy/57-tysyach-gledacho-belaruskikh-uikenda-yak-u-velcom-atrymalasya-padtrymats-kino-na-belaruskay-move-/.




У сакавіку 2014 года ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь пры падтрымцы «Белгазпрамбанка» быў урачыста адкрыты праект «Дзесяць стагоддзяў мастацтва Беларусі» — самая маштабная экспазіцыя прадметаў культурнай спадчыны беларускага народа за ўсю гісторыю незалежнасці нашай краіны.






У 2015 годзе стартуе першы «Восеньскі салон з Белгазпрамбанкам» — выстава-продаж карцін сучасных беларускіх мастакоў. «Восеньскі салон» з'яўляецца часткай маштабнай банкаўскай ініцыятывы «Арт-Беларусь», якая цяпер дэманструе не толькі багатае мінулае мастацтва Беларусі, а і раскрывае яго будучыя перспектывы і сучасны патэнцыял.

З 14 красавіка 2017 года ў мінскім Палацы мастацтваў пачала сваю працу пастаянна дзеючая галерэя праекта «Арт-Беларусь», дзе ўпершыню ў нашай краіне ў рамках адной экспазіцыі прадстаўлены больш за 50 шэдэўраў беларускіх майстроў з карпаратыўнай калекцыі «Белгазпрамбанка», у тым ліку і карціна Хаіма Суціна «Ева», якая ў 2020 годзе стала адным з сімвалаў беларускай рэвалюцыі.

У гэты ж перыяд «Белгазпрамбанк» таксама меў дачыненне да старту краўдфандынгавых пляцовак Ulej і MolaMola, выдання поўнага збору твораў Святланы Алексіевіч на беларускай мове і з'яўлення культурніцкага хабу ОК16.

## Арнамент і «Пагоня»

2014 год стаў пачаткам маштабнай хвалі папулярнасці беларускага арнаменту і «легалізацыі» герба «Пагоня» і бел-чырвона-белага сцяга. Стартам стала акцыя «Беларуская стужка», якую ініцыявала «Арт Сядзіба». 6 снежня 2014 года актывісты і валанцёры раздалі ў Мінску больш за 12 тыс. бела-чырвоных стужак з беларускім арнаментам. Агулам у акцыі ўзялі ўдзел больш за 100 валянцёраў, і праходзіла яна пад споклічам «Пазнач сябе беларусам».



Першая акцыя «Беларуская стужка» была прымеркавана да фестывалю нацыянальнай культуры «Дзень вышыванкі», які адбыўся 13 снежня 2014 года ў Палацы мастацтва. Мерапрыемства сабрала тысячы наведнікаў, было цалкам арганізавана грамадскімі ініцыятывамі і стала пачаткам «вышыванкавага трэнду», які расцягнуўся на пяць гадоў.







У 2015 годзе гран-пры фестывалю беларускамоўнай рэкламы AD.NAK! атрымаў праект «Вышымайка», а паралельна з крамай Symbal.by пачынаюць з'яўляцца і актыўна развівацца новыя і новыя беларускамоўныя брэнды вопраткі, якія папулярызуюць беларускую мову, нацыянальныя сімвалы, гісторыю, культуры і традыцыі: LSTR, «Гонар», «Адметнасць», «Мой модны кут», «Мроя», «Дарэчы», Zhart, Hmarachos, «Імбрык», Fainy ды інш.

З'яўляюцца каталогі Svaje.by ды Say.by, якія збіраюць і структуруюць камерцыйныя ды грамадскія ініцыятывы з яскрава выражаным нацыянальным каларытам.

У 2016 годзе МАСМІ (Міжнароднае агенцтва сацыяльных і маркетынгавых даследаванняў) разам з Marketing.by правялі даследаванне па вывучэнні эфекту вышыванкі на ўпакоўцы беларускіх вытворцаў[9].

Распаўсюд стужкі з арнаментаў і папулярнасць акцыі «Беларуская стужка» былі ў тым ліку адказам на спробы прарасійскіх сілаў навязаць беларусам георгіеўскую стужку на фоне канфлікту паміж Расіяй і Украінай.

У 2015 годзе акцыю падхапілі дзяржаўныя арганізацыі, такія як БРСМ і «Белая Русь», стужкі з арнаментам з'явілася ў шырокім рознічным гандлі

[9] Вынікі можна паглядзець тут: «Эфэкт вышыванкі» — дзьве трацiны кампаніяў хочуць беларусізаваць сваю рэкляму // «Радыё Свабода». — 29.03.2016: https://www.svaboda.org/a/27641306.html; Как работает эффект «вышиванки» на магазинной полке? МАСМИ исследовало «взгляд покупателя» // Marketing.by. — 12.07.2016: https://marketing.by/analitika/kak-rabotaet-effekt-vyshivanki-na-magazinnoy-polke-masmi-issledovalo-vzglyad-pokupatelya/.

і актыўна выкарыстоўваліся ў розных фарматах і на розных дзяржаўных узроўнях. А 2 ліпеня 2016 года Міністэрства культуры, Мінгарвыканкам, БРСМ арганізавалі ля Палаца спорту ў Мінску маладзёжнае дзяржаўнае свята «Дзень вышыванкі».




Разам з тым, адбываецца ўмоўная «легалізацыя» герба «Пагоня» і бел-чырвона-белага сцяга. Гэта праяўляецца ў тым, што:

- розным бізнесовым ініцыятывам не замінаюць легальна распаўсюджваць рэчы з гэтымі сімваламі, прадаваць як у крамах, там і на выязных мерапрыемствах;
- у цішотках з «Пагоняй» можна сустрэць усё больш і больш людзей у публічных месцах і заўзятараў на стадыёнах, і за гэта міліцыянеры не чапаюць;
- бел-чырвона-белыя сцягі ўсё часцей і часцей можна сустрэць на культурных і спартыўных мерапрыемствах, і гэта не выклікае наступстваў для людзей, якія ўздымаюць гэтыя сцягі;
- у 2018-м і 2019-м гадах адбываюцца легальныя святкаванні Дня Волі з масавым выкарыстаннем бел-чырвона-белага сцяга.




Новая хваля папулярызацыі «Пагоні» фактычна пачалася пасля ўчынку навучэнцаў Брэсцкага абласнога кадэцкага вучылішча, якія 16 кастрычніка 2015 года выклалі ў VK-супольнасці «Мая краіна Беларусь» фота чатырох кадэтаў, што прадэманстравалі цішоткі з гербам «Пагоня».



За гэты ўчынак хлопцы атрымалі вымовы і пакаранні ў межах вучэльні, а ў іх падтрымку распачаўся маштабны флэшмоб «Пагоня побач», у межах якога тысячы людзей выкладвалі фотаздымкі з гербам «Пагоня».




Не спыняюцца ў гэты час і спробы надаць бел-чырвона-беламу сцягу статус гісторыка-культурнай каштоўнасці.

У 2016 годзе Зміцер Дашкевіч і «Малады фронт» публічна ў розных гарадах Беларусі да 25-годдзя надання 19 верасня 1991 года бел-чырвона-беламу сцягу і гербу «Пагоня» статуса дзяржаўных сімвалаў зноў збіралі подпісы за прадастаўленне бел-чырвона-беламу сцягу статуса нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці[10].



[10] Пачаты збор подпісаў за бел-чырвона-белы сцяг // «Беларускае Радыё Рацыя»: https://www.racyja.com/hramadstva/raspachaty-zbor-podpisau-za-bel-chyrvon/.

А ў 2018 годзе дэпутатка Палаты прадстаўнікоў Ганна Канапацкая са сваёй камандай распрацавала законапраект аб выкарыстанні і ахове бел-чырвона-белага сцяга, які, праўда, так і не дайшоў да разгляду ў парламенце[11].

## Фестывалі

Звычайнай справай становіцца прысутнасць сектара НДА на вялікіх фестывалях у розных кутках Беларусі. Гэта становіцца фішкай фестываляў A-Fest, «Наш Дзень», Vulitsa Ezha, Vulica Brasil, «Мова Фэст», «Дзень вышыванкі», «БНР100», Sprava, Viva Braslav, Viva Ровар!, «Свята Сонца», Pradmova ды інш.

Наогул 2014-2020 гады нарадзілі некалькі дзясяткаў фестываляў у розных кутках Беларусі, большасць з якіх стала штогадовымі і збірала да пачатку пандэміі COVID-19 і лета 2020 года тысячы наведнікаў.

## Помнікі і стрыт-арт

Краўдфандынг і падтрымка мясцовага бізнесу сталі рухавікамі з'яўлення ў 2014-2020 гадах вялікай колькасці важных для краіны манументальных прац.



[11] Канапацкая распрацавала законапраект аб ахове бел-чырвона-белага сьцяга. Што яна прапануе // «Радыё Свабода». — 11.05.2018: https://www.svaboda.org/a/29221422.html.

12 траўня 2018 года ў маёнтку Марачоўшчына, дзе нарадзіўся Тадэвуш Касцюшка, быў адкрыты помнік. Урачыстая падзея адкрыцця адбылася ў прысутнасці дыпламатаў, супрацоўнікаў міністэрстваў, дзяржаўных служачых і грамадскасці. Над помнікам луналі як дзяржаўныя, так і бел-чырвона-белыя сцягі. Беларускі праект быў здзейснены, дзякуючы намаганням Глеба Лабадзенкі і іншых неабыякавых людзей. 700 ахвярадаўцаў сабралі патрэбныя сродкі, адгукнуўшыся на заклік на краўдфандынгавай платформе Talaka.

У кастрычніку 2017 года Лідскі райвыканкам абвесціў конкурс на лепшы эскіз скульптуры «Заснавальнік замка — князь Гедымін», у якім узялі ўдзел 28 прац. У лютым 2018 года пасля падліку галасоў перамог сумесны эскіз скульптараў Вольгі Нячай і Сяргея Аганава. 12 жніўня 2019 года статуя Гедыміна на кані была ўсталявана, урачыстае адкрыццё помніка адбылося 7 верасня.

1 чэрвеня 2018 года ў Гродне ўрачыста адкрылі помнік князю Давыду Гарадзенскаму. Давыд Гарадзенскі паўстае верхам на кані. У правай руцэ ён трымае меч, у левай — крыж як сімвал хрысціянства.

Да гэтага ў 2014 годзе ў Віцебску адкрылі конны помнік вялікаму князю літоўскаму Альгерду.

Фактычна абсалютна новым кірункам манументальнага мастацтва для Беларусі стала магчымасць з 2014 года атрымліваць дазволы і ўзгадняць вялікія муралы на сценах дамоў.



Пачалося гэта з праекта Vulica Brasil — фестывалю вулічнага мастацтва, у межах якога бразільскія і беларускія мастакі размалёўваюць сцены ў розных лакацыях Мінска, ствараючы агромністыя муралы вышынёю ў некалькі паверхаў[12].

А дзякуючы стрыт-арт-праектам Signal, MustAct і Urban Myths за апошнія сем гадоў з 2014 года на фасадах шматлікіх шматпавярховікаў у розных гарадах Беларусі з'явіліся муралы, якія па-новаму раскрываюць беларускую культуру, традыцыі і нацыянальны каларыт[13].









[12] Новыя арт-аб'екты Vulica Brasil 2019 // 34mag.net. — 25.08.2019: https://34mag.net/post/vulica-brasil2019.

[13] Больш праектаў тут: Наши лучшие проекты // MustAct: https://mustact.by/rus/projects/.

Што можна канстатаваць? Па стане на лета 2021 года большасць з гэтых ініцыятыў далей рэалізоўваць немагчыма: частка актывістаў з'ехала ад рэпрэсій за межы Беларусі, частка знаходзіцца за кратамі, частка спыніла дзейнасць з-за ліквідацыі сваіх установаў, фондаў, грамадскіх арганізацый, а частка чакае новага акна магчымасцяў і сканчэння палітычнага крызісу ў Беларусі.

Але падзеі 2020 года нарадзілі шмат іншых разнастайных ініцыятыў, большасць з якіх дзейнічае зараз ананімна ці з-за мяжы.

# Церковное общество: от покорности к инициативности

Александр Шрамко

В религиозной сфере основными действующими субъектами в Беларуси являются официальные конфессиональные структуры, в основном христианские. Православие представляет Белорусская православная церковь (БПЦ или Белорусский экзархат Московского патриархата) и в очень малой степени, почти номинально — Белорусская автокефальная православная церковь (БАПЦ), не имеющая регистрации в Республике Беларусь. Римо-католичество представляют четыре автономных диоцеза (епархии) во главе с епископами, объединенными в координирующий орган — Конференцию католических епископов Беларуси (ККЕБ)[1]. Греко-католичество (униатство) представляет Белорусская греко-католическая церковь (БГКЦ) под руководством апостольского визитатора. Протестантизм представлен различными автономными деноминациями, среди которых наиболее заметны в публичной сфере Объединенная церковь христиан веры евангельской («пятидесятники»), Объединение общин христиан Полного Евангелия («харизматы») и Союз евангельских христиан-баптистов.

Все гражданские инициативы в той или иной степени ассоциированы с этими официальными структурами, в том числе и тогда, когда действуют сравнительно автономно. К уникальным явлениям можно отнести политическую партию (пока официально незарегистрированную) — Беларусскую христианскую демократию и возникшую на волне протестов 2020 года группу «Христианское видение». Обе эти инициативы имеют принципиально поликонфессиональный характер и, соответственно, не связывают себя ни с одной церковной структурой. Из нехристианских структур нужно особенно отметить Религиозное объединение общин прогрессивного иудаизма, в основном в лице его главного раввина Григория Абрамовича, ощутимо заметного в публичном пространстве.

По степени влияния на общественную жизнь и внимания к ним со стороны общества в силу исторической традиции выделяются православная и римско-

[1] Адрасы касцёлаў // Касцёл у Беларусі: https://catholic.by/3/kasciol/parishes.

католическая конфессии. Это подтверждает и статистика. Так, в 2015 году, по данным опроса, 63,5% населения Беларуси идентифицировали себя верующими, из них 83% православные, 9,5% католики[2]. К этим двум ведущим конфессиям в основном направлено и внимание государства, возлагающего на них свои ожидания. Поэтому именно к ним были предъявлены претензии диктатуры по поводу позиции верующих в дни протестов, что вылилось в существенные кадровые изменения в их руководстве.

Широко практикуемый тезис о «церкви вне политики» с точки зрения режима означает только то, что у церкви не должно быть никакой самостоятельной позиции, везде и во всем требуется беспрекословная поддержка действий и политики властей или, по меньшей мере, молчаливое согласие. В этом ракурсе не считается политикой даже привлечение церкви к участию на стороне существующей власти в предвыборной кампании.

## От выборов до выборов

В период 2015-2020 годов наблюдалось некоторое переформатирование в церковно-государственных отношениях как с православной, так и с католической церковью. В некоторой степени это было связано с кадровыми изменениями в иерархии. Так, в БПЦ в декабре 2013 года был отправлен на покой многолетний предстоятель, глава и создатель Белорусского экзархата митрополит Филарет (Вахромеев), вместо него был назначен митрополит Павел (Пономарев), российский иерарх, ранее не имевший никакого отношения к Беларуси[3]. По некоторым предположениям, это назначение не пришлось по вкусу Александру Лукашенко, что посеяло определенную холодность и напряженность в отношениях власти с руководством БПЦ, достигшее кульминации в период событий 2020 года, когда в конце концов митрополит Павел был сменен полностью преданным режиму беларусом Вениамином (Тупеко).

У католиков в 2015 году произошла замена не столь существенная, и не в собственно руководстве, но знаковая: с поста папского нунция был переведен харизматичный архиепископ Клаудио Гуджеротти, а вместо него в 2016 году поставлен архиепископ Габор Пинтер, фигура гораздо менее яркая[4]. С этой заменой окончательно завершается период (с конца 2000-х годов) некоторого

---

[2] Наталля Васілевіч. Рэлігійная сфера: малітва за Беларусь, малітва за Лукашэнку? // «Наше мнение»: http://nmnby.eu/yearbook/2016/page19.html.

[3] Журналы заседания Священного синода от 25-26 декабря 2013 года // Русская православная церковь: http://www.patriarchia.ru/db/text/3478892.html.

[4] Апостольская нунциатура: Беларусь // GCatholic.org: http://www.gcatholic.org/dioceses/nunciature/nunc019.htm.

потепления в отношениях режима с католической церковью и тают последние надежды на некогда обещанный конкордат.

Таким образом, отношения государства с двумя ведущими конфессиями начинают приобретать все более рутинно-бюрократический характер. Определенное оживление внесла разве что неожиданная инициатива митрополита Павла в конце 2014 года, т.е. спустя всего лишь год после поставления экзархом, о большей степени самостоятельности Белорусского экзархата от московского центра[5]. Инициатива из-за жесткого сопротивления со стороны Московской патриархии провалилась, но сама эта история приоткрыла завуалированные устремления властей к автокефалии (независимости) БПЦ, что подтвердили события дальнейших лет, особенно поставление экзархом безропотно преданного режиму местного епископа.

В отношении католической церкви о подобном власти не могли и мечтать. Кроме того, что она управляется из неподконтрольного режиму Ватикана, так и ее местные иерархи демонстрируют гораздо большую независимость. Так, митрополит Минско-Могилевский архиепископ Тадеуш Кондрусевич неоднократно выступал с заявлениями по поводу острых общественных событий, как, например, в связи с конфликтом вокруг Куропат или арестами общественных и политических деятелей. Поэтому власти действовали в рамках той же стратегии усиления местного влияния если не на высшем уровне, то на уровне рядового духовенства. Именно поэтому усиливается давление на католическую церковь, чтобы она увеличивала долю священников местного происхождения и гражданства за счет снижения числа клириков из Польши, вплоть до досрочного выдворения некоторых из них по надуманным предлогам из страны[6].

Зримым же прецедентом приобщения церквей к идеологическому обслуживанию режима стала организованная в 2015 году в рамках очередной президентской предвыборной кампании Александра Лукашенко т.н. «Молитва за Беларусь»[7] с участием высших иерархов не только двух ведущих христианских конфессий, но также иудеев и мусульман.

---

[5] Белорусская православная церковь ставит вопрос о статусе самоуправления // «Белорусский портал ЦАРКВА»: https://churchby.info/rus/974.

[6] *Наталья Василевич.* Белорусское государство, Римско-католическая церковь в Беларуси, Ватикан и польские священники // «За свабоднае веравызнанне»: http://forb.by/node/499.

[7] Состоялась предвыборная церемония под названием «Молитва за Беларусь // «Белорусский портал ЦАРКВА»: http://churchby.info/rus/news/2015-10-06/sostoyalos-predvybornaya-ceremoniya-pod-nazvaniem-molitva-za-belarus.

## Православные инициативы и их противоречивость

Если гражданские инициативы протестантов и католиков (например, благотворительная миссия Caritas Belarus) находились в русле выбранной своими конфессиями стратегии, в большей степени свободной, ввиду большей отдаленности от власти, то соответствующие инициативы православных, да и само руководство БПЦ, проявляли некоторую противоречивость, связанную с проблемой совмещения полной лояльности как ведущей конфессии и проявлением самостоятельных позиций по острым вопросам современности.

Наглядно это можно видеть на примере движения pro-life против абортов. Подобные движения во всем мире имеют значительный протестный компонент, который способен объединить разные конфессии и политические силы. И в сентябре 2013 года православные пролайферы даже намеревались выйти совместно с движениями других конфессий и даже политической партией Беларусская христианская демократия на общенациональный марш под девизом «За жизнь, за семью, за детей». Однако в последний момент православные активисты дистанцировались от требований по изменению законодательства[8]. В последующие годы это движение полностью отошло от каких-либо претензий режиму и, вопреки всей логике, во всем винит «угрозы» с Запада: гомосексуальность, ювенальную юстицию, половое воспитание, гендерную идеологию и эвтаназию[9].

Подобная же противоречивость позиций БПЦ проявлялась и по отношению к национальному вопросу. С одной стороны, в БПЦ, особенно при митрополите Павле, стало расширяться использование беларусского языка, и регулярные службы на беларусском языке проходили как минимум в четырех православных храмах Минска, в Минской области — в двух, в Гродно — в четырех. К 500-летию Библии Скорины был издан первый официальный православный перевод Нового Завета на беларусский язык. На официальном сайте БПЦ появилась полноценная беларусскоязычная версия. Но, вместе с тем, активизируется процесс канонизации митрополита Литовского и Виленского Иосифа (Семашко), вокруг которого собираются пророссийские силы в БПЦ, а также продол-

---

[8] *Наталля Васілевіч.* Цэрквы ў Беларусі: старыя праблемы і новыя лідары // «Наше мнение»: http://nmnby.eu/yearbook/2013/page20.html.

[9] *Vasilevich, Natallia.* “Going Political? The Involvement of Churches in Public Debates on Prolife Issues in Belarus”, In: Bodrov, A., Garret S.M. (eds) Theology and the Political. Theo-political Reflections on Contemporary Politics in Ecumenical Conversation, Brill, 2020, 200-227 // Academia: https://www.academia.edu/44568893/Vasilevich_Natallia_Going_Political_The_Involvement_of_Churches_in_Public_Debates_on_Prolife_Issues_in_Belarus_In_Bodrov_A_Garret_S_M_eds_Theology_and_the_Political_Theo_political_Reflections_on_Contemporary_Politics_in_Ecumenical_Conversation_Brill_2020_200_227.

жается организация под эгидой церкви молодежных военно-патриотических лагерей с имперской пророссийской идеологией[10].

На этом фоне сенсационно выглядел беспрецедентный шаг бывшего пресс-секретаря Белорусского экзархата протоиерея Сергия Лепина, принявшего участие в праздновании 100-летия БНР в 2018 году[11].

В том же плане примечательна реакция Синода БПЦ, выраженная митрополитом Павлом, на подготовленный в декабре 2016 года проект постановления Министерства здравоохранения Республики Беларусь «Об утверждении Стандартов медицинской этики и деонтологии». Этот проект среди прочих требований к внешнему виду медицинских и фармацевтических работников содержал запрет на демонстрацию религиозной принадлежности, открытое ношение религиозной символики. В своем письме министру здравоохранения митрополит Павел выступил против этого требования права, сославшись на его неконституционность и напомнив о программе сотрудничества Минздрава и БПЦ, подписанной в 2003 году, а также предупредив об угрозе религиозных конфликтов в обществе и протестов верующих. В результате из проекта постановления был снят запрет на демонстрацию религиозной принадлежности[12].

Однако в общем и целом руководство БПЦ чаще не рискует «портить отношения» с режимом и даже побаивается любого активизма, поэтому инициативы начинают уходить на низовой уровень, связанный не с руководством БПЦ, а с гражданским обществом. Среди таких инициатив: фестиваль «Памежжа», консолидация беларусских независимых богословов вокруг богословской секции Международного Конгресса исследователей Беларуси и запуск Сети сотрудничества беларусских богословов зарубежья[13].

Опыт самоорганизации на дистанции от руководства сыграл свою позитивную роль в дни протестов 2020 года. Это можно сказать и о неформальной солидарности верующих разных конфессий и религий.

---

[10] *Наталля Васілевіч.* Рэлігійная сфера ў Беларусі: стабільнасць і кантраляванасць // «Наше мнение»: http://nmnby.eu/yearbook/2018/page17.html.

[11] Протоиерей Сергий Лепин о БНР, русофобии, политике и Русском мире // Официальный портал БПЦ: http://church.by/news/protoierej-sergij-lepin-o-bnr-rusofobii-politike-i-russkom-mire.

[12] Патриарший экзарх всея Беларуси направил министру здравоохранения письмо относительно Проекта постановления Министерства здравоохранения Республики Беларусь «Об утверждении Норм медицинской этики и деонтологии» // «За свабоднае веравызнанне»: http://forb.by/node/680.

[13] *Наталля Васілевіч.* Рэлігійная сфера ў Беларусі: стабільнасць і кантраляванасць // «Наше мнение»: http://nmnby.eu/yearbook/2018/page17.html.

## Коллаборация конфессий и инициатив

Официальное сотрудничество конфессий в последние годы свелось до минимума. Фактически оно проявляется только в совместных идеологических и предвыборных мероприятиях под эгидой государства, т.е. не по собственной инициативе. Объясняется это различными факторами, в том числе и сознательной стратегией режима на неравное положение конфессий, что закреплено даже в преамбуле Закона «О свободе совести и религиозных организациях». Немалую роль сыграл и уход с поста предстоятеля БПЦ митрополита Филарета (Вахромеева), который известен своими экуменическими установками, особенно на международной арене.

На фоне этой разобщенности заслуживает особенного внимания критика с консервативных позиций предложенной МВД концепции Закона «О противодействии домашнему насилию». Первым против предложенного закона выступил глава Конференции католических епископов архиепископ Тадеуш Кондрусевич, который заявил, что концепция «атакует традиционные семейные ценности, глубоко противоречит национальным, культурным, а также духовным традициям беларусского народа»[14]. Но потом к критике подключился созданный в связи с этим Координационный совет общественных просемейных сил Беларуси, в который вошли ОБО «Спасение младенцев», ГБОО «Центр поддержки семьи и материнства «Мамалето», СПУ «Отцовство», МБОО «Город без наркотиков», БФ «Открытые сердца», СПУ «Центр поддержки семьи, материнства и детства «Покрова», представители Объединенной церкви ХВЕ в Беларуси, представители церкви ЕХБ и других организаций. В итоге МВД предпочло отказаться от подготовки такого закона, мотивируя это тем, что решение обусловлено «высоким общественным резонансом и мнением религиозных организаций»[15].

Еще одним проявлением солидарности церквей и гражданского общества стала ситуация вокруг варварского сноса крестов в Куропатах. Опять же, официальным голосом этого общегражданского протеста стал архиепископ Тадеуш Кондрусевич, который выступил со специальным заявлением[16]. Православная же

[14] «Это ювенальная юстиция». Пролайферы Беларуси — против проекта закона МВД // Katolik.life: https://katolik.life/rus/news/sotsium/item/3723-eto-yuvenalnaya-yustitsiya-prolajfery-belarusi-protiv-proekta-zakona-mvd.html.

[15] *Наталля Васілевіч.* Рэлігійная сфера: «Мінскі раскол» замест «Мінскага дыялогу» // «Наше мнение»: http://nmnby.eu/yearbook/2019/page18.html.

[16] Заява старшыні Канферэнцыі каталіцкіх біскупаў у Беларусі адносна сітуацыі ў Курапатах // Касцёл у Беларусі: https://catholic.by/3/news/belarus/9641-zayava-starshyni-kanferentsyi-katalitskikh-biskupa-u-belarusi-adnosna-situatsyi-kurapatakh.

иерархия решила отмолчаться, лишь только пресс-секретарь БПЦ протоиерей Сергий Лепин высказал «обеспокоенность» в интервью «Радыё Свабода»[17].

## Отношение к протестам 2020 года и участие в них

Инициативы на гражданском церковном уровне проявились еще до выборов. Параллельно с кампанией «Католик не фальсифицирует»[18] православные распространили в интернете плакат «Православные против: фальсификаций, унижения личности, давления на личность»[19], под которым подписались ряд священников и работников церковных структур.

После выборов верующие выступили против насилия. По инициативе снизу, причем со стороны православных, в Минске начались совместные молебны у Ратуши и крестные ходы христиан разных конфессий. Некоторые священники приняли участие в оказании помощи заключенным и пострадавшим, а кто-то из них открыто присоединился к протестам.

В иерархии БПЦ позиции разнились от категоричного осуждения насилия (архиепископ Артемий (Кищенко) до безусловной поддержки действий режима (архиепископ Гурий (Апалько)). Колебался и митрополит Павел, хотя все же проявил некоторое сочувствие к пострадавшим, посетив их в больнице, а также поддержав молебны[20].

Более консолидированная и определенная позиция снова оказалась у католической иерархии. Архиепископ Тадеуш Кондрусевич призвал «положить конец насилию» и «немедленно созвать специальный круглый стол» для диалога[21].

Среди общих акций верующих, наряду с молитвами у Ратуши, нельзя не упомянуть и о грандиозной христианской акции «Цепь покаяния»[22]. Христиане

[17] Прадстаўнік Праваслаўнай царквы: «Сытуацыя вакол Курапатаў вельмі непакоіць. Спадзяёмся атрымаць тлумачэньне ўладаў» // «Радыё Свабода»: https://www.svaboda.org/a/29860 549.html.

[18] «Католик не фальсифицирует». Верующие выступают против фальсификации выборов // «Флагшток»: https://flagshtok.info/by/vybary-2020/katolik-ne-falsificiruet-verujuscie-vystupajut-protiv-falsifikacii-vyborov.html.

[19] Православные священники запустили флешмоб против фальсификаций // «Белсат»: https: //belsat.eu/ru/news/pravoslavnye-svyashhenniki-zapustili-fleshmob-protiv-falsifikatsij/

[20] Патриарший экзарх навестил людей, пострадавших в ходе протестных акций // Официальный портал БПЦ: http://www.church.by/news/patriarshij-ekzarh-navestil-ljudej-postradavshih-v-hode-protestnyh-akcij.

[21] Зварот арцыбіскупа Тадэвуша Кандрусевіча ў сувязі са складанай грамадска-палітычнай сітуацыяй у Беларусі // Касцёл у Беларусі: https://catholic.by/3/news/belarus/11991-zvarot-artsyb-skupa-tadevusha-kandrusev-cha-suvyaz-sa-skladanaj-gramadska-pal-tychnaj-s-tuatsyyaj-u-belarus.

разных деноминаций выстроились в Минске в молитвенную цепь длиной около 15 км от места массовых сталинских расстрелов до тюремного изолятора, где содержались задержанные во время протестов и массово применялись изуверские пытки.

Режим ответил немедленной сменой православного экзарха и изгнанием из страны католического митрополита Тадеуша Кондрусевича, который впоследствии тоже был сменен более лояльным иерархом. Затем новое руководство БПЦ отправило на покой «протестного» архиепископа Артемия (Кищенко). Начались чистки церковных кадров и на низших уровнях. В результате церковный официоз оказался откровенно прорежимным. Вот здесь и пригодился опыт самостоятельной инициативности церковного общества на низшем уровне по типу организации гражданского общества. Одним из его действующих проявлений является группа «Христианское видение»[23], объединившая христиан разных конфессий для выработки скоординированной позиции, помощи репрессируемым и информирования общественности о преследовании верующих по политическим мотивам.

[22] Ланцуг (цепь) покаяния в Минске // Телеграм-канал «Поп вне игры»: https://t.me/popoffside/587.

[23] Миссия группы «Христианское видение» в текущем политическом кризисе в Беларуси // Царква і палітычны крызіс у Беларусі: https://belarus2020.churchby.info/missiya-gruppy-hristianskoe-videnie-v-tekushhem-politicheskom-krizise-v-belarusi/.

# Адукацыйныя ініцыятывы Беларусі 2015-2020 гадоў: ад пступовага росту да масавага знішчэння

Кацярына Куксо

У часы незалежнай Беларусі актыўнасць беларускіх адукацыйных арганізацый можна апісаць як тры хвалі, якія паступова змянялі адна адну:

Першая хваля буйнога росту прыйшлася на раннія постсавецкія часы, калі былі зняты папярэднія абмежаванні і бар'еры, сталі дасяжнымі новыя ідэі, з'явіліся магчымасці супрацы з заходнімі краінамі. Канцом гэтай хвалі можна лічыць сярэдзіну 1990-х, калі пачалі дзейнічаць забароны на працу замежных фондаў і ініцыятыў (адзін з найбольш яскравых кейсаў — забарона дзейнасці фонда Дж. Сораса, які падтрымліваў сярод іншага і адукацыйныя праекты)[1].

Другую хвалю можна назваць «развіццём насуперак абставінам». Яна была меньш інтэнсіўная ў параўнанні з папярэдняй, але таксама значнай: яна працягвалася з канца 1990-х і да пачатку 2010-х[2]. У гэты час з'яўляліся новыя ініцыятывы, хаця аднaчасова назіраўся паступовы рост рэгламентацыі, рэгулявання з боку дзяржавы. Уводзіліся новыя заканадаўчыя акты, якія ў значнай ступені перашкаджалі адукацыйным грамадскім актыўнасцям. Сюды можна аднесці, напрыклад, неабходнасць атрымліваць дазвол на выезд навучальных груп школьнікаў ці студэнтаў ад Міністэрства адукацыі[3], неабходнасць рэгістрацыі

[1] Смолянко О., Чаусов Ю. Государственная политика в отношении некоммерческих организаций в Республике Беларусь в контексте европейских стандартов свободы. — Минск, 2016 // Центр правовой трансформации (Lawtrend): https://www.lawtrend.org/wp-content/uploads/2017/05/Gosudarstvennaya-politika_NKO-ES-3.pdf.

[2] Больш падрабязна гэты этап апісаны ў артыкуле: Babrovich V. *Civic Education in Belarus: concepts, standards, and lack of demand from the society,* Civil Society in Belarus, 2000-2015. East European Democratic Center, Warsaw 2015: https://issuu.com/eedc_warsaw/docs/final_civil_society_in_belarus_inte_5d21802f640249.

[3] О некоторых вопросах направления несовершеннолетних на обучение и лечение... Постановление Совета министров Республики Беларусь от 15 января 2008 // ZakonBy.Net: http://

гуманітарнай дапамогі з-за мяжы[4] і г.д. «Звышрэгламентацыя» працягнулася і паглыбілася пасля прэзідэнцкіх выбараў 2010 года.

Трэцяя хваля, хваля «ўмоўнай свабоды», прыйшлася на другую палову 2010-х гадоў і доўжылася да прэзідэнцкіх выбараў і поствыбарных падзей 2020 года. У гэты час назіралася пэўная лібералізацыя ў грамадскім, культурным, эканамічным жыцці Беларусі. Хоць гэты перыяд лепш апісваецца тэрмінам «фіктыўная лібералізацыя», бо знешняе асяроддзе не пераўтварылася ў цалкам спрыяльнае і папярэднія забароны працягвалі дзейнічаць. У той жа час змены ў эканоміцы, палітычным вектары, грамадскім жыцці стварылі спрыяльныя ўмовы для развіцця новых ініцыятыў.

У якасці асноўных пазітыўных тэндэнцый, якія паўплавылі на адукацыйны ландшафт, можна вылучыць наступныя.

Па-першае, дэклараваная палітыка шматвектарнасці беларускага ўрада, «мяккая беларусізацыя». Пасля крымскіх падзей 2014 года Беларусь пазіцыянавалася як краіна, адкрытая да Захаду і дэмакратычных каштоўнасцяў, таму назіраўся рост узаемадзеянняў з міжнароднымі арганізацыямі. Напрыклад, у гэты перыяд можна адзначыць супрацу з 2015 года з Сусветным банкам па мадэрнізацыі сістэмы адукацыі[5]. Такім чынам, Беларусь упершыню ўдзельнічала ў міжнародным даследаванні дасягненняў школьнікаў PISA-2018[6]. Абмеркаванне вынікаў гэтага даследавання стварыла пазітыўны прэцэдэнт сумеснага аналізу пэўнай з'явы рознымі ініцыятывамі і журналістамі.

Па-другое, павелічэнне долі прыватнага прадпрымальніцтва і сярэдняга класа[7]. Хуткі рост IT-сферы і развіццё бізнесу ў цэлым прывялі да стварэння адносна шырокай праслойкі людзей, якія маюць высокі даход і запыт на якасную адукацыю. Гэта стварыла перадумовы для заснавання і развіцця прыватных школ, хуткага росту камерцыйных адукацыйных арганізацый[8], росквіту адукацыйных

zakonby.net/postanovlenie/34406-postanovlenie-soveta-ministrov-respubliki-belarus-ot-15012008-n-33-red-ot-08062012-quoto-nekotoryh-voprosah-napravleniya-nesovershennoletnih-na-obuchenie-i-lechenie-za-predely-respubliki-belarusquot.html.

[4] Gratuitous foreign aid: receipt, registration and usage // Департамент по гуманитарной деятельности Управления делами президента Республики Беларусь: http://dha.gov.by/wp-content/uploads/2016/11/Gratuitous-foreign-aid-receipt_registration-and-usage.doc.

[5] Апісанне праекта: Belarus Education Modernization Project // The World Bank: https://projects.worldbank.org/en/projects-operations/project-detail/P148181.

[6] Агляд вынікаў: Education in Belarus // Education in the Western Balkans, Eastern Europe and Central Asia: https://pisabyregion.oecd.org/belarus/.

[7] *Александр Чубрик.* Назад в будущее, или краткая историческая справка о белорусском частном секторе (2021) // Исследовательский центр ИПМ: http://www.research.by/webroot/delivery/files/english/pdp/dp2021r03.pdf.

[8] *Оксана Шелест, Андрей Егоров, Ольга Смолянко.* Гражданское общество Беларуси: актуальное состояние и условия развития (2018) // Центр европейской трансформации: https://cet.

ініцыятыў, скіраваных на інтэлектуальны дасуг, развіцця валанцёрскіх ініцыятыў у адукацыі. Так, нягледзячы на складаную працэдуру атрымання ліцэнзіі, пачалі стварацца новыя прыватныя школы, якія маюць больш свабоды ў пабудове навучальнага працэсу ў параўнанні з дзяржаўнымі, могуць прапанаваць новыя ідэі для адукацыі. Рост камерцыйных адукацыйных арганізацый можна адзначыць як пазітыўны фактар і для некамерцыйнага сектара: даследаванне ўзаемадзеяння адукацыйных ініцыятыў паказала, што паміж імі існуе супраца, што павышае агульны сацыяльны капітал у гэтай галіне.

Па-трэцяе, наяўнасць агульнага выкліку, аб'ядноўваючай павесткі. Гэта найбольш яскрава праявілася падчас пандэміі COVID-19. Афіцыйная Беларусь заняла пазіцыю ковід-дысідэнства, што адлюстравалася і на сістэме адукацыі. Міністэрства адукацыі не давала рэкамендацый школам і ВНУ, як арганізаваць працу ва ўмовах пандэміі, як выкарыстоўваць дыстанцыйныя інструменты. Гэта стала выклікам для адукацыйных арганізацый і ініцыятыў і адначасова стала падставай для анлайн-супрацы. Напрыклад, парады для настаўнікаў школ распрацоўвалі і распаўсюджвалі адначасова прадстаўнікі адукацыйных ініцыятыў, фондаў, прыватных школ, IT-кампаній і суполкі настаўнікаў. Рэальная і адчувальная праблема стала трыгерам для супрацы адукацыйных арганізацый і часткова наладзіла шляхі зносін анлайн.

Асноўным стрымліваючым фактарам у 2015-2020 гадах па-ранейшаму была звышрэгламентацыя і бюракратызацыя адукацыі з боку дзяржавы. Міністэрства адукацыі зрабіла стаўку на стратэгію ўніфікацыі школ, рэгламентацыі дзейнасці адукацыйных устаноў, адмовілася ад актыўных дзеянняў у межах выканання Балонскага пагаднення[9], што не спрыяла развіццю разнастайнасці ідэй і падыходаў, стрымлівала патэнцыйную супрацу дзяржаўных і недзяржаўных арганізацый.

Трэцяя хваля канчаткова скончылася летам 2021 года, калі значная частка недзяржаўных адукацыйных арганізацый была ліквідавана дзяржавай, а іх лідары вымушаны былі з'ехаць з Беларусі ці прыпыніць дзейнасць, частка падверглася крымінальнаму пераследу.

---

eurobelarus.info/ru/library/publication/2018/10/11/grazhdanskoe-obschestvo-belarusi-aktual-noe-sostoyanie-i-1810110900.html.

[9] Отчет о мониторинге выполнения Стратегического плана действий по реализации основных задач развития системы образования в соответствии с принципами и инструментами Европейского пространства высшего образования. Итоги выполнения плана 2019 года // Общественный Болонский комитет: http://bolognaby.org/images/uploads/2020/01/Monitoring_str_plan_jan2020.pdf.

## Агляд сектара адукацыйных арганізацый

У Беларусі няма даставернай статыстыкі наконт таго, колькі існуе адукацыйных арганізацый і ініцыятыў. Гэта звязана з некалькімі фактарамі. Частка адукацыйных арганізацый не зарэгістравана афіцыйна ці зарэгістравана як юрыдычныя асобы ў іншых краінах. Значная колькасць грамадскіх арганізацый мае некалькі кірункаў дзейнасці, сярод якіх ёсць і адукацыя ці асвета, хаця гэта часта неасноўны кірунак працы.

Можна вызначыць некалькі тыпаў грамадскіх арганізацый у галіне адукацыі.

Па-першае, арганізацыі, якія займаюцца развіццём адукацыйнага сектара Беларусі (інфраструктура, падтрымка адукатараў, адукацыйная палітыка), маюць гэта як асноўны накірунак працы. Спецыялізацыя такіх арганізацый можа быць рознай:

- сярэдняя адукацыя (напрыклад, Таварыства беларускай школы арганізоўвала курсы, інфармацыйную падтрымку для настаўнікаў; «ЭдКэмп» — установа, якая займалася правядзеннем публічных навучальных мерапрыемстваў для настаўнікаў, фонд «Новая школа» падтрымліваў школьныя ініцыятывы, у тым ліку праект «Настаўнік для Беларусі» і інш.);
- вышэйшая адукацыя (напрыклад, Грамадскі Балонскі камітэт, студэнцкія аб'яднанні: Задзіночанне беларускіх студэнтаў, БОСС);
- дадатковая адукацыя і адукацыя дарослых (напрыклад, нямецкая міжнародная арганізацыя DVV International, Цэнтр інфармацыйнай падтрымкі грамадскіх ініцыятыў «Трэці сектар»);
- асацыяцыі ў галіне адукацыі (Асацыяцыя дадатковай адукацыі і асветы, Асацыяцыя бізнэс-адукацыі, «Адукацыя для ўстойлівага развіцця», Асацыяцыя прыватных школ).

Па-другое, адукацыйныя і асветніцкія ініцыятывы і арганізацыі. Сюды можна аднесці арганізацыі, якія працавалі па прынцыпах альтэрнатыўных універсітэтаў: напрыклад, Лятучы ўніверсітэт, Беларускі калегіюм, ECLAB. Другі тып — гэта больш вузкія ініцыятывы ў галіне культуры: напрыклад, курсы беларускай мовы «Мова Нанова», рэсурс WIR.by і інш.

Па-трэцяе, грамадскія арганізацыі, якія ў межах сваёй дзейнасці маюць адукацыйныя ці асветніцкія праекты. Напрыклад, праваабарончыя арганізацыі (Human Constanta, Беларускі Хельсінскі камітэт), экалагічныя і прыродаахоўныя («Экадом», Цэнтр экалагічных рашэнняў, «Ахова птушак Бацькаўшчыны»), рэлігійныя (YMCA Belarus, Беларуская асацыяцыя маладых хрысціянскіх жанчын) і іншыя арганізацыі.

Па-чацвертае, камерцыйныя ўстановы і арганізацыі, якія маюць уплыў на грамадскую асвету ці на іншыя некамерцыйныя адукацыйныя арганізацыі. Напрыклад, асветніцкія ініцыятывы («Адкрыты лекторый», Цэнтр інтэлектуальнага

дасугу «Факультатыў»), ініцыятывы прыватных школ, скіраваныя на падтрымку сярэдняй адукацыі (напрыклад, метадычная дапамога падчас пандэміі, інтэлектуальныя бранчы), бясплатныя курсы ад IT-кампаній і г.д.

## Узаемадзеянне адукацыйных ініцыятыў

Напрыканцы 2020 — пачатку 2021 года праводзілася даследаванне ўзаемадзеянняў беларускіх адукацыйных арганізацый і ініцыятыў[10]. Дадзеныя збіраліся і аналізаваліся па метадалогіі сеткавага аналізу (Social Network Analysis), выкарыстоўваўся прынцып «снежнага кому». Агулам было названа 256 унікальных арганізацый ці нефармальных ініцыятыў (у спіс трапілі ў тым ліку і камерцыйныя арганізацыі). Гэтая лічба дазваляе прыблізна ацаніць колькасць актыўных арганізацый у галіне адукацыі. Вынікі гэтага даследавання паказалі наступнае.

Большасць адукацыйных арганізацый — гэта мікраарганізацыі з сярэдняй колькасцю ставак да шасці. Частка людзей працуе на 0,25 ці на 0,5 стаўкі, пры гэтым праектна арганізацыі прыцягваюць шырокае кола валанцёраў ці часовых супрацоўнікаў. Каля 1/4 ініцыятыў, якія патрапілі ў даследаванне, не з'яўляюцца зарэгістраванымі, існуюць як устойлівыя супольнасці.

Сярод найбольш уплывовых і вядомых арганізацый можна вызначыць тры кірункі:

- метадычная падтрымка настаўнікаў (нефармальныя курсы, пляцоўкі для ўзаемадзеяння);
- асветніцкія праекты;
- асацыяцыі і арганізацыі, якія аказваюць дапамогу грамадзянскім ініцыятывам.

Даследаванне не выявіла ніводнай арганізацыі, якая б спецыялізавалася на дашкольнай адукацыі.

Зоаабарончае аб’яднанне «Адданае сэрца», якое існуе з 2011 года, за апошнія гады змагло дапамагчы тысячам бяздомных жывёл і зрабіла іх праблему насамрэч бачнай у грамадстве.

Пры гэтым нельга казаць, што 2015-2020 гады былі выключна пазітыўнымі для грамадзянскай супольнасці. Пасля праследу з боку міліцыі і мясцовых чыноўнікаў зачынілася галерэя «Крыга». Па фінансавых прычынах зачынілася галерэя «У Майстра» — адна з найстарэйшых прыватных галерэй Гродна. На мяжы закрыцця знаходзілася прыватная галерэя «Тызенгаўз».

## Новыя ініцыятывы 2015-2020 гадоў

Больш-менш лагодныя ўмовы прывялі да паўстання новых ініцыятыў у розных сферах. З 2015 года ў Гродне з'явіўся бегавы клуб Run4Fun з уласнай бегавой школай, які папулярызуе здаровы лад жыцця. З таго ж моманту і дагэтуль у Гродне актыўна дзейнічае прадстаўніцтва арганізацыі народнай адукацыі «Актыўным быць файна». Таксама ў 2015-м менавіта ў Гродне паўстала агульнабеларускае грамадскае аб'яднанне «Матчын рух 328», якое займаецца дастаткова вузкай тэмай — дапамогай асуджаным па антынаркатычным арт. 328 КК і прасоўваннем ідэй па змяншэнні жорсткасці такіх пакаранняў.

З 2017 года ў Гродне дзейнічае грамадскае аб'яднанне «Экаманіторынг». Яго актывісты арганізуюць прыборкі смецця, выезды на ачыстку берагоў рэк, бяруць аналізы калодзежнай вады на ўтрыманне нітратаў, супрацоўнічаюць з дзяржаўнымі структурамі ды займаюцца іншай працай на месцы для паляпшэння экалагічнай сітуацыі.

Пашыраліся класічныя для Гродна тэмы дабрачыннасці, дапамогі бедным і зоаабароны. З'явіўся шэраг новых арганізацый і ініцыятыў у гэтых кірунках: Цэнтр «Вера», Цэнтр «Пара», «Цэнтр дапамогі жыццю», «След жыцця», «Выратуй жыццё».

## 2020 год: пандэмія, уздым, салідарнасць і рэпрэсіі

Вясной 2020 года імклівае распаўсюджванне новай каранавіруснай інфекцыі COVID-19 прывяло да таго, што многія арганізацыі зменшылі актыўнасць. Хоць афіцыйна ўлады не ўводзілі лакдаўну ці нават невялікіх амбежаванняў, актывісты самі вырашылі часова адмовіцца ад афлайнавых падзей. «Універсітэт Залатога Веку», аўдыторыі якога — асобам 55+ гадоў — асабліва пагражае COVID-19, упершыню за 10 гадоў існавання сутыкнуўся з праблемай набору студэнтаў. Адказам на гэта стала распрацоўка «Віртуальнага УЗВ».

За некалькі гадоў вакол «Цэнтра гарадскога жыцця» і суседняй «Крамы Ц» стварылася супольнасць актыўных гараджан: грамадскіх актывістаў, мастакоў, сябраў палітычных партый, навукоўцаў ды інш. Гэта паспрыяла таму, што цэнтр адыграў у 2020 годзе асаблівую ролю. Ён стаў штабам валанцёраў па дапамозе медыкам. Тут шылі супрацьчумныя касцюмы, збіралі ахоўныя экраны, адсюль развозілі па шпіталях сродкі індывідуальнай засцярогі (СІЗ) для медыкаў. У пашывачны цэх па стварэнні сізаў пераўтварыліся часова і памяшканні Гродзенскага дзіцячага хоспіса. Пры гэтым афіцыйна мясцовыя ўлады не прызнавалі недахопу засцерагальных сродкаў, а дактары вымушаны былі прасіць і прымаць дапамогу ад валанцёраў ананімна, баючыся пакарання з боку адміністрацыі. Валанцёры за вясну-лета 2020 года сабралі каля 10000 ахоўных экранаў, пашылі

і размеркавалі ў медыцынскія ўстановы некалькі тысяч засцерагальных касцюмаў. Гэты прыклад паказаў, што нават у вельмі складанай сітуацыі беларусы могуць разлічваць на саміх сябе і, у пэўным сэнсе, замяніць сабой неэфектыўныя інстытуты дзяржавы.

З пачаткам палітычнага крызісу ў жніўні 2020 года «Цэнтр гарадскога жыцця» стаў штабам для актывістаў, якія намагаліся весці перамовы з мясцовымі ўладамі. У імправізаваную раду ўвайшлі прадстаўнікі штабоў апазіцыйных кандыдатаў, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый, партый, бізнесу, рабочыя буйных заводаў. Менавіта яны прымусілі мясцовыя ўлады да перамоў і забяспечылі на некалькі дзён легальныя мітынгі на галоўнай плошчы горада, на якія пад ціскам натоўпу адзін раз нават прыйшлі кіраўнікі горада і дэпутаты парламента ад Гродна.

Калі ў выніку рэпрэсій рэжысёры і акцёры Гродзенскага драматычнага тэатра былі звольнены, у верасні 2020 года новай пляцоўкай для іх спектакляў стаў менавіта «Цэнтр гарадскога жыцця».

Ролю цэнтра ў абуджэнні грамадскага жыцця безумоўна адзначылі і ўлады. Вясной 2021 года на дырэктара цэнтра Паўла Мажэйку завялі крымінальную справу за нібыта «рэабілітацыю нацызму», а 12 траўня ўстанову ліквідавалі па рашэнні эканамічнага суда. Гэтае рашэнне — відавочна палітычны заказ з мэтай спыніць дзейнасць папулярнай пляцоўкі.

Пад хвалю рэпрэсій трапіў і Гродзенскі дзіцячы хоспіс. Яго кіраўнічку Вольгу Вялічка затрымлівалі за нібыта «ўдзел у несанкцыянаваным мерапрыемстве», а потым завялі крымінальную справу за нібыта «крадзеж маёмасці грамадскай арганізацыі шляхам злоўжывання службовым становішчам». У кастрычніку 2020 года Вялічка з'ехала ў Літву. Насамрэч яе пераслед звязаны з актыўным удзелам у пратэстах у жніўні 2020 года і адкрытымі выказваннямі наконт фальсіфікацыі выбараў. У выніку хоспіс пазбавілі часткі памяшканняў, якія раней яму прадставілі гарадскія арганізацыі.

У лістападзе 2020 года камунальнае прадпрыемства разарвала дамову арэнды з тайм-кафэ «Партал». Стваральнікі пляцоўкі звязваюць гэта з палітычнай сітуацыяй у краіне.

Лакальнае інтэрнэт-выданне Hrodna.life, якое найбольш актыўна асвятляла жыццё грамадзянскай супольнасці і пісала пра большасць ініцыятыў, таксама зведала рэпрэсіі. У студзені 2021 года ў рэдакцыі прайшоў вобшук, была вынятая тэхніка, а ў сакавіку выданне пакаралі штрафам больш за 12000 рублёў за нібыта «распаўсюд экстрэмісцкіх матэрыялаў». З ціскам сутрэлася і адно з найстарэйшых незалежных друкаваных выданняў рэгіёна — «Газета Слонімская». У рэдакцыі таксама вынялі тэхніку, а кіраўніцтва газеты на паўгода выехала за мяжу, але і пасля яго вяртання выхад друкаванай версіі не аднавіўся.

## Галоўная небяспека — ад’езд актыўных з краіны

Вынікам падзей лета і восені 2020 года ў Гродне стаў спачатку вялікі ўздым грамадскай актыўнасці і прыток новых людзей, а потым — моцны контрудар рэпэрсіўнай машыны ўладаў. Аднак гэта не прывяло да поўнага знішчэння грамадскага сектара. Здабыткі грамадзянскай супольнасці, безумоўна, будуць граць сваю ролю, нават калі папулярныя пляцоўкі будуць закрыты ўладамі. Мноства фармальных і нефармальных ініцыятыў змогуць працягваць існаванне далей. Вялікую ролю ў працягу існавання грамадскага сектара будзе граць нябачаная раней салідарнасць і пачуццё супольнасці, якія беларусы адчулі ў 2020 годзе.

Пэўны адкат звязаны перадусім з тым, што многія актыўныя гродзенцы былі вымушаны з’ехаць з горада, каб пазбегнуць рэпрэсій. Імклівы адток людзей тычыцца лідараў, прафесіяналаў, студэнтаў, актывістаў, якія, пакуль не зменіцца палітычная сітуацыя ў краіне, наўрад ці будуць разглядаць варыянт вяртання на радзіму. Больш за тое, у сітуацыі ўзмацнення рэпрэсій мы назіраем усё новыя хвалі палітычнай эміграцыі, што захоўвае людзей ад удару, але аслабляе структуры грамадзянскага руху ў краіне.

# Гомельшчына: грамадзянская супольнасць на паўзе

Ірына Віткоўская

У дадзеным артыкуле гаворка пойдзе менавіта пра NGO. Дзейнасць GONGO, кшталту «Беларускага Таварыства Чырвонага Крыжа» ці прафсаюзных арганізацый, мы пакінем па-за рамкамі гэтага тэксту. Мы разгледзім аб'яднанні, установы ды ініцыятывы дэмакратычнай скіраванасці, якія вымушаны былі ў 2020-2021 гадах прыпыніць сваю актыўную дзейнасць. Такая паўза была выклікана трыма фактарамі: пандэміяй, эміграцыяй грамадскіх актывістаў і рэпрэсіямі.

Знайсці афіцыйную статыстыку ў адкрытым доступе пра грамадскія аб'яднанні Гомеля і Гомельшчыны даволі праблематычна. Сайт Мінюста падае інфармацыю пра зарэгістраваныя арганізацыі па краіне ў цэлым і не дае звестак пра рэгіянальны падзел. Але можна казаць, што ў перыяд пасля 2010 года назіраўся актыўны рост новых ініцыятыў і грамадскіх установаў на Гомельшчыне. Як адзначае грамадскі актывіст Яўген Меркіс, «тады быў росквіт ініцыятыў, бо тады пайшлі на спад палітычныя рэпрэсіі пасля выбараў 2010 года, з'явіліся новыя магчымасці, новыя цэнтры гуртавання людзей, паступова працавалі сацыяльныя сеткі».

## Установа «Цэнтр рэгіянальнага развіцця ГДФ»

«Гомельскі дэмакратычны форум» (ГДФ) існуе з 2008 года. Ад пачатку ГДФ існаваў як грамадская ініцыятыва, а ў 2013 годзе рэгіструецца ў якасці ўстановы і цяпер афіцыйна называецца Установа «Цэнтр рэгіянальнага развіцця ГДФ». Яе мэтамі з'яўляецца садзейнічанне сацыяльна-палітычным трансфармацыям: «беларускае грамадства мусіць быць моцным, актыўным і адказным; беларуская дзяржава мусіць быць адкрытай, справядлівай і падсправаздачнай».

Дырэктар установы Пётр Кузняцоў адзначае, што ўсе гады дзейнасці ў іх была стратэгія, скіраваная на спрыянне ўстойліваму развіццю рэгіёнаў Беларусі: «Пад устойлівым развіццём мы разумеем развіццё ў адпаведнасці крытэраў устойлівага развіцця ААН. Тое, што называецца good governance. Дзеля гэтага

мы рабілі акцыі і нейкія актыўнасці, каб падвысіць ролю грамадзян у працэсе прыняцця рашэнняў, у планаванні развіцця».

Найбольш запамінальныя кампаніі ГДФ за гады дзейнасці: гарадскія сходы, моладзевы дыскусійны клуб «Цывілізацыя» і грамадзянская кампанія «Навабеліца», якую ў 2012-2014 гадах ладзіла мясцовая актывістка Галіна Краўчанка. Кампанія была накіравана на вырашэнне лакальных праблем сіламі мясцовай грамады.

Гарадскія сходы ГДФ ладзіліся з 2016-га па 2019-ы гады кожны месяц. Людзі збіраліся, каб абмяркоўваць тыя ці іншыя праблемы горада і накіроўваць да ўладаў патрабаванні ці прапановы, як гэтыя праблемы вырашаць. Гэтыя гарадскія сходы ў спалучэнні з інфармацыйнымі кампаніямі і грамадскімі актыўнасцямі прыносілі шмат плёну. Напрыклад, у межах сходаў у 2018 годзе з'явілася ідэя стварыць петыцыю з патрабаваннем вырашыць адну з найбольш актуальных праблем горада — завяршыць будаўніцтва «Усходняга абыходу», каб разгрузіць цэнтр горада. Гарадскія сходы ўзялі паўзу ў 2020 годзе ў сувязі з пандэміяй COVID-19. Пасля выбараў пачаліся рэпрэсіі, і любыя сходы разганяюцца ўладамі.

Установа «Цэнтр рэгіянальнага развіцця ГДФ» з'яўляецца ўладальніцай двух інфармацыйных праектаў у Гомельскай і Магілёўскай абласцях — сайтаў gomel.today і mogilev.online.

## Урбаністычны кірунак

Пасля 2010 года папулярнасць набываюць ініцыятывы ўрбаністычнага кірунку. Урбаністычным актывізмам пачалі называць любую гарадскую актыўнасць (што не зусім правільна, паколькі першапачаткова ўрбаністыка — гэта вузкая навуковая сфера, звязаная з гарадскім планаваннем).

У 2016 годзе паўстае ўрбаністычная ініцыятыва Smart Homel, якая мае на мэце аб'яднанне тых, хто прагне зрабіць горад лепей, працуе над пытаннямі развіцця горада, транспартнай яго інфраструктуры, знешняга выгляду і камфортнасці пражывання і знаходжання ў ім усіх людзей. Сярод ініцыятыў Smart Homel — прыборка лясоў, абарона сквера ў цэнтры Гомеля каля гатэля «Турыст» (разам з жыхарамі навакольных дамоў і іншымі арганізацыямі і ініцыятавамі), стварэнне петыцый супраць некаторых ініцыятыў чыноўнікаў.

Ініцыятар Smart Homel Яўген Меркіс адзначае, што «самыя лепшыя дасягненні звязаны, на жаль, не з тым, што мы змаглі зрабіць у горадзе, каб на гэта можна было паглядзець, а хутчэй з тым, што мы змаглі адбіць, каб у горадзе не зрабілі». Спецыфіка шматлікіх гарадскіх ініцыятыў у Гомелі палягае ў тым, каб змагацца супраць абсурдных і глупых рашэнняў. У Гомелі ў самым цэнтры горада спрабавалі прасунуць ідэю будаўніцтва падземных пераходаў. І гэты праект мусіў выцягнуць вялізную колькасць грошай. На магчымую праблему звярнулі ўвагу

блогеры, у выніку ўдалося адбіцца ад рэалізацыі гэтай ідэі. Smart Homel спрабаваў дзейнічаць і ў канструктыўным рэчышчы. Напрыклад, з дапамогай візуальных сродкаў паказваў, якім мог бы быць Гомель. Уздымаў праблему адсутнасці зялёных насаджэнняў у горадзе. На дадзены момант ініцыятыва Smart Homel узяла паўзу ў сувязі з падзеямі ў краіне.

Акрамя Smart Homel, у горадзе існавалі і іншыя ўрбаністычныя ініцыятывы. Напрыклад, «Пошукі старога Гомеля». Аднак паколькі стваральнікі ініцыятывы эмігравалі, то дзейнасць перайшла збольшага ў анлайн-фармат. У Гомелі не шмат ініцыятыў афармлялася менавіта ў нейкія суполкі ці аб'яднанні, а залежала ад гарадскіх актывістаў. То бок актывіст сам па сабе быў і крыніцай ініцыятывы, і яе арганізатарам.

Можна прыгадаць мерапрыемства, прысвечанае 100-годдзю БНР, якое прайшло ў Гомелі дзякуючы актыўнасці асобных людзей, а не нейкай арганізацыі ці ініцыятывы. У абласным цэнтры ўгодкі Беларускай Народнай Рэспублікі прайшлі заўважна. Пачалося святкаванне з экскурсіі па гомельскіх мясцінах БНР, а працягнулася канцэртам, на які давялося нават ствараць папярэднюю рэгістрацыю, паколькі памяшканне магло ўмясціць не болей за 100 чалавек. Гомельскія ўлады не прадаставілі вялікай пляцоўкі для святочнага канцэрта, таму грамадзянская супольнасць у адказ арганізавала мноства імпрэз, сустрэч, эксурсій і канцэртаў, прысвечаных 100-годдзю БНР.

Можна прыгадаць таксама беларускамоўную калядную ялінку для дзяцей у 2015 годзе, арганізаваную актыўнымі людзьмі горада (сабрала 70 чалавек), аднак паспяховасць гэтай ініцыятывы не вылілася ў стварэнне нейкай суполкі, якая б займалася прасоўваннем інтараэсаў прыхільнікаў беларускай мовы.

Можна прывесці ў прыклад і іншы выпадак, калі актывіст з Гомеля стварыў ініцыятыву, якая распаўсюдзілася на ўсю краіну. Так, у адказ на выклікі пандэміі COVID-19 менавіта з Гомеля стартавала ініцыятва ByCovid19 па дапамозе медыкам. Яе стваральнік — праваабаронца Андрэй Стрыжак. У інтэрвью «Беларускаму Радыё Рацыя» ён распавёў, як з'явілася ініцыятыва: «Напрыканцы сакавіка я прачытаў допіс Максіма Ачарэтняга, у якім ён папрасіў, каб мы ўсе засталіся дома, каб ён мог працаваць. І я вырашыў даведацца, ці ёсць у Максіма ўсё неабходнае для таго, каб ён мог працаваць. І я даведаўся, што ёсць недахоп сродкаў абароны, у прыватнасці, рэспіратаў FFP3-класа абароны. І я пачаў іх шукаць. І з гэтага ўсё пачалося».

Ініцыятыва стала агульнабеларускай. Праіснавала яна тры месяцы, пасля чаго спыніла сваю дзейнасць. За гэты час атрымалася сабраць суму ў 355 тыс. доляраў для дапамогі медыкам. Сам Андрэй Стрыжак вымушаны быў пакінуць Беларусь.

## Праваабарончыя ініцыятывы

У Гомелі існуюць структурныя падраздяленні праваабарончага цэнтра «Вясна» і Беларускага Хельскінкскага камітэта. Таксама дзейнічае «Цэнтр стратэгічнай цяжбы», які дапамагае беларускім грамадзянам адстойваць свае грамадзянскія ды палітычныя правы як унутры краіны, так і ў міжнародных структурах. Цэнтр накіроўваў у Камітэт ААН па правах чалавека паведамленні пра парушэнні правоў, аказваў юрыдычную дапамогу грамадзянам, чые правы парушала беларуская дзяржава. Прычым цэнтр займаецца дапамогай не толькі жыхарам Гомеля, але і ўсёй краіны. У студзені 2021 года «Цэнтр стратэгічнай цяжбы» вымушаны быў узяць паўзу, паколькі быў арыштаваны і накіраваны ў СІЗА яго кіраўнік Леанід Судаленка.

## Гомельская філія БАЖ

Гомельская філія БАЖ з'яўляецца рэгіянальнай структурай Беларускай асацыяцыі журналістаў. Яна была створана ў лютым 1997 года. Філія аб'ядноўвае журналістаў Гомеля і мае статут зарэгістраванага аб'яднання. Першым старшынёй арганізацыі быў Анатоль Гатоўчыц. У 2018 годзе старшынёй абралі Міколу Бянько.

Акрамя ўнутрыарганізацыйнай актыўнасці, філія праводзіць і адкрытыя гарадскія мерапрыемствы. Напрыклад, высілкамі Гомельскай філіі БАЖ у горадзе ўзнавіліся мясціны, звязаныя са знакамітым літаратурным пэрсанажам Іллі Эрэнбурга, створаным у забароненым савецкай цэнзурай рамане «Бурлівае жыццё Лазіка Ройтшванеца». Так, у 2018 годзе, на 90-годдзе выхаду гэтай кнігі, БАЖ зладзіў тэматычны фэст. Падчас яго адбыўся канцэрт з удзелам гомельскага ансамбля габрэйскай музыкі, экскурсія па мясцінах Лазіка Ройтшванеца і сустрэча ў тэатры лялек.

У 2019 годзе Гомельская філія БАЖ зладзіла адкрытую гарадскую канферэнцыю «Праўда пра Чарнобыль». На мерапрыемстве выступілі старшыня пастаяннага камітэту па чарнобыльскіх пытаннях Вярхоўнага Савета XIII скліканя Віктар Хоміч, журналіст-фрылансер Андрэй Мядзведзеў, рэдактар інтэрнэт-партала Rynak.by Аляксей Харкевіч, ліквідатар Адам Варанец і ўдзельнік руху «Навукоўцы за без'ядзерную Беларусь» Юрый Варонежцаў (у фармаце відэаінтэрв'ю).

У 2020 годзе падчас пандэміі філія стала праводзіць унутраныя мерапрыемствы ў анлайн-фармаце. Таксама на дзейнасць арганізацыі паўплывалі рэпрэсіі ў дачыненні да журналістаў. Так, філія пакуль адмовілася ад правядзення адкрытых гарадскіх мерапрыемстваў.

## Моўны кірунак

Пасля 2010 года ў Гомелі з'яўляюцца два цэнтры, якія гуртуюць вакол сябе прыхільнікаў беларускай мовы — «Мова Нанова Гомель» (з'яўляецца структурным падраздзяленнем агульнабеларускіх курсаў «Мова Нанова») і «Цэнтр беларускай мовы».

У 2014 годзе ў Гомелі адкрываюцца моўныя курсы «Мова Нанова». Напачатку яны праходзяць у філіяле Веткаўскага музея. Потым у анты-кавярні «Флэт», потым у арт-прасторы «Каўчэг» і ў «Цэнтры беларускай мовы». Курсы праводзіліся кожны тыдзень за выняткам лета. Акрамя штотыднёвых моўных заняткаў, таксама арганізоўваліся гарадскія мерапрыемствы. Напрыклад, узімку 2020 года прайшоў моўны сямейны фэст, прымеркаваны да Дня роднай мовы. У межах праграмы былі майстар-класы па кераміцы, выступы рыцараў, батлейка, выступ дудара і музычная пастаноўка. Аднак пандэмія COVID-19, якая пачалася ўвесну 2020 года, вымусіла курсы перайсці ў анлайн-фармат. У 2021 годзе прайшло некалькі заняткаў афлайн, пасля чаго заняткі зноў сталі праходзіць праз зум-канферэнцыю. Арт-прастора «Каўчэг» і «Цэнтр беларускай мовы», дзе праходзілі заняткі «Мова Нанова», праз пандэмію таксама перасталі дзейнічаць. Адпаведна гомельскія курсы сутыкнуліся з праблемай памяшкання і сталі дзейнічаць у анлайн-рэжыме.

«Цэнтр беларускай мовы» паўстаў з ініцыятывы Гомельскай гарадской арганізацыі Таварыства беларускай мовы (ТБМ) у 2017 годзе. Старшыня гомельскага аддзялення ТБМ Алеся Аўласевіч на той момант так распавядала пра стварэнне цэнтра: «Вельмі хочацца мець месца, дзе можна разам сабрацца, дзе можна правесці гурткі, і каб гэта было на сталай аснове, каб працавала бібліятэка і можна было паглядзець кіно ці згуляць у настолку. Таму з'явіўся гэты цэнтр».

За гады існавання цэнтра там праходзілі кінапрагляды на беларускай мове, праходзіў размоўны гурток «Лемантар», дзіцячыя гурткі па вывучэнні мовы «Мова дзяцей». Таксама цэнтр прадастаўляў пляцоўкі для розных ініцыятыў (гурток «Гендэрныя даследаванні», «Гурток eco up», курсы ўкраінскай мовы, гурток speak up).

## Краязнаўчая арганізацыя «Талака»

Краязнаўчая арганізацыя «Талака» — найстарэйшая няўрадавая грамадская арганізацыя Гомеля. Асноўнымі мэтамі і прадметамі дзейнасці ГМКГА «Талака», згодна статуту, з'яўляюцца: вывучэнне, захаванне і папулярызацыя сярод моладзі беларускай нацыянальнай культуры, гісторыі ды краязнаўчая дзейнасць як адзін з фактараў нацыянальнага адраджэння Беларусі і пабудовы дэмакратычнага грамадства. Аб'яднанне паўстала ў 1986 годзе. На той момант

гарадскія ўлады нават прапаноўвалі для талакоўцаў памяшканне на выбар у дзяржаўнай установе для сустрэч. У 2021 годзе памяшканне аб'яднанню ўлады ўжо не прапаноўвалі, аднак яно працягвала праводзіць фальклорныя меарыпрем-ствы, такія як правядзенне святаў «Гуканне вясны», «Купалле», «Шчадраванне» і г.д. На момант вясны 2021 года гэта была хіба адзіная арганізацыя, якая яшчэ праводзіла мерапрыемствы афлайн.

Арганізацыя таксама арганізоўвала студэнтаў на ажыццяўленне раскопак на Grodzisk паблізу Гомеля кожны год, праводзіла акцыі супраць будаўніцтва жылой нерухомасці ў ахоўнай зоне гістарычнага помніка ў горадзе. З выдаленнем з універсітэта выкладчыка і старшыні арганізацыі Яўгена Малікава ў 2021 годзе арганізацыя прыпыніла сваю дзейнасць.

Такім чынам, як бачым, актыўнасць у Гомелі пасля 2020 года сышла ў анлайн ці ўзяла паўзу. Афлайнавыя мерапрыемствы з'яўляюцца хутчэй выключэннем, чым правілам.

# Грамадскія арганізацыі Магілёўшчыны ў 2015-2021 гадах

Аўтар тэкста – актывіст мясцовай НДА

На сайце галоўнага ўпраўлення юстыцыі Магілёўскага аблвыканкама адсутнічае абагульняючая інфармацыя пра колькасць і структуру зарэгістраваных грамадскіх арганізацый вобласці. Аднак у ім маецца «Спіс дзейных мясцовых грамадскіх аб'яднанняў, зарэгістраваных галоўным упраўленнем юстыцыі Магілёўскага аблвыканкама» ад 31 снежня 2020 года. У гэтым спісе зафіксавана 91 мясцовая арганізацыя Магілёўскай вобласці. Да ліку грамадскіх арганізацый рэгіёна трэба дадаць таксама «нізавыя» арганізацыі рэспубліканскіх аб'яднанняў, большасць з якіх так ці інакш была прадстаўлена ў Магілёўскай вобласці ў якасці філіялаў або мясцовых арганізацый ці рэгіянальных менеджараў.

Пры ацэнцы дзейнасці грамадскіх арганізацый у Беларусі мала ведаць кірунак дзейнасці арганізацыі, важна ўсведамляць, якія арганізацыі з'яўляюцца рэальна самадзейнымі і грамадскімі, а якія фактычна застаюцца з савецкіх часоў ці адразу ствараюцца паслухмяным прыдаткам дзяржаўнага механізму. Пасля крызісу 2020 года ў Беларусі ўлады наноў спрабуюць стварыць «сваю» грамадзянскую супольнасць і адзяржавіць або ліквідаваць незалежныя існуючыя аб'яднанні.

У гэтым артыкуле мы не будзем разглядаць відавочна праўладныя грамадскія арганізацыі, таксама як і дзейнасць НДА, якія знаходзяцца ў цесным сімбіёзе з дзяржаўнымі інстытутамі, а сканцэнтруемся толькі на найбольш заўважных у 2015-2020 гадах незалежных НДА.

## Праваабарончыя арганізацыі

На Магілёўшчыне найбольш актыўна ў апошняе дзесяцігоддзе дзейнічалі агульнанацыянальныя праваабарончыя арганізацыі: Беларускі Хельсінскі камітэт (БХК) і Праваабарончы цэнтр «Вясна». У Магілёве была зарэгістравана адзіная ў Беларусі рэгіянальная праваабарончая арганізацыя — «Магілёўскі праваабарончы цэнтр».

Беларускі Хельсінскі камітэт заўсёды актыўна ўдзельнічаў у абароне палітычных правоў беларусаў. Яго сябры займаліся прававым навучаннем, распаўсюд-

жваннем прававых ведаў, маніторынгам правядзення выбараў і судовых рашэнняў па выяўленых парушэннях. Звароты грамадзян прымаліся найперш пры парушэннях Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах, надалей аказвалася юрыдычная дапамога. Падчас падзей 2020 года БХК найперш прадстаўляў сваю дапамогу па легалізацыі назіральнікаў і валанцёраў на выбарах, а таксама сяброў іншых праваабарончых незарэгістраваных структур, па юрыдычнай дапамозе ахвярам рэпрэсій.

На Магілёўшчыне падчас выбарчых кампаній апошняга дзесяцігоддзя найбольш актыўнай праваабарончай арганізацыяй стаў Праваабарончы цэнтр «Вясна». У 2020 годзе цэнтр наладзіў маніторынг і складанне спісу затрыманых па палітычных прычынах грамадзян, а таксама канкрэтную дапамогу ўдзельнікам пратэстаў. З гэтай прычыны сябры «Вясны» падвергліся найбольшаму сярод праваабаронцаў пераследу ў ходзе і пасля крызісу 2020 года.

Грамадскае аб’яднанне «Магілёўскі праваабарончы цэнтр» (МПЦ) было заснавана ў 1998 годзе групай актывістаў на чале з Сяргеем Абадоўскім і амаль 25 гадоў абараняла правы магілёўцаў. Асноўнымі кірункамі працы цэнтра было абарона і юрыдычная дапамога пры парушэннях Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах, абарона помнікаў гісторыі і культуры Магілёўшчыны. У 2020 годзе наяўнасць афіцыйных пасведчанняў членаў МПЦ дапамагла ім і многім іншым актывістам афіцыйна займацца абаронай правоў магілёўцаў і валанцёрскай працай, у тым ліку ў рамках іншых структур, напрыклад, цэнтра «Вясна». «Магілёўскі праваабарончы цэнтр» «пратрымаўся» даўжэй за ўсе праваабарончыя структуры, быў ліквідаваны ў лютым 2022 года.

Беларуская асацыяцыя журналістаў (БАЖ) заўсёды з’яўлялася не толькі прафесійнай супольнасцю, але па сваёй сутнасці праваабарончай арганізацыяй. Магілёўская абласная філія была рэгіянальнай структурай БАЖ. Незалежныя журналісты, многія з якіх не мелі прафесійнай адукацыі, дзякуючы трэнінгам, майстар-класам, семінарам атрымоўвалі досвед у розных сферах журналістыкі. Магілёўская філія праводзіла таксама адкрытыя мерапрыемствы, напрыклад, прэс-клубы па рознай тэматыцы з удзелам магілёўскіх актывістаў. Магілёўская абласная суполка БАЖ стала лаўрэатам конкурсу «Лепшая філія 2019 года», а Бабруйская суполка ўзнагароджана спецыяльным дыпломам «За мэтанакіраваную працу для гуртавання супольнасці». У 2020 годзе падчас пандэміі COVID-19 філіі вобласці пачалі праводзіць унутраныя мерапрыемствы ў фармаце анлайн і зрэдку афлайн. Пасля ліквідацыі БАЖ у жніўні 2021 года афіцыйная работа магілёўскай філіі прыпынена, адбываюцца толькі нефармальныя кантакты і сустрэчы.

## Экалагічныя таварыствы

Найбольш актыўна магілёўскія актывісты выступалі за захаванне прыроднага асяроддзя ў парку Падміколле (безвынікова), наданне Пячэрскаму лесапарку статусу заказніка (паспяхова), займаліся аховай поймы ракі Дубравенка, выступалі супраць шкоднага ўздзеяння вытворчасці фірмы «Омск Карбон» у Магілёве. Праблема ўздзеяння паўднёвай прамысловай зоны на экалогію Магілёва і сёння застаецца галоўнай для эколагаў. Сістэматычна праводзяцца і экалагічныя экспертызы новых інвестыцыйных і горадабудаўнічых праектаў.

18 красавіка 2019 года па ініцыятыве «Магілёўскага грамадскага магістрата» адбыўся круглы стол «Экалогія Магілёва: выклікі і рашэнні», які сабраў амаль усе незалежныя ініцыятывы і арганізацыі, якіх цікавяць экалагічныя праблемы. Удзельнікамі круглага стала сталі прадстаўнікі «Магілёўскага грамадскага магістрата», Магілёўскага абласнога аддзела ГА «Беларускае геаграфічнае таварыства», МАА «Экапартнёрства», «ЭНДО», «Экапраект», кіраўнікі экалагічных ініцыятыў ад ТБМ, клуба аматараў гісторыі і падарожжаў «Чароўны ўспамін», «За здаровы Магілёў», «Зялёная сетка», «СПП», «Цэнтр гарадскіх ініцыятыў», «Падміколле», прадстаўнікі навучальных устаноў, БАЖ, а таксама прадстаўнікі АГП і БХД.

Удзельнікі дамовіліся разгледзіць пытанні аб стварэнні каардынацыйнага савета па экалагічных праблемах, аб накіраванні прадстаўнікоў у рабочыя групы па распрацоўцы рэгіянальнай стратэгіі ўстойлівага развіцця, аб разглядзе пытанняў па стварэнні юрыдычна-прававой групы, інфармацыйнай групы для шырокага абмеркавання праблем, азнаямлення шырокай грамадскасці аб выніках працы каардынацыйнага савета, па правядзенні інтэрактыўнай (дыялогавай) дзейнасці. На жаль, працэс стварэння каардынацыйнага савета магілёўскіх эколагаў зацягнуўся, а падзеі 2020 года канчаткова прыпынілі каардынацыю дзейнасці эколагаў у сувязі з масавай выездам за граніцу экаактывістаў з Магілёва.

## Урбаністычны кірунак

«Магілёўскі грамадскі магістрат» — грамадзянская ініцыятыва, мэтай якой з'яўляецца актывізацыя мясцовай супольнасці і кансалідацыя інтэлектуальных сіл горада ў сацыяльна значнай дзейнасці. Найбольш удала ініцыятыва займалася прасоўваннем ідэй мясцовага самакіравання. Вакол «Магістрата» сфарміравалася стабільная група магілёўскіх экспертаў, якія займаюцца даследаваннямі сацыяльна-эканамічных працэсаў і планаваннем рэгіянальнага развіцця. Яе высілкамі былі праведзены некалькі навукова-практычных канферэнцый у 2012-м, 2015-м і 2017-м гадах.

Дастаткова актыўна арганізацыя шукала формы рэалізацыі сваіх задач у 2015-2016 гадах. Сябры «Магістрата» актыўна ўдзельнічалі ў абмеркаванні праекта новага генеральнага плана развіцця Магілёва і ўносілі свае прапановы. Новы ўсплеск актыўнасці адбыўся ў дзейнасці арганізацыі ў 2019 годзе, калі быў праведзены шэраг круглых сталоў і грамадскіх слуханняў па экалагічных, гістарычных, моўных, сацыяльных праблемах.

Брэндавай ініцыятывай «Магілёўскага грамадскага магістрата» стала абранне па версіі грамадскасці «Асобы» і «Падзеі» года ў Магілёве, узнагароджанне пераможцаў традыцыйна праводзілася менавіта ў дзень надання гораду Магдэбургскага права (28 студзеня).

Падобныя «магістраты» ствараліся па вобразу магілёўскага ў Горках, Крычаве, Клімавічах, Шклове. Найбольш вядома і паказальна дзейнасць шклоўскага «Магістрата».

«Цэнтр гарадскіх ініцыятыў» (ЦГІ) — установа культуры, якая мае на мэце ініцыяванне і дапамогу ў рэалізацыі розных праектаў у сферы культуры і ўрбаністыкі. Гэта своеасаблівая экспертна-менеджарская ініцыятыва ў гэтай сферы ў Магілёве.

У 2015 годзе ЦГІ першым у краіне, разам з музеем гісторыі горада Магілёва, рэалізаваў праект па раздачы бясплатнага вайфаю на плошчы Славы. У 2017 годзе «Падзеяй года» стаў праект ЦГІ — стрыт-арт «Вершы на сценах». Магілёўскімі брэндамі сталі фестывалі ЦГІ «Дранікфэст» і «Вялікі гарадскі пікнік». Стрыт-арт-праекты і сёння ўпрыгожваюць Магілёў.

Восенню 2015 года нарадзілася ідэя «Школы гарадскіх ініцыятыў». Так з'явілася першая «Цяпліца» — школа актывізацыі і ўцягвання жыхароў горада ў рэалізацыю праектаў у сферы гарадскога актывізму шляхам стварэння супольнасці менеджараў гарадскіх праектаў. За 4 гады ў рамках школы былі рэалізаваны больш за 34 грамадска значныя і карысныя для горада праекты.

Вельмі істотнай была ўрбаністычная накіраванасць арганізацыі. У 2016 годзе створана канцэпцыя развіцця веласіпеднага руху ў горадзе Магілёве. У 2017 годзе стартавала дыскусійная пляцоўка «Гарадскія дыялогі» і «Лабараторыя мясцовага актывізму», дзе ўсе зацікаўленыя бакі мелі магчымасць абмяркоўваць актуальныя тэмы развіцця горада.

## Культурніцкія арганізацыі і ініцыятывы

Кампанія «Будзьма беларусамі!» — найбольш паспяховы ўнутраны прадукт Згуртавання беларусаў свету «Бацькаўшчына» — у Магілёве, Горках, Бабруйску, Крычаве праводзіла ток-шоў, «Кірмашы праектаў» і дапамагала шукаць сродкі на здзяйсненне задум мясцовых актывістаў, найбольш актыўна ў 2015-2017 гадах.

Магілёўскае абласное аддзяленне Саюза беларускіх пісьменнікаў (СБП) аб'яднала амаль усіх самастойных незалежных ад улады беларускамоўных пісьменнікаў вобласці. Аддзяленне з 2013 года выпускала літаратурны альманах «БРАМА», да 2019 года выйшла 7 нумароў. Выпуск, прэзентацыі «БРАМЫ» ў дзяржаўных і недзяржаўных установах ажывілі літаратурнае жыццё на Магілёўшчыне, зрабілі беларускіх пісьменнікаў з самастойнай пазіцый і крытычным мысленнем больш вядомымі, пашырылі кантакты творцаў са сваімі калегаімі ўнутры краіны і за яе межамі.

Магілеўскі аддзел ГА «Беларускае геаграфічнае таварыства» існуе з 1956 года. Аднавіў дзейнасць у 1995 годзе і з таго часу стаў адной з самых сталых і аўтарытэтных арганізацый вобласці. Вынікі дзейнасці рэгулярна асвятляліся на старонках публічнага органа араганізацыі — навуковага часопіса «Магілёўскі мерыдыян». Арганізацыя праводзіла навукова-практычныя канферэнцыі, семінары, публічныя дыскусіі і круглыя сталы па самых разнастайных аспектах устойлівага развіцця, цыркулярнай эканомікі, развіцця аграэкатурызму. Яе чальцы арганізоўвалі вандроўкі і экспедыцыі па Магілёўскай вобласці і Беларусі. Арганізацыя павялічвала сваю актыўнасць з года ў год. Калі ў 2015-2016 гадах яна праводзіла або ўдзельнічала ў сярэднім у 20 пасяджэннях, мерапрыемствах на год, то ў 2017 годзе — у 90, у 2018 годзе — у 50, 2019 годзе — у 80. Пасля падзей 2020 года работа арганізацыі фактычна перайшла ў рэжым чакання і анлайн-сустрэч.

Клуб аматараў беларускай гісторыі і падарожжаў «Чароўны ўспамін» быў утвораны ў 1994 годзе. Сябры клуба не толькі вандравалі па Беларусі і знакавых для беларусаў мясцінах свету, але і праводзілі шматлікія вечарыны і імпрэзы, стварылі шэраг выстаў, у іх ліку перасоўных: «Архітэктура Беларусі», «Сцежкамі Максіма Багдановіча». З шэрагу сяброў клуба вырасла некалькі кіраўнікоў іншых магілёўскіх арганізацый і ініцыятыў. Але з гадамі актыўнасць клубнай дзейнасці зменшылася, а пандэмія COVID-19 канчаткова пераўтварыла яго ў сяброўскую супольнасць.

«Беларускія танцы» — магілёўская ініцыятыва па арганізацыі і навучанні народным танцам. Нягледзячы на ад'езд некаторых лідараў пасля 2020 года з Магілёва, працягвае сваю дзейнасць, рэгулярна арганізоўвае беларускія танцы і скокі. Падобная ініцыятыва дзейнічала і ў Бабруйску. Праект «Вечарынка: народныя танцы ў Бабруйску», які стварае магчымасць далучыцца да традыцыйнай культуры праз танец і супольны адпачынак, нават перамог на конкурсе ідэй «Бабруйск — культурная сталіца 2017 года» пры правядзенні «Кірмашу праектаў».

## Моўны кірунак

Магілёўская абласная арганізацыя Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны» не займалася правядзеннем канкрэтных мерапрыемстваў, збіралася нерэгулярна, але давала юрыдычныя падставы для дзейнасці гарадскіх і раённых суполак ТБМ і падтрымлівала ініцыятывы знізу.

З канкрэтных спраў абласной арганізацыі можна вылучыць правядзенне інтэлектуальнага спаборніцтва для школьнікаў пад назвай «Беларускае пяціборства». У 2015-2016 гадах Магілёўская абласная арганізацыя ТБМ аказвала арганізацыйную дапамогу ў рэалізацыі праекта «Магдэбургскае права на Магілёўшчыне».

Гарадскія і раённыя суполкі ТБМ найбольш актыўна дзейнічалі ў Асіповічах, Краснаполлі, Магілёве, Шклове.

Магілёўская гарадская арганізацыя ТБМ, ў адрозненне ад абласной, займалася канкрэтнымі справамі і працай са сваім актывам: праводзіла шматлікія імпрэзы да памятных дат і сустрэчы з беларускамоўнымі пісьменнікамі, артыстамі, спевакамі, штогод арганізоўвала агульнанацыянальную дыктоўку да Дня роднай мовы 21 лютага, ладзіла разнастайныя краязнаўчыя вандроўкі па Беларусі і г.д. Дзякуючы ёй, ствараліся беларускамоўныя класы ў Магілёве, рэгулярна праводзіўся конкурс «Сакавіцкае рэха», прысвечаны Сусветнаму дню паэзіі, быў усталяваны паклонны крыж на месцы масавых расстрэлаў НКУС ля мясакамбіната (арганізатар — Уладзімір Пухоўскі), займалася абаронай помнікаў і памятных мясцін Магілёва.

Прыкметная праца вялася таксама ў Асіповіцкай і Шклоўскай раённых арганізацыях ТБМ. У 2014 годзе ў Магілёве і Бабруйску адкрыліся моўныя курсы «Мова Нанова» — філіялы галаўной ініцыятывы. Як і паўсюль, заняткі праводзіліся ў гульнёвай форме, з запрашэннем гасцей, дзякуючы чаму слухачы курсаў пабачылі і паслухалі шмат цікавых дзеячаў, музыкаў і пісьменнікаў.

## Жаночы рух

Жанчыны Магілёўшчыны вельмі актыўна ўдзельнічаюць у грамадскім жыцці рэгіёна. Ва многіх незалежных ад улады грамадскіх арганізацыях яны выйшлі на лідарскія пазіцыі, але саміх жаночых арганізацый па-ранейшаму мала. Прыемнае выключэнне — магілёўская жаночая ініцыятыва «Пралеска».

Жаночы цэнтр «Пралеска» — клуб жанчын-прафесіяналаў з грамадскіх аб'яднанняў Магілёўшчыны, якія ажыццяўляюць гендарныя, эканамічныя і культурныя асветніцкія праграмы праз клубную форму дзейнасці і творчы падыход.

Актывісткі «Пралескі» актыўна дзейнічалі не толькі ў Магілёве, але і ў раёнах вобласці. Дзякуючы іх сувязям і мерапрыемствам, у лютым 2018 года быў запачаткаваны «Клуб жаночага лідарства» ў Горках. Пік актыўнасці прыйшоўся на 2020 год, калі было праведзена шмат канкрэтных спраў. Разам з актывісткамі Бабруйска яны наладзілі выраб масак, далучылі шмат валанцёраў, адукавалі іх і раздалі маскі разам з інфармацыйнымі ўлёткамі жыхарам Бабруйска. Дапамаглі выпусціць кнігу беларускіх вершаў, песень і апавяданняў для дзетак у садках «Чароўныя назвы» аўтарства Юрыя Несцярэнкі. У Горках стварылі крызісны цэнтар эмацыйнай і псіхалагічнай разгрузкі. У Быхаве адкрылі арт-кавярню, дзе актывісты разам з людзьмі з інваліднасццю і людзьмі сталага веку робяць арт-вырабы для розных гарадскіх установ, абмяркоўваюць грамадскія праблемы і поспехі, прапаноўваюць рашэнні, плануюць крокі іх рэалізацыі, а таксама і п'юць каву са слодычамі ўсе разам. Суполка ўтварылася і ў Бялынічах.

У сувязі з ад'ездам лідара суполкі дзейнасць цэнтра «Пралеска» перайшла ў анлайн-фармат з мэтай захавання супольнасці.

## Рэсурсныя цэнтры і пляцоўкі

Цэнтр «Кола» (раней — «Кола сяброў») — былая рэсурсная арганізацыя, а сёння незалежная прастора для культурных і палітычных мерапрыемстваў у Магілёве. У апошнія гады па панядзелках тут займаліся народнымі танцамі і песнямі, у аўторак праходзілі курсы «Мова Нанова», у сераду быў дэбат-клуб, у чацвер — дзень Таварыства беларускай мовы, а ў пятніцу альбо сустрэча, альбо канцэрт. Адным з самых масавых івэнтаў стаў канцэрт Змітра Вайцюшкевіча пад Новы год, на які прыйшло больш за 150 чалавек. У 2019-2020 гадах з-за пандэміі і рэпрэсій пасля пратэстаў цэнтр значна зменшыў прыём заявак на правядзенне мерапрыемстваў, цяпер знаходзіцца ў стане кансервацыі.

Падобныя цэнтры ствараліся ў гарадах і райцэнтрах вобласці: Бабруйску, Крычаве, Шклове (некамерцыйная арганізацыя «Грамадскі цэнтр «Мост»), Горках, Чэрыкаве. Яны пераважна таксама былі незалежнымі пляцоўкамі для сустрэч актыўных грамадзян і арганізацый дэмакратычнай супольнасці. Найбольш дынамічнай і паспяховай з іх стала анты-кафэ «1368» (Бабруйск), якое за апошнія гады пачало граць у горадзе ролю цэнтра па арганізацыі самых разнастайных грамадскіх мерапрыемстваў.

Падводзячы вынікі, трэба адзначыць, што грамадская актыўнасць у разнастайных грамадскіх аб'яднаннях жыхароў Магілёўшчыны ў 2015-2020 гадах вырасла, што выявілася ў тым ліку і ва ўдзеле грамадскіх актывістаў у палітычных пратэстах супраць гвалту і за чэсныя выбары ў 2020 годзе. У рэгіёне, нягледзячы на неверагодную цяжкасць юрыдычнай рэгістрацыі ў дзяржаўных органах незалежных грамадскіх арганізацый, дзейнічала невялікая, але для палітычных рэалій

Беларусі дастаткова значная колькасць арганізацый, суполак і ініцыятыў. Па сваёй накіраванасці яны прадстаўлялі самыя розныя сферы дзейнасці: ад прафсаюзных, ветэранскіх і спартовых да дабрачынных, культурніцкіх, праваабарончых, экалагічных, жаночых і маладзёвых.

Як і па ўсёй краіне, у 2020-2021 годзе грамадзянская супольнасць Магілёўшчыны панесла сур'ёзныя страты. Большасць незалежных НДА, якія прадстаўлены ў гэтым аглядзе, была альбо ліквідавана, альбо знізіла ці прыпыніла сваю актыўную дзейнасць, што было выклікана эміграцыяй грамадскіх актывістаў і рэпрэсіямі, а таксама пандэміяй. Часткова актыўнасць сышла ў анлайн. Публічная актыўнасць сёння выяўляецца зрэдку.

Частка 2

# Палітычны крызіс 2020 года і яго наступствы

Частка 2.1

## Феномен-2020: перадумовы і характарыстыкі

# 2020 год: календарь событий

**7 мая** — гомельский предприниматель и блогер Сергей Тихановский в обращении на своем YouTube-канале «Страна для жизни» объявил о намерении участвовать в предстоящих президентских выборах в качестве кандидата.

**8 мая** — Палата представителей Национального собрания Республики Беларусь назначила дату проведения президентских выборов — 9 августа 2020 года, таким образом дав старт избирательной кампании.

**8 мая** — экс-дипломат и основатель беларусского Парка высоких технологий Валерий Цепкало заявил о намерении баллотироваться на пост президента.

**12 мая** — банкир, председатель правления «Белгазпромбанка» Виктор Бабарико объявил о намерении идти в президенты.

**15-го**, **19-го** и **20-го мая** прошли заседания Центризбиркома по регистрации инициативных групп кандидатов, всего было зарегистрировано 15 инициативных групп (одному из популярных кандидатов, Сергею Тихановскому, отказали в регистрации его инициативной группы, после чего в срочном порядке документы на регистрацию подала его жена Светлана Тихановская).

**29 мая** — во время предвыборного пикета в Гродно задерживают Сергея Тихановского, лидера инициативной группы по выдвижению Светланы Тихановской в качестве кандидата в президенты. Вскоре ему предъявили обвинения по делу об организации действий, грубо нарушающих общественный порядок.

**11 июня** — в отношении ряда сотрудников «Белгазпромбанка» возбуждено уголовное дело за уклонение от уплаты налогов. В банке прошло несколько обысков, также были задержаны 15 бывших коллег Виктора Бабарико, который к тому времени уже не являлся главой банка.

**18 июня** — сотрудники Следственного комитета задержали Виктора Бабарико и его сына Эдуарда, который являлся руководителем предвыборного штаба отца. Вечером этого же дня в Минске выстроилась цепь из людей в знак солидарности с задержанными.

**14 июля** — ЦИК утвердил окончательный список из пяти кандидатов на пост президента страны. Кроме Александр Лукашенко, в него были включены: Андрей Дмитриев, Анна Канопацкая, Сергей Черечень, а также Светлана Тихановская. Не получили регистрации основные претенденты Валерий Цепкало (собрал во время кампании около 160 тыс. подписей в свою поддержку при требуемой

планке в 100 тыс.) и Виктор Бабарико (собрал около 435 тыс. подписей). Это вызвало протесты по всей Беларуси, за участие в которых было задержано 250 человек.

**16 июля** — предвыборные штабы непрошедших регистрацию претендентов в кандидаты на пост президента Виктора Бабарико и Валерия Цепкало, а также штаб Светланы Тихановской заявили об объединении. Лицами объединенного штаба становится т.н. «женская коалиция», состоящая из представительницы штаба Бабарико Марии Колесниковой, представительницы штаба Цепкало, его супруги Вероники Цепкало, а также кандидата в президенты Светланы Тихановской. В качестве цели объединения заявлена необходимость гражданского контроля над ходом голосования и проведение повторных выборов в случае победы Светланы Тихановской.

**С 19 июля по 8 августа** прошло несколько достаточно массовых митингов в поддержку Светланы Тихановской и «женского триумвирата», при том что разрешенные законом встречи и митинги часто провести было невозможно из-за чинимых властями препятствований. Самый многочисленный митинг состоялся 30 июля в Минске. По данным правозащитного центра «Весна», через пункты пропуска на митинг прошло более 60 тыс. человек. При этом официально озвученная цифра значительно скромнее — порядка 18 тыс. человек.

**9 августа** — день выборов. Сторонники Светланы Тихановской собирались возле своих избирательных участков в ожидании итоговых протоколов голосования. Вечером официальные источники объявили о том, что за Александра Лукашенко отдано около 80% голосов. На улицах многих городов прошли массовые акции протеста. В Минске основной точкой протестного сбора стал район около стелы «Минск — город-герой». В этом месте произошли столкновения протестующих с силами правопорядка. Против митингующих применялись свето-шумовые гранаты, резиновые пули и некоторые другие специальные средства, в результате чего многие протестующие получали травмы различной степени тяжести. Также сообщалось о нескольких тысячах задержанных в ночь с 9-го на 10-е августа.

**10 августа** — ЦИК объявил официальные предварительные результаты выборов, согласно которым Александр Лукашенко одержал победу с результатом 80,23% голосов. Вечером протесты несогласных с результатами выборов продолжились. Они привели к новым столкновениям с сотрудниками милиции, ОМОНа и военнослужащими внутренних войск. Поздним вечером в районе станции метро «Пушкинская» г. Минска из-за открытой раны грудной клетки, полученной в результате стрельбы сотрудниками силовых структур из травматического оружия по протестующим, скончался Александр Тарайковский. Гибель Тарайковского стала первым случаем подтвержденной властями смерти

участника протестов. Впоследствии цифра жертв полицейского насилия со смертельным исходом достигнет, по некоторым данным, 8 человек.

**11 августа** — Светлана Тихановская в своем видеообращении сообщила, что покинула Беларусь. Накануне она направилось в ЦИК для подачи жалобы на результаты выборов, после чего перестала выходить на связь. В больших и малых городах продолжились протесты. В этот же день появились сообщения о первых случаях объявления забастовок на промышленных предприятиях.

**14 августа** — Светлана Тихановская объявила о создании Координационного совета «для обеспечения трансфера власти». Задержанных в Минске протестующих начинают массово отпускать из ИВС, расположенном на 1-м перул. Окрестина. Возле стен ИВС образуется волонтерский лагерь помощи и поддержки задержанным и освобожденным. Становятся известны многочисленные факты избиений и пыток людей, задержанных во время протестов.

**16 августа** — в Минске прошел первый крупномасштабный «воскресный марш» — «Марш за свободу», собравший несколько сотен тысяч человек (по разным оценкам, от 400 тыс. до 500 тыс.). Многочисленные акции протеста прошли также в Барановичах, Белоозерске, Бобруйске, Борисове, Бресте, Витебске, Волковыске, Гомеле, Гродно, Дрогичине, Жабинке, Жодино, Заславле, Клецке, Костюковичах, Кричеве, Лиде, Логойске, Марьиной Горке, Могилеве, Мозыре, Мостах, Новополоцке, Пинске, Полоцке, Пружанах, Речице, Смолевичах, Сморгони и других населенных пунктах страны.

**17 августа** — появилось множество сообщений о начавшихся по всей стране забастовках. В списке бастующих предприятий такие промышленные гиганты, как БелАЗ, Минский тракторный завод, «Беларуськалий», Минский завод колесных тягачей (МЗКТ) и др. Также о начале забастовки объявили 600 сотрудников Белтелерадиокомпании — крупнейшего государственного учреждения вещательных СМИ.

**23 августа** — в Минске состоялась очередная массовая акция протеста — «Марш новой Беларуси», второй по счету воскресный марш. Цифра участников составила, по разным оценкам, от 300 тыс. до 500 тысяч. В тот же день массовые акции протеста прошли во многих других городах Беларуси.

**29 августа** — в Минске проходит «Женский марш», собравший порядка 10 тыс. участниц и участников. «Субботние» марши женщин станут на некоторые время, наряду с воскресными акциями, регулярными событиями в беларусском протестном календаре.

**30 августа** — в очередное воскресенье в Минске и других городах проходит массовая акция протеста, получившее название «Марш мира и независимости». В столице участие в нем приняло несколько сотен тысяч демонстрантов.

**31 августа** — в страну не пустили возвращавшегося из рабочей поездки главу католической церкви Беларуси, архиепископа Минско-Могилевского Тадеуша Кондрусевича, публично осудившего насилие властей против протестующих.

**1 сентября** — с началом учебного года протест охватил и учебные заведения. Родители учащихся школ призывали к ответу директоров и учителей, которые входили в состав местных избирательных комиссий. Во многих высших учебных заведениях студенты и ряд преподавателей объявили забастовку. В Минске прошло несколько студенческих маршей и акций протеста, которые были разогнаны при помощи ОМОНа.

**6 сентября** — в Минске состоялась очередная воскресная акция протеста — «Марш единства». Количество участников протестных акций в Минске сохраняется примерно на прежнем высоком уровне.

**7 сентября** — в Минске неизвестные задерживают представительницу штаба Бабарико, члена Координационного совета Марию Колесникову. Позже официальные власти распространят информацию, что задержание Марии произошло на беларусско-украинской границе при ее попытке бегства из страны. Как выяснилось позже, Марию Колесникову вместе с двумя ее коллегами пытались насильно выдворить из страны, однако Колесникова воспрепятствовала этим планам властей, порвав на границе свой паспорт.

**13 сентября** — в это воскресенье в Минске и других городах прошли ставшие уже традиционными массовые акции протеста. В Минске собирается «Марш героев».

**20 сентября** — очередная воскресная акция протеста — «Марш справедливости» — прошла по всей Беларуси.

**23 сентября** — Александр Лукашенко проводит инаугурацию. Заранее это событие не объявлялось, сообщения о нем появились только в день проведения. Вечером того же дня в ответ на «тайную инаугурацию» в стране прошли спонтанные акции протеста.

**27 сентября** — в столице и других городах страны вновь прошли воскресные акции протеста — «Народная инаугурация настоящего президента», или «Марш 97%». Несмотря на неблагоприятные погодные условия, в Минске, по разным подсчетам, в акции приняло участие от нескольких десятков тысяч до сотни тысяч человек.

**4 октября** — в первое воскресенье месяца состоялась очередная акция протеста под названием «Марш освобождения политзаключенных». В этот день в Минске часть митингующих направилось к ИВС на Окрестина, который после жестких разгонов 9-11 августа стал местом, символизирующим эти трагические события.

Беспрэцэдэнтныя рэпрэсіі з боку дзейных уладаў вымушалі людзей пакідаць Беларусь ад самага пачатку палітычнага крызісу. Шмат людзей з'язджалі з краіны з-за пагрозы пераследу і арышту, пачынаючы з лета 2020 года, у 2021 годзе да іх дадаліся тыя, хто трапіў пад працэс масавых звальненняў і адлічэнняў з універсітэтаў па палітычных матавах, ліквідацыі НДА і незалежных медыяў. Хоць дакладна падлічыць, колькі беларусаў праз рэпрэсіі выехала за мяжу, у наяўных умовах немагчыма, тыя ці іншыя крыніцы інфармацыі сведчаць пра лічбу ад некалькіх дзясяткаў да некалькіх сотняў тысяч чалавек. Найчасцей беларусы з'язджалі ў Польшчу, Літву, Украіну, Грузію, Латвію, але таксама і іншыя краіны Еўропы і свету. Значная частка гэтых людзей лічыць сябе не эмігрантамі, а рэлакантамі, ці нават уцекачамі, і спадзяецца ў каротка- ці сярэднетэрміновай перспектыве вярнуцца ў Беларусь пры змене ўмоў. Гэтыя людзі часта актыўна ўключаюцца ў дыяспаральныя ініцыятывы альбо ініцыююць свае.

Асобна трэба сказаць, што менавіта ў эміграцыі дзейнічаюць структуры палітычных лідараў беларускага грамадства: штаб Святланы Ціханоўскай, Каардынацыйная рада, Народнае антыкрызіснае ўпраўленне. Іх дзейнасць ахоплівае вялікі спектр кірункаў і задач[4]. Шэраг праектаў і ініцыятыў прадугледжвае шчыльную

[4] Дзейнасць штаба Святланы Ціханоўскай мае асноўнай мэтай правесці новыя, дэмакратычныя выбары прэзідэнта Рэспублікі Беларусь; яна накіравана на прадстаўленне інтарэсаў беларускага грамадства, якое выступае за дэмакратычныя змены, на міжнароднай арэне, стварэнне палітычнага і эканамічнага (санкцыйнага) ціску на дзейныя ўлады ў Беларусі, падтрымку стачачнага руху, дапамогу пацярпелым ад палітычных рэпрэсій і інш. Гл. сайт Святланы Ціханоўскай [доступ: 28.04.2022]: https://tsikhanouskaya.org/be.

Каардынацыйная рада як адзіны прадстаўнічы орган беларускага грамадства была створана ў жніўні 2020 года з мэтай арганізацыі працэсу перадачы ўлады і забеспячэння згоды ў грамадстве, а таксама для абароны суверэнітэту і незалежнасці Беларусі. Гл. сайт Каардынацыйнай рады [доступ: 28.04.2022]: https://rada.vision/by.

Задачы Народнага антыкрызіснага ўпраўлення (НАУ) галоўным чынам звязаны з ліквідацыяй прычын палітычнага крызісу ў Беларусі (у тым ліку ўключаюць працу па непрызнанню дзейнай улады на міжнародным узроўні, прыцягненню злачынцаў да адказнасці ў рамках універсальнай юрысдыкцыі, падрыхтоўку міжнароднага трыбунала, эканамічны ціск на дзейныя ўлады, падтрымку і мабілізацыю беларусаў, якія выступаюць за дэмакратычныя

супрацу з беларускай дыяспарай і ніцыятывамі, арганізаванымі беларусамі, якія вымушана з'ехалі з краіны ў 2020-2021 гадах.

Зрабіць поўнае апісанне дзейнасці беларусаў замежжа пасля жніўня 2020 года ў межах гэтага арыкула немагчыма з прычыны яе маштабнасці і разнастайнасці. Мы паспрабуем даць хіба невялічкі абзор паводле тыпаў і характару асноўных напрамкаў гэтай дзейнасці.

## Фінансавая дапамога пацярпелым ад рэпрэсій

Беларусы замежжа актыўна ажыцяўлялі грашовую дапамогу пацярпелым беларусам праз ужо дзейныя і наноў створаныя фонды: фонд BYSOL, ініцыятыву BY_help[5], платформу «ИМЕНА»[6] ды інш.

Фонд BYSOL — адна з найбольш вядомых і буйных ініцыятыў па зборы сродкаў пацярпелым ад рэпрэсій у выніку паслявыбарчых падзей у Беларусі. Ён быў створаны ў жніўні 2020 года ў Кіеве, куды незадоўга да гэтага праз палітычны ціск з'ехалі яго заснавальнікі — праваабаронца і актывіст Андрэй Стрыжак і Яраслаў Ліхачэўскі. Фонд засяроджваўся на фінансавай дапамозе людзям, якія страцілі працу па палітычных прычынах, а таксама якія былі вымушаны з'ехаць з Беларусі.

Таксама былі запушчаны асобныя фонды, партнёры BYSOL, для пэўных мэтавых груп: журналістаў і медыяў (Media Solidarity), медыцынскіх супрацоўнікаў (Фонд медыцынскай салідарнасці), спартоўцаў (Фонд спартовай салідарнасці) і шмат іншых меньш масштабных ініцыятыў.

Часам дыяспары наладжвалі персанальныя кантакты і знаёміліся асабіста з тым ці іншым чалавекам, пацярпелай сям'ёй альбо супольнасцю ці ініцыятывай і аказвалі ім фінансавую падтрымку наўпрост.

Фінансавая дапамога ішла на адвакацкія паслугі, аплату штрафаў, медычнае лячэнне, аперацыі, рэабілітацыю, а таксама псіхалагічную дапамогу пацярпелым, забеспячэнне рэлакацыі з Беларусі, жытло, харчаванне і іншыя пабытовыя патрэбы для ўцекачоў, падтрымку сем'яў, якія праз палітычныя рэпрэсіі апынуліся без крыніцы даходу, ды інш.

---

змены), а таксама падрыхтоўкай інстытутаў улады да пераходнага перыяду. Гл. сайт Народнага антыкрызіснага ўпраўлення [доступ: 28.04.2022]: https://belarus-nau.org.

[5] Ініцыятыва BY_help была створана ў Беларусі ў 2017 годзе для дапамогі пацярпелым ад рэпрэсій удзельнікам пратэстаў супраць т.зв. «дэкрэта аб дармаедах». У 2020-2021 гадах ініцыятыва дапамагала пацярпелым у выніку паслявыбарчых пратэстаў у Беларусі.

[6] Центр медпомощи для пострадавших во время мирных демонстраций // «ИМЕНА» [доступ: 25.04.2022]: https://imenamag.by/projects/help-for-injured.

## Дапамога страйкоўцам

Пасля абвяшчэння Святланай Ціханоўскай агульнанацыянальнага страйку ў кастрычніку 2020 года беларускія дыяспары сталі актыўна дапамагаць працоўным, якія да яго далучаліся. Так, беларусы Германіі запусцілі акцыю #YouStrike WeWork, у межах якой пералічвалі дзённы заробак на дапамогу страйкоўцам. Неўзабаве да акцыі далучыліся беларускія дыяспары іншых краін. Паведамлялася, што толькі праз фонд BYSOL акцыя #YouStrikeWeWork за некалькі дзён сабрала каля паўмільёна еўра[7].

Ёсць прыклады, калі буйныя і фінансава забяспечаныя дыяспары браліся апекавацца працоўнымі канкрэтнага прадпрыемства. Напрыклад, беларусы Сіэтла дапамагалі страйкоўцам нафтаперапрацоўчага завода «Нафтан», а дыяспара Нью-Ёрка — найбуйнейшаму ў краіне стачкаму ААТ «Беларуськалій».

## Дапамога палітвязням

Дапамога палітвязням і іх сем’ям ажыццяўлялася беларусамі замежжа найперш праз фонды і зборы грошай. Іншым важным кірункам быў шырокі распаўсюд інфармацыі праз акцыі, пікеты, выставы і публічныя мерапрыемствы, публікацыі ў сацыяльных сетках і на сайтах арганізацый дыяспар, інтэрв’ю і камунікацыю з мясцовымі СМІ і мясцовымі і міжнароднымі праваабарончымі арганізацыямі, у зваротах да мясцовых палітычных эліт. Беларусы замежжа (а часам і іншыя неабыякавыя грамадзяне замежных краін) актыўна далучаліся да ініцыятывы «Напішы ліст палітвязню».

## Дапамога ўцекачам

Кірункі дзейнасці многіх супольнасцяў і ініцыятыў былі звязаны з дапамогай уцекачам з Беларусі. Значнасць і актуальнасць гэтага тыпу дапамогі пашыралася з узмацненнем рэпрэсій у Беларусі і выездам усё большай колькасці людзей. Досыць часта людзі ўцякалі непадрыхтаваныя ў фінансавым, інфармацыйным, маральным плане.

У гэтым ключы беларускія дыяспары арганізоўвалі для ўцекачоў часовае жытло[8], харчаванне і адзежу, псіхалагічную дапамогу, юрыдычныя кансультацыі

---

[7] «Вы бастуете, мы отработаем». Как белорусы зарубежья помогают бастующим // DW [доступ: 25.04.2022]: https://www.dw.com/ru/vy-bastuete-my-otrabotaem-kak-belorusy-zarubezhja-pomogajut-bastujushhim/a-55432365.

[8] Адзін з прыкладаў — часовы прытулак для беларускіх уцекачоў у Беластоку, арганізаваны на сродкі беларускай дыяспары Канады і ЗША і Фонда Святланы Ціханоўскай.

датычна пытанняў легалізацыі ў краіне знаходжання, дапамогу ў атрыманні фінансавай падтрымкі ад тых ці іншых фондаў салідарнасці, падтрымку ў пошуку працы і жытла, у атрыманні адукацыі, мерапрыемствы па сацыялізацыі, культурніцкія падзеі ды інш.

У дапамогу ўключаліся як арганізацыі, што ўжо існавалі (напрыклад, «Беларускі дом у Варшаве»), так і вялікая колькасць ініцыятыў і фондаў, паўсталых менавіта пасля падзей жніўня 2020 года: «Цэнтр беларускай салідарнасці», Фонд «Беларусы ў Лодзі», «Суполка беларусаў Уроцлава» — у Польшчы; Free Belarus Center, Антыкрызісны цэнтар «Беларускі дом», «Родны кут», «Беларускі крызісны цэнтр у Львове» — ва Украіне, ды інш. Беларускія дыяспары Канады, ЗША, Германіі і іншыя актыўна фінансава падтрымлівалі функцыянаванне цэнтраў дапамогі беларусам у тых краінах, куды яны найбольш з’язджалі.

Палітычныя рэпрэсіі вымушалі пакідаць краіну не толькі асобных беларусаў, але і цэлыя арганізацыі грамадзянскай супольнасці, рэдакцыі незалежных СМІ, бізнес. Для паспяховай рэлакацыі апошняга была створаная «Асацыяцыя беларускага бізнесу за мяжой» (ABBA). Тут жа можна ўзгадаць праект By_Mapka ад «Цэнтра беларускай салідарнасці» (інтэрактыўную мапу беларускага бізнесу за межамі Беларусі, створаную дзеля яго падтрымкі) і ініцыятыву дапамогі рэпрэсаванаму бізнесу «За Дело». Таксама ствараліся розныя прасторы і хабы: для беларускіх журналістаў (напрыклад, медыяхабы ў Беластоку і Варшаве), для актывістаў і грамадскіх арганізацый (варшаўскі «Беларускі Моладзевы Хаб», які таксама дапамагае беларускім студэнтам). Варта сказаць пра вядомы хаб Imaguru, які пасля вымушанага закрыцця і рэлакацыі працягнуў падтрымліваць беларускія стартапы і запусціў праэкт «Хабы салідарнасці»[9].

Тут важна ўзгадаць дзейнасць «Дома правоў чалавека імя Барыса Звозскага» ў Вільні, які стаў неад’емнай інфраструктурнай часткай праваабарончай працы ў гэты крызісны перыяд, выконваючы шэраг важных функцый як у рэчышчы падтрымкі і дапамогі розным групам пацярпелых ад рэпрэсій, так і ў кірунку маніторынгу і адвакацыі правоў чалавека.

## Прасоўванне беларускай павесткі

Беларускія дыяспары адной са сваіх важных задач бачылі ўплыў на грамадскае меркаванне, палітычныя эліты сваёй краіны, а таксама міжнародныя інстытуцыі, прыцягненне ўвагі да палітычнага крызісу ў Беларусі. Яны наладжвалі камунікацыю з мясцовымі СМІ, выбудоўвалі ў тым ліку персанальныя кантакты, прапаноўвалі свае матэрыялы, прэс-рэлізы, даводзілі інфармацыю праз пікеты і акцыі, а таксама культурніцкія падзеі.

[9] Imaguru: Резиденция Солидарности [доступ: 28.04.2022]: https://imaguru.lt/solidarity-hub.

Варта адзначыць прыклад суполкі «Беларусы Швецыі», якая ў жніўні 2020 года з мэтай распаўсюджвання карэктнай інфармацыі пра сітуацыю ў Беларусі арганізавала адмысловыя працоўныя групы, што мусілі ствараць тэматычныя матэрыялы, наладжваць камунікацыю з палітыкамі, грамадскімі арганізацыямі і шведскімі СМІ, а таксама выяўляць фактычныя памылкі ў матэрыялах апошніх пры асвятленні падзей у Беларусі ды пісаць з гэтай нагоды афіцыйныя звароты[10].

Беларусы замежжа адгукаліся і падхоплівалі акцыі, якія прапаноўвалі апазіцыйныя палітычныя лідары. Узгадаем Міжнародны дзень салідарнасці з Беларуссю, ініцыяваны Святланай Ціханоўскай, які прайшоў 7 лютага 2021 года і да якога ў тым ліку далучаліся кіраўнікі і чыноўнікі замежных дзяржаў, а таксама «Тыдзень беларускай культуры» 5-11 ліпеня 2021 года. Гэтыя ды іншыя падзеі спрыялі згуртаванню беларусаў у свеце, іх салідарызацыі з суайчыннікамі на радзіме, пэўным чынам уплывалі і на медыяпавестку.

## Адвакацыя і лабіяванне

Беларуская дыяспара была адной з сіл, што разам з палітычнымі «штабамі» спрычынілася да прыняцця ў ЗША «Акту аб дэмакратыі, правах чалавека і суверэнітэце Беларусі»[11]. Многія, хто раней не цікавіўся палітычнымі дзеяннямі, пачалі праз петыцыі, звароты да кангрэсменаў лабіяваць пытанні дэмакратычных змен у Беларусі[12].

Намаганнямі дыяспары Канады была створана група сяброў Беларусі ў канадскім парламенце. У прыняцці краінай санкцый у дачыненні да рэжыму ў Беларусі дыяспара бачыць і сваю ролю. Таксама беларусы Канады дамагаюцца разгляду ўладамі магчымасці праграмы па прыняцці ўцекачоў з Беларусі[13].

Дзякуючы ініцыятыве беларускай дыяспары Чэхіі і яе супрацы з чэскім урадам[14], пацярпелым падчас пратэстаў беларусам аказвалася медычная дапамога ў межах урадавай чэшскай праграмы Medevac.

---

[10] Важна! Што мы робім як беларусы, якія жывуць за мяжой? // Група «Беларусы ў Швецыі / Belarusier i Sverige / Беларусы в Швеции» ў Фэйсбуку [доступ: 28.04.2022]: https://www.facebook.com/groups/sverigesbelarusier/posts/10157818473807730.

[11] Прыняты 21 снежня 2020 года Акт прызнае Каардынацыйную раду законным інстытутам для дыялогу аб мірнай перадачы ўлады і не прызнае дзейнага фактычнага кіраўніка Беларусі законна абраным.

[12] Нью-Ёрк падтрымлівае «Беларуськалій», а Сан-Францыска — Жабінку. Як беларусы Амэрыкі дапамагаюць землякам на радзіме // «Радыё Свабода» [доступ: 22.04.2022]: https://www.svaboda.org/a/31306440.html.

[13] Канада вядомая сваёй палітыкай прыняцця ўцекачоў з небяспечных краін і рэгіёнаў.

[14] Як эвакуавалі пакалечаных сілавікамі беларусаў. Крысьціна Шыянок — пра ўнікальную праграму дапамогі // «Радыё Свабода» [доступ: 22.04.2022]: https://www.svaboda.org/a/31614406.html.

Іміджавым ударам для дзейнай у Беларусі ўлады стала адмена правядзення ў Мінску чэмпіянату свету па хакеі ў 2021 годзе[15]. Беларусы замежжа таксама ўдзельнічалі ў гэтай кампаніі. Так, асацыяцыя беларусаў Швайцарыі RAZAM.CH пікетавала штаб-кватэру IIHF у Цюрыху. Беларусы Чэхіі і Германіі ладзілі пікеты каля офісаў сталых генеральных спонсараў чэмпіянату — кампаній Škoda і Nivea. Гэтыя брэнды (а таксама Tissot і Liqui Moly) у выніку адмовіліся спансаваць чэмпіянат у выпадку яго правядзення ў Беларусі, а праз пару дзён IIHF прыняў рашэнне адмяніць правядзенне ЧС-2021 у Беларусі.

Беларускія дыяспары таксама ўключаліся ў рух эканамічнага ціску на кампаніі, што працуюць з дзяржаўнымі прадпрыемствамі ў Беларусі. Прадстаўнікі дыяспары актыўна пісалі лісты ў кампаніі, ладзілі мітынгі каля крам і амбасад краін брэндаў[16].

Сярод ініцыятыў, што з'явіліся ў 2020 годзе, можна прыгадаць супольнасць «Беларусы замежжа» — аб'яднанне беларусаў, якія пастаянна ці часова жывуць за межамі Беларусі. Супольнасць кансалідуе працу беларускіх дыяспар свету, сярод яе заўважных праектаў — правядзенне «Сусветнага кангрэса беларусаў», які запачаткаваў стварэнне «народных амбасад Беларусі» (меркавалася, што яны стануць альтэрнатывай афіцыйным пасольствам, мэта якіх — інфармаваць грамадскасць пра сітуацыю ў Беларусі, дапамагаць уцекачам і рэлакантам, абараняць інтарэсы Беларусі ў міжнародных арганізацыях і палітычных органах краіны ды інш.).

Важна сказаць пра лабіяванне пытанняў, звязаных з беларускімі ўцекачамі і легалізацыяй іх знаходжання на тэрыторыі замежных краін. З павелічэннем колькасці беларусаў, што пакідалі радзіму праз рэпрэсіі, а таксама зацягваннем палітычнага крызісу гэтая праблема паўстала востра. Яе прасоўваннем найперш займаліся палітычныя апазіцыйныя лідары, але таксама і беларускія дыяспары. Тут можна прывесці прыклад ініцыятывы Free Belarus Center, у выніку якой тэрмін легальнага знаходжання беларусаў ва Украіне быў падоўжаны да 180 дзён на год[17].

---

[15] Чэмпіянат свету па хакеі з шайбай 2021 // Вікіпедыя [доступ: 26.04.2022]: https://be.wikipedia.org/wiki/Чэмпіянат_свету_па_хакеі_з_шайбай_2021.

[16] Напрыклад, шведская страхавая кампанія EKN у выніку адмовілася ад двух праектаў у Беларусі. У той жа час шматлікія акцыі і пікеты на адрас IKEA не дасягнулі поспеха — у 2021 годзе кампанія працягвала супрацоўніцтва з Беларуссю.

[17] Free Belarus Center приветствует решение Кабинета министров Украины об увеличении сроков легального пребывания беларусов в Украине до 180 дней в рамках одного года // Страница Free Belarus Center в Фейсбуке [доступ: 25.04.2022]: https://www.facebook.com/FreeBelarusCenter/posts/214418517062461.

## Удзел у акцыях, мітынгах, запіс зваротаў і відэа

Незлічоныя акцыі салідарнасці беларускіх дыяспар у дзясятках краін свету[18] сталіся моцнай падтрымкай для пратэставага грамадства ў Беларусі. Кажучы трохі паэтычна, 2020 год не толькі пазнаёміў беларусаў адно з адным, але і пазнаёміў свет з беларусамі.

Падчас акцый і мітынгаў беларусы замежжа знаёміліся і гуртаваліся, а пасля запускалі новыя ініцыятывы і арганізацыі.

Акцыі праходзілі пад агульнымі лозунгамі за дэмакратычныя змены ў Беларусі, за спыненне гвалту і вызваленне палітзняволеных, а таксама часта прысвячаліся пэўнай тэме: падтрымка агульнанацыянальнага страйку, ушанаванне Рамана Бандарэнкі, падтрымка лекара Арцёма Сарокіна, адзначэнне традыцыйных і нацыянальных святаў («Дзень Волі» 25 сакавіка, свята «Дзяды»), правядзенне дней памяці («Ноч растраляных паэтаў» 29 кастрычніка, угодкі Чарнобыльскай трагедыі 26 красавіка). Нагодамі для акцый салідарнасці таксама станавіліся навіны з Беларусі аб чарговых рэпрэсіях (акцыі ў падтрымку ліквідаваных недзяржаўных арганізацый і СМІ, рэпрэсаваных беларускіх журналістаў, палітвязняў, якім выносілі беспрэцэдэнтныя прысуды, і інш.). Такая рэакцыя дыяспар на актуальныя падзеі ў Беларусі дэманструе пэўную наладжаную камунікацыю і зноў сведчыць пра змены ў пазіцыі значнай часткі беларусаў замежжа: ад апалітычнасці і незацікаўленасці тым, як жыве Беларусь, да актыўнага адсочвання беларускай павесткі і ўдзелу ў агульным руху за дэмакратычныя змены ў краіне.

Асобна трэба сказаць пра досыць моцны беларускі культурніцкі рух за мяжой, які афарміўся ў выніку беларускіх падзей 2020-2021 гадоў. Палітычны ціск і рэпрэсіі масава закранулі беларускіх культурніцкіх дзеячаў і арганізацыі, значная іх частка была вымушана ў тым ліку пакінуць краіну. Многія не спынілі сваю дзейнасць, працягнулі яе за мяжой. Была разгорнута значная праца па дапамозе і падтрымцы беларускай культуры, яе захаванні і развіцці ва ўмовах палітычнага крызісу, а таксама прасоўванні ў свеце. За гэты час паўстаў цэлы шэраг яскравых і значных ініцыятыў, у тым ліку стаўшыя сімваламі пратэстовага руху «Вольны хор» і незалежная тэатральная група «Купалаўцы». Сярод найбольш бачных і дзейных цэнтраў варта назваць Беларускую Раду культуры (паўсталую з Фонда культурнай салідарнасці ў 2021 годзе)[19], Беларускі ПЭН[20], «Беларускі Моладзевы Хаб» у Варшаве.

[18] Канада, ЗША, Украіна, Польшча, Літва, Латвія, Вялікабрытанія, Чэхія, Германія, Швейцарыя, Францыя, Нідэрланды, Швецыя, Нарвегія, Ірландыя, Эстонія, Данія, Ізраіль, Італія, Грузія, Японія, Паўднёвая Карэя, Аўстралія, Турцыя, Кіпр і інш.

[19] Беларуская Рада культуры [доступ: 28.04.2022]: https://byculture.org.

[20] Беларускі ПЭН [доступ: 25.04.2022]: https://penbelarus.org.

## Працяг будзе

Уздым беларускага грамадства ў жніўні 2020 года з'яднаў і ўзмацніў беларускую дыяспару ў свеце. Многія супольнасці, арганізацыі і ініцыятывы беларусаў замежжа паўсталі менавіта ў выніку рэакцыі на падзеі ў іх роднай краіне. Людзі знаёміліся на акцыях і пікетах, гуртаваліся ў суполкі найперш для дапамогі суайчыннікам, кансалідаваліся, каб эфектыўна вырашаць пастаўленыя задачы.

З боку беларусаў замежжа гучаць ідэі аб стварэнні ў будучыні эфектыўнай глабальнай супольнасці беларускіх дыяспар. Вельмі хочацца спадзявацца на тое, што запалены ў 2020 годзе ў сусветным маштабе беларускі рух не сцішыцца і не затухне, але прывядзе да якасных змен і цікавых годных пераўтварэнняў на карысць Беларусі і свету.

# Мастацтва як адзін з матыватараў і рухавікоў пратэсту ў Беларусі ў 2020 годзе

Мірон Лідскі

Музыка, сімвалы і візуальныя мастацкія вобразы заўжды былі важнымі чыннікамі грамадска-палітычных падзей у Беларусі. Гэта добра заўважна па ўсіх палітычных падзеях апошніх дзесяцігоддзяў. Моцна адчувалася ў часе адзначэння БНР100 і БНР101, калі культурніцкі змест значна больш кансалідаваў і мабілізаваў людзей на ўдзел у мерапрыемствах, чым адкрыты палітычны пратэст. Але пікавая роля творчасці, крэатыву, мастацтва і розных арт-фарматаў выявілася ў падзеях 2020 года.

Паспрабуем прааналізаваць і сабраць самыя цікавыя і ўплывовыя творчыя з'явы ў беларускім пратэсце ад траўня і да канца 2020 года.

Першым, хто ў траўні пачаў актыўна выкарыстоўваць у сваёй палітычнай дзейнасці мастацкія формы, праводзячы пікеты па зборы подпісаў за Святлану Ціханоўскую, быў Сяргей Ціханоўскі.

Ціханоўскі да свайго арышту паспеў прыдумаць і раскруціць пазнавальны фірмовы стыль «Страна для жизни», слоган «Стоп таракан! No pasaran!»[1], візуальны вобраз тапка, які расплюшчвае прусака. Усе гэтыя формы вельмі хутка пайшлі ў народ, пачала з'яўляцца народная творчасць у выглядзе артаў, песень, перфомансаў.

25 траўня на стрыме ў Слуцку Сяргей Ціханоўскі расказаў, што на студыі запісаў у сваім выкананні песню «Муры» па-руску і па-беларуску, а таксама заклікаў, каб людзі вучылі яе словы і разам спявалі на беларускіх плошчах падчас выбарчых пікетаў, акцый салідарнасці і палітычных мітынгаў.

Дарэчы, упершыню праспяваў беларускую версію «Муроў» на марознай «Плошчы-2010» пісьменнік Андрэй Хадановіч[2]. Ён пераклаў з польскай мовы тэкст песні "Mury", якая была нефармальным гімнам польскай «Салідарнасці». Яе напісаў у 1978 годзе і выконваў польскі музыка Яцэк Качмарскі. У сваю чаргу,

[1] «No pasaran — стоп, таракан!!!» // YouTube: https://youtu.be/E6OsqgxQtqs.

[2] «Муры» ў выкананні Андрэя Хадановіча: https://youtu.be/Ul0xQDqmGzk і Змітра Вайцюшкевіча: https://youtu.be/fMKEITqEBJI.

Яцэка Качмарскага натхніла песня "L'estaca" каталонскага спевака Луіса Льякі, якую той напісаў у 1968 годзе. Яна была гімнам змагання з дыктатурай Франка ў Каталоніі.

Спачатку падчас акцый часцей гучала рускамоўная версія песні «Давай разрушим эту тюрьму» ў выкананні расійскага гурта «Аркадий Коц». Пастулова на першы план выходзіць менавіта беларускамоўны варыянт песні «Муры», і на мітынгах Святланы Ціханоўскай ужо загучала поўная версія гэтай песні па-беларуску, дзе апошнія куплеты ў перакладзе Андрэя Хадановіча былі перароблены і гаварылі ўжо пра канкрэтныя падзеі ў Беларусі.

Агульную колькасць мільёнаў праглядаў і праслухоўванняў гэтай песні немагчыма палічыць, бо толькі ў YouTube можна знайсці сотні варыянтаў відэа з вялізнай колькасцю праглядаў. Не знікла запатрабаванасць песні «Муры» і пасля выбараў. Пачалі з'яўляцца новыя версі ў цікавым гучанні і выкананні.

З'явай у беларускай культуры становіцца «Вольны хор», які выконвае «Муры» на вуліцах, у гандлёвых цэнтрах і на канцэртах[3]. Песня становіцца і часткай акцый салідарнасці з Беларуссю ў розных краінах свету. Запамінальнымі сталі выкананні «Муроў» на канцэрце ў Варшаве "Solidarni z Białorusią 2020"[4], 500 тысяч праглядаў набрала відэа «Палякі беларусам», дзе песню выконваюць Наста Някрасава і Яцэк Клейф. Ксенія Жук з гурта NaviBand і Ігар Гербут эмацыйна выканалі песню ў Варшаве з сімфанічным аркестрам і хорам Harmoń на канцэрце «Граем для Беларусі».

Можна падсумаваць, што песня «Муры» назаўжды застанецца адной з самых знакавых у гісторыі новай Беларусі, бо пад яе гучанне адбываліся самыя масавыя ў Беларусі мітынгі, пратэсты, акцыі салідарнасці, а таксама за яе выкананне ў публічных месцах людзей арыштоўвалі[5] і саджалі на суткі.

Але не толькі адна песня «Муры» гучала ў часе выбараў і пратэстаў у Беларусі. Падзеі 2020 года сталі каталізатарам узнікнення новых творчых з'яваў, як, напрыклад, «Вольны хор»[6], «Вольны аркестр», супольнасць бубначоў «Требуем разойтись!»[7], аб'яднанне звольненых артыстаў і супрацоўнікаў тэатра імя Янкі Купалы «Свабодныя купалаўцы»[8], крыніцай натхнення для музыкаў і гуртоў у абсалютна розных жанрах, а таксама часам пераасэнсавання музычнай

[3] «Муры» в исполнении «Вольнага хора» на концерте 12 декабря // YouTube: https://youtu.be/Q1V3b1xqaQQ.
[4] Solidarni z Białorusią: Organek — Mury // YouTube: https://youtu.be/SzcjIkOUljo.
[5] Затрымалі музыкаў, якія йгралі ў пераходзе «Разбуры турмы муры» // YouTube: https://youtu.be/1_IfzQuo0l4.
[6] Акаўнт «Вольны хор» у Інстаграме: https://www.instagram.com/volnychoir/.
[7] Акаўнт «Требуем разойтись!» у Інстаграме: https://www.instagram.com/platform.by/.
[8] Акаўнт «Свабодныя купалаўцы» ў Інстаграме: https://www.instagram.com/kupalaucy/.

спадчыны і традыцый беларускай культуры ды гісторыі ў новых творчых праектах.

Самы поўны плэй-ліст з беларускімі песнямі пратэсту, якія з'явіліся ў 2020-2021 гадах, сабраў журналіст «Радыё Свабода» Аляксандр Арсёнаў. У траўні 2021 года плэй-ліст[9] налічваў ужо 600 песень і кліпаў ад сотняў маладых і вядомых выканаўцаў ды калектываў пераважна з Беларусі.

У інтэрв'ю парталу Onliner уплывовы расійскі музычны крытык і журналіст Арцемій Троіцкі пасля праслухоўвання кампазіцый з гэтай падборкі казаў:

«Это не то что продуктивно, это гиперпродуктивно. Это просто фе-но-ме-наль-но! Я с таким не сталкивался никогда в жизни. У меня есть цикл лекций «Сто лет музыкальной цензуры в России», для которого я составлял плей-лист от Вертинского до Noize MC и «Порнофильмов». И полноценных песен протеста за сто лет набралось порядка 60 штук, а в Беларуси за несколько месяцев их более 200. Я даже не знаю: наверное, такого вообще не было в мировой песенной истории. Популярный сейчас в Беларуси лозунг "Вы невероятные" в данном случае соответствует на сто процентов. Такой взрыв талантливой, страстной, протестной музыки за такой короткий промежуток времени... Думаю, это мировой рекорд. На меня это произвело удивительное впечатление!»[10].

Яшчэ адна цікавая тэндэнцыя — гэта з'яўленне не толькі асобных творчых праектаў, калабарацый ці канкрэтных прадуктаў, а цэлых аб'яднанняў, асацыяцый і культурных фондаў.

Першае такое аб'яднанне #культпротест аб'явіла аб сабе 1 ліпеня 2020 года заявай:

«Мы, работники сферы культуры, объявляем #культпротест. Мы протестуем против того, что на улицах наших городов неизвестные похищают и избивают наших сограждан при бездействии или даже содействии органов, которые призваны нас защищать. Мы протестуем против арестов кандидатов в президенты по смехотворным предлогам. Наш #культпротест против тотального беззакония, когда к арестованным не пускают даже адвокатов и применяют пытки»[11].

---

[9] 600+ песень! Пратэстная музыка Беларусі 2020-2021 (Белорусская протестная музыка / Belarusian protest music 2020-2021) // YouTube: https://youtube.com/playlist?list=PLJ88h9ZcroOjLicn9Ipm4yRaVxuoif4Wk.

[10] «Такого не было в мировой истории, я поражен!» Артемий Троицкий про протестную музыку в Беларуси // Onliner: https://people.onliner.by/2020/11/01/artemij-troickij.

[11] Культурные работники и представители художественного сообщества заявили о неприятии текущей политической ситуации и предложили всем неравнодушным создавать протестное искусство // Министерство Контркультуры: https://moc.media/ru/3086.

У сваім звароце аўтары ініцыятывы абвесцілі, што пад хэштэгам #культпротест яны будуць рабіць і публікаваць тое, што ўмеюць лепш за ўсё — ствараць мастацтва.

У ліпені 2020 года беларускія акцёры, музыканты, рэжысёры запісвалі калектыўныя відэазвароты, галоўнае патрабаванне якіх было — выпусціць палітычных зняволеных[12].

Адным з самых моцных твораў #культпротест стала песня «Вам» ад гуртоў Naka[13], Dzieciuki, «Петля пристрастия», «РСП» і Rostany на верш Уладзімера Някляева, якая стала рэакцыяй на палітычныя падзеі ў Беларусі яшчэ ў ліпені 2020 года. Агулам ролік да песні на розных платформах сабраў некалькі мільёнаў праглядаў.

Вось што пісаў у верасні 2020 года пра #культпротест пісьменнік Андрэй Хадановіч у артыкуле для Culture.pl:

«Беларусские деятели искусства до недавнего времени не были склонны к открытому диссиденству. Теперь же, после зверских репрессий против мирных жителей в первые дни после выборов — чаша терпения переполнилась. Стало понятно, что беларусская культура уже не будет прежней. Официальные лауреаты начали массово отказываться от наград, званий, дипломов, стипендий. Часть журналистов беларусского телевидения и других государственных СМИ уволилась с работы. Стоит, например, вспомнить сотрудников Дома радио, которые начали забастовку против лжи и насилия»[14].

Адным з цэнтральных аб'яднанняў, якое ўзяло на сябе каардынацыю падтрымкі рэпрэсаваных дзеячаў культуры і стварэнне новых культурных прадуктаў пасля падзей у жніўні 2020 года, стаў Беларускі фонд культурнай салідарнасці[15].

Фонд пачаў сваю працу ў кастрычніку 2020 года з публікацыі адкрытага ліста дзеячаў культуры і мастацтва Рэспублікі Беларусь супраць гвалту і фальсіфікацый. Больш за 1500 музыкаў, мастакоў, актораў, выкладчыкаў, рэжысёраў, літаратараў ды іншых дзеячаў і актывістаў — як з «афіцыйных», так і з «неафіцыйных» культурных колаў — падпісалі адкрыты ліст з патрабаваннямі перагледзець вынікі прэзідэнцкіх выбараў, спыніць гвалт, адмяніць «чорныя спісы» і не чыніць ціск на майстроў культуры, не згодных з палітыкай беларускіх уладаў[16].

Яшчэ адным моцным фактарам, які ўплываў на пратэсты, кансалідаваў іх, натхняў людзей і дазваляў рабіць яго бачным, сталі розныя візуальныя формы.

---

[12] Першы відэазварот: https://youtu.be/4YpmlgMaaNU; другі відэазварот: https://youtu.be/ifOlLRsr39Q.

[13] Беларускія гурты запісалі песьню-пратэст // YouTube: https://youtu.be/7ZU8XSCulsM.

[14] Беларусь: #культпротест // Culture.pl: https://culture.pl/ru/article/belarus-kultprotest.

[15] Сайт «Беларускай рады культуры»: https://byculture.org.

[16] Адкрыты ліст дзеячаў культуры і мастацтва Рэспублікі Беларусь // Tuzinfm.by: https://tuzinfm.by/list/.

Першымі былі арты, звязаныя са слоганамі «Страна для жизни», «Стоп таракан! No pasaran!» і класічным «Жыве Беларусь». Са з’яўленнем мемаў пра 3%, 97% і «Псіхоз» гэтыя тэмы атрымалі шырокі распаўсюд праз плакаты, стрыт-арты, тэлеграм-стыкеры, дызайны і выпуск сувенірнай ды промапрадукцыі.













Адным з галоўных сімвалаў падзей лета 2020 года сталі аб’яднаныя разам тры эмадзі ❤ ✊ ✌ (сэрца, кулак, вікторыя), якія расшыфроўваліся слоганам «Верам! Можам! Пераможам!» ці «Любім! Можам! Пераможам!».

Гэты сімвал з’явіўся выпадкова пасля знакамітага сумеснага здымка Марыі Калеснікавай, Святланы Ціханоўскай і Веранікі Цапкала ў часе абвяшчэння пра аб’яднанне трох штабоў Віктара Бабарыкі, Валерыя Цапкалы, Святланы Ціханоўскай вакол адной праграмы і аднаго кандыдата — Святланы Ціханоўскай.



Адразу пасля сумеснай заявы фота трох жанчын становіцца вірусным і нараджае шматлікія народныя крэатывы. Адзін з іх аўтарства Антаніны Слабодчыкавай становіцца цэнтральным сімвалам усёй далейшай палітычнай кампаніі.



Важным складнікам агітацыйнай кампаніі аб'яднага штаба ў ліпені-жніўні 2020 года была музыка. Так, папулярныя беларускія выканаўцы выступалі на мітынгах у раённых і абласных гарадах, а таксама на вялікіх мітынгах у Мінску.

Апошні мітынг у Мінску перад выбарамі 6 жніўня наогул павінен быў стаць самым масавым у гісторыі Беларусі і сабраць на адной сцэне самыя папулярныя гурты Беларусі: Volski, «Крама», J:Mors, Nizkiz, Tor Band, але па надуманых прычынах быў сарваны ўладамі.

Між тым, 6 жніўня адбылася іншая падзея, якая зрабіла яшчэ адну легендарную песню гімнам беларускага пратэсту — гэта песня «Перамен» гурта «Кіно».







У Парку Дружбы народаў 6 жніўня (дзе папярэдне планавалася правесці апошні перадвыбарчы мітынг) вайскоўцы з тэхнікай і Аляксандрам Саладухай святкавалі Дзень чыгуначных войскаў, таму Святлана Ціханоўская, Вераніка Цапкала і Марыя Калеснікава прапанавалі наведаць Кіеўскі сквер, дзе праходзіла сямейнае свята «Калейдаскоп творчасці».

Кіеўскі сквер — гэта адна з шасці пляцовак, дзе ў Мінску было дазволена правядзенне мітынгаў кандыдатаў у прэзідэнты, але ў апошні тыдзень выбарчай кампаніі, яны ўсе нечакана сталі занятыя пад гарадскія мерапрыемствы.

Уладзіслаў Сакалоўскі і Кірыл Галанаў, якія былі гукачамі на афіцыйным мерапрыемстве ў Кіеўскім скверы, спынілі выступ Віталя Варанко, выканаўца песні «Бацька», уключылі песню «Перамен» гурта «Кіно» і паднялі рукі ўгору з сімвалам « вікторыя».

Пасля гэтага ўчынку хлопцаў затрымалі, арыштавалі і адправілі «на суткі», а пасля вызваленьня яны з’ехалі ў Літву, бо асцерагаліся новых арыштаў.









Учынак Уладзіслава і Кірыла натхніў мастакоў і дызайнераў на стварэнне разнастайных артаў. Адзін з іх аўтарства Дзмітрыя Дзмітрыева стаў цэнтральным стрыт-артам на «Плошчы Перамен» — такую назву далі свайму двару жыхары дамоў, размешчаных на скрыжаванні вуліц Чарвякова, Кахоўскай і Сморгаўскага тракта ў Мінску[17].

Далейшыя трагічныя падзеі, якія адбыліся на «Плошчы Перамен», былі звязаны з мастаком Раманам Бандарэнкам, які жыў на вуліцы Чарвякова, вучыў дзяцей маляваць.

11 лістапада 2020 года Раман Бандарэнка пабачыў у чаце, што невядомыя асобы чарговы раз зрываюць бел-чырвона-белыя стужкі на «Плошчы Перамен», выйшаў, быў моцна пабіты і памёр на наступны дзень. Як распавядалі яго суседзі, Раман быў менавіта тым чалавекам, які намаляваў мурал з дыджэямі на трансфарматарнай будцы ў іх двары. Гэты мурал камунальнікі дзясяткі разоў замалёўвалі рознымі спосабамі, а жыхары аднаўлялі.

Смерць Рамана стала нагодаю не толькі для новай хвалі пратэсту, але і хвалі новай творчасці. Мастачка Ганна Радзько намалявала плакат з Раманам, які абляцеў увесь свет, а беларускія і замежныя музыкі, напрыклад, Pomidor/OFF і «Танцы Минус», запісалі песні пра апошняе паведамленне Бандарэнкі ў дваровым чаце «Я выходжу»[18].

[17] Плошча Перамен // Wikipedia: https://be.wikipedia.org/wiki/Плошча_Перамен.
[18] Танцы Минус «За шагом шаг» // YouTube: https://youtu.be/EpDoGPBxhjo.




Пасля гэтых падзей песня «Перамен» загучала і па-беларуску ў межах праекта «Спяваем годна», пад гуслі ў выкананні Алеся Чумакова[19] і проста пад гітару ў выкананні Кацярыны Карпіцкай[20] у перакладзе Анатоля Івашчанкі.

Моцным мастацкім зместам была напоўнена серыя акцый, якія атрымалі назву «Жанчыны ў белым». Першая такая акцыя адбылася 12 жніўня 2020 года ў Мінску. Каля Камароўскага рынку жанчыны выйшлі ў белых вопратках з кветкамі, такім чынам прысутныя выказвалі свой пратэст супраць дзеянняў сілавікоў і салідарнасць з дэманстрантамі, многія з якіх пацярпелі падчас пратэстаў. Яны сталі ў ланцуг уздоўж вуліцы Веры Харужай і прасілі больш не біць людзей.

[19] Толькі зьмен / Перемен (Цой пад гуслі па-беларуску) // YouTube: https://youtu.be/RQz7pYc8_mA.

[20] Перамен — cover на Перемен Цоя па-беларуску // YouTube: https://youtu.be/-Nd_yNiCC9Y.




А народным жаночым сімвалам беларускага пратэсту стала Ніна Багінская, жанчына з бел-чырвона-белым сцягам, якая смела і рашуча ўдзельнічала ва ўсіх акцыях у Мінску[21]. Відэа, дзе яна аднаму з амапаўцаў сказала «Я гуляю»[22], каб ён яе прапусціў і не чапаў, стала вірусным, а гэтыя словы нарадзілі вялікую колькасць крэатываў, пайшлі ў народ і сталі выпускацца ў выглядзе рознай дызайнерскай, сувенірнай і промапрадукцыі.




[21] Нина Багинская «Я гуляю!» и БЧБ (бело-красно-белый) флаг. Символы революции в Беларуси / Максим Кац // YouTube: https://youtu.be/gSJPuYbE4-c.
[22] «Я гуляю» сказала Нина Багинская // YouTube: https://youtu.be/be9-CkQ2zuk.




Яшчэ адзін жаночы вобраз, які стаў адным з новых пратэстных сімвалаў Беларусі і пра які трэба абавязкова расказаць, гэта карціна «Ева».

«Ева» — карціна мастака беларускага паходжання Хаіма Суціна, створаная ў 1928 годзе ў Парыжы. Была набыта «Белгазпрамбанкам» на аўкцыёне Sotheby's у 2013 годзе за 1,8 млн долараў ЗША і прывезена ў Беларусь для папаўнення карпаратыўнай калекцыі банка. З таго часу стала самай дарагой карцінай з тых, што публічна выстаўляюцца ў Беларусі.

У час перадвыбарнай кампаніі з боку дзяржавы пачаўся ціск на «Белгазпрамбанк» і былога старшыню праўлення банка Віктара Бабарыку. Былі ўзбуджаны крымінальныя справы. 14 чэрвеня 2020 года старшыня Белтэлерадыёкампаніі Іван Эйсмант паведаміў, што паўтары сотні карцін з калекцыі банка «далучаны да справы». Усе гэтыя карціны разам з «Евай» былі прыбраны з публічнага доступу ў галерэі «Арт-Беларусь» у Палацы мастацтва. Пасля гэтага карціна «Ева» стала асновай для палітычных карыкатур супраць пераследу з боку ўлады і адным з сімвалаў пратэсту, які і зараз актыўна выкарыстоўваецца ў розных візуальных вобразах і прадуктах.



Найбольш папулярнымі песнямі, якія расказваюць пра жаночую салідарнасць і смеласць у Беларусі, сталі песні PyLai «Женщины не гуляют»[23] і NaviBand «Девочка в белом»[24].

Папулярны праект «Арзамас»[25] разам з новым культурным праектам Wir.by[26] зрабілі агляд беларускіх песень пратэсту, якія беларусы спяваюць на вуліцах. У іх топ трапілі «Калыханка», «Пагоня», «Купалінка», «Магутны Божа», «Тры чарапахі» і «Простыя словы».

Найбольшую папулярнасць і народную любоў сярод новых твораў, якія былі напісаны ўжо ў часе пратэсту, атрымалі песні гуртоў Nizkiz[27] і Tor Band[28].

А дзякуючы ініцыятывам «Традыцыя», «Годна» і «Вольны хор» з'явілася ажно чатыры спеўнікі[29], з дапамогай якіх усе жадаючыя могуць арганізоўваць калектыўныя спевы ў сваіх супольнасцях, дварах, населеных пунктах.

У якасці падсумавання можна засведчыць, што творчасць у розных праяўленнях стала адным з галоўных рухавікоў пратэсту ў Беларусі. Тысячы яскравых і эмацыйных песнь, кліпаў, малюнкаў, плакатаў, калажаў і твораў стрыт-арту сталі не проста адлюстраваннем беларускіх падзей, яны натхняюць беларусаў адстойваць свае правы, змагацца за праўду і справядлівасць.

Створаныя прадукты эмацыйна перадаюць атмасферу пратэстаў, якія адбываліся ў Беларусі ад 9 жніўня 2020 года, расказваюць пра герояў і катаў беларускай рэвалюцыі, пра злачынствы рэжыму і годныя ўчынкі беларусаў, якія не спужаліся і працягваюць змагацца. Некаторыя з гэтых прац сталі легендарнымі, яны гучалі падчас пратэстаў, іх публікавалі ў вядомых часопісах, дасылалі ў якасці паштовак палітвязням у турмы, праектавалі на будынкі дамоў, малявалі на сценах, уздымалі як плакаты на акцыях пратэсту і ўскладалі на магілы новых беларускіх герояў.

## Дадатковыя матэрыялы

1. Вялікі архіў пратэстнага арта сабраў праект Chrysalis Mag: https://chrysalis-mag.by; https://www.instagram.com/chrysalismagazine.
2. Вялікі архіў пратэстных плакатаў сабраў праект #культпротест: https://cult-protest.me.

---

[23] PyLai — Женщины не гуляют (2020) // YouTube: https://youtu.be/vXuJ_DcDbmQ.

[24] Девочка в белом // YouTube: https://youtu.be/Sjc2FfjTCZM.

[25] 6 песен белорусского протеста // Arzamas: https://arzamas.academy/mag/938-belarus_pesni.

[26] Песні // Wir.by: https://wir.by/be/article/piesni.

[27] Акаўнт NIZKIZ у YouTube: https://youtube.com/nizkiz.

[28] Акаўнт Tor Band у YouTube: https://youtube.com/torband.

[29] Спеўнікі можна бясплатна спампаваць: https://symbal.by/spieuniki/.

3. Навіны аб культурным пратэсце ў Беларусі публікуе «Министерство Контркультуры»: https://moc.media.
4. Сто лепшых мемаў і плакатаў з беларускіх пратэстаў сабраў партал Kyky.org: https://kyky.org/cult/100-luchshih-memov-i-plakatov-s-belaruskih-protestov-da-da-tselaya-sotnya.

# Феномен «дворов» беларусской революции

Михаил Мацкевич

## Контекст

2020-2021 год богат на явления и процессы, которые требуют рефлексии и анализа. Одно из таких явлений — появление «дворов». «Дворы» — определение, появившиеся в среде протестующих, которое обозначает стихийное объединение жителей одного микрорайона (например, в Минске: «Асаналиева», «Улица Партизан» и т.п.; больше примеров на сайте dze.chat), которые самоорганизуются для различных действий, направленных на проявление несогласия и протеста против де-факто действующей власти. По мере разворачивания протеста различные независимые медиа это слово начали использовать и по отношению к объединениям малых городов страны, отдельных деревень. Феномен неожиданного появления огромного количества «дворов» проанализирован на данный момент слабо, и поэтому при анализе этого вопроса приходится во многом опираться на собственный опыт.

С течением времени и непрекращающихся репрессий со стороны государства данные объединения вынуждены были структурироваться, обеспечивать безопасность членов и изменять методы деятельности, что естественно приводило к созданию определенной культуры коммуникации внутри группы, правил безопасности и разделению по направлениям работы. В связи с этим именно на момент начала 2022 года будет корректнее использовать определение «местное сообщество» по отношению к таким объединениям. Далее в тексте будут использоваться определения «двор» и «местное сообщество», которые будут отличаться по хронологическим (в ранней стадии революции — «двор») и качественным показателям (наличие правил и культуры коммуникации, совместной устойчивой деятельности — «местное сообщество»).

Вне рамок данного анализа останутся объединения по профессиональному признаку и месту учебы, которые также имеют распространение и заслуживают отдельного внимания. Механизмы их появления и функционирования схожи, но они имеют и серьезные отличия.

# Местные сообщества в Беларуси и попытки их создания/возрождения в условиях постсоветской системы местного самоуправления и управления

Местные сообщества в современной истории Беларуси так и не приобрели своего воплощения как субъекта публичной политики или местной политики в силу различных причин[1]. В первую очередь постсоветской культуры разрешения местных проблем. В советские времена практически все общественные проблемы, будь то выкрученная лампочка в подъезде или загрязняющие предприятие, разрешались или купировались при участии государства. Гражданам не было необходимости вступать в коммуникацию друг с другом для разрешения совместных проблем на общей территории жительства. Во-вторых, сама политическая система не способствовала развитию и повышению важности местной политики. По наследству Беларуси осталось усеченное представление о местном управлении и самоуправлении, в котором не было места выборам местных органов исполнительной власти, местные советы до сих пор имеют весьма декоративный статус и обладают символическими полномочиями.

Безусловно, и многие годы авторитарного режима только способствовали атомизации беларусского общества.

Многими некоммерческими организациями и международными институтами от начала периода независимости Беларуси осуществлялась работа по возрождению/созданию местных сообществ. Эта тема зачастую была cross-cutting issues в различных темах и направлениях внешней помощи: будь то «зеленые» проекты на местном уровне или региональные культурные мероприятия — в них местные сообщества рассматривались как те объединения граждан, которые могли выступить бенефициарами проекта и залогом устойчивости итогов проектов или деятельности. Зачастую подобного рода теории изменений имели низкую реалистичность из-за отсутствия самих местных сообществ и/или их имитации. Работа же по созданию условий и проведению реформ, которые бы способствовали возрождению/созданию таких сообществ, встречала сильное сопротивление со стороны властей и не приводила к значительным подвижкам.

Те успехи некоммерческих организаций, которые были в этом направлении, сложно было мультиплицировать на всю страну, так чтобы это привело к качественным и количественным изменениям положения вещей.

---

[1] *Татьяна Водолажская, Владимир Мацкевич.* Становление и развитие сообществ // Euro Belarus.Info: https://eurobelarus.info/files/22/86/Book_Community.pdf.

## Мобилизация и самоорганизация «дворов» в августе 2020 года

Появлению «дворов» после начала революции способствовало наличие мест онлайн-коммуникации. И здесь существует два разных типа происхождения таких онлайн-площадок. С одной стороны, это были уже существующие чаты подъездов и домов, в которых до событий 2020 года происходило общение людей по различным бытовым вопросам: организация парковки, выяснение источников шума в ночное время, сбор средств на ремонт общего пространства и т.п. Мессенджеры, которые использовались — Viber и Telegram (в последующем из-за соображений безопасности остался только Telegram). С другой стороны, это созданные активистами движений «Страны для жизни» и «97%» многочисленные чаты с постфиксами «... для жизни» и «97%» (к примеру: «Слуцк для жизни», «Гомель для жизни», «Серебрянка 97%», «Ратомка 97») и созданные активистами по аналогии с первым типом чаты дворов и отдельных домов. Началось все с обсуждения происходящего, позже — проявления солидарности с пострадавшими и в итоге — организации акций протеста. Сами же члены сообществ отсчитывают появление своего сообщества в большинстве случаев с августа-сентября 2020 года[2].

С течением времени, благодаря совместной деятельности люди начали знакомиться друг с другом — по сути, узнавать соседей, с которыми раньше не было большого предлога иметь отношения. Отдельно стоит упомянуть организацию совместных чаепитий, концертов, лекций во дворах своих домов. В определенный период времени силовики не вторгались в отвоеванное пространство совместного проживания, что дало возможность людям пережить совместный опыт и завязать товарищеские и дружеские отношения. Со сменой фокуса репрессий на зарождающиеся сообщества, активные участники вынуждены были создавать отдельные чаты с куда меньшим количеством людей и с добавлением только знакомых и проверенных людей. В некоторых сообществах такое «сужение» численности чатов происходило несколько раз: чаты ликвидировались после задержания участника или участников и создавались вновь. В итоге таким образом выкристаллизовались малые группы людей, которые создавали свои правила безопасности и самостоятельно договаривались о совместной деятельности. Безусловно, это привело к тому, что возникли проблемы с пополнением членов сообществ — некоторые участники «откалывались» по различным причинам (аресты, соображения безопасности семьи, страх, нервные срывы и психологические проблемы и мн.др.), а новых добавлять все тяжелее из-за опасности внедрения сексотов.

---

[2] Гражданское общество в Беларуси в ситуации политического кризиса: состояние и вызовы. Отчет по результатам исследования // SYMPA: https://sympa-by.eu/sites/default/files/library/needs_assessment_full_survey_full_version_rus_0.pdf.

На протяжении всего этого времени в подавляющим большинстве случаев как все протестующие, так и их организованная часть (сообщества) поддерживали и продолжают поддерживать требования политических штабов: прекращение насилия, освобождение политических заключенных, проведение новых честных выборов. Отличаются скорее методы и взгляды, каким образом можно принудить диктатуру к переговорам и изменениям: насильственные методы или мирный протест. Спустя полтора года репрессий и наличие только признанных политических заключенных количеством чуть менее тысячи человек (на момент подготовки данной статьи), введение репрессивных законов и практик, массовых увольнений и т.п., члены сообществ испытывают депрессию, чувство страха не покидает всех. Многие из них не отказываются от коммуникации друг с другом, но и не предпринимают значительных и опасных действий. Такое положение сообществ можно охарактеризовать как выживание.

## Территориальное распределение, количественные показатели, виды деятельности, принципы организации

На момент подготовки данного текста нельзя сказать с уверенностью о точном количестве местных сообществ и дворов, зародившихся в период революции. Невозможно также себе представить метод их подсчета — большинство сообществ законспирировано и действует непублично. Если же принять за гипотезу, что за каждым публичным чатом и каналом «скрывается» сообщество, то в таком случае можно определить если не точное количество, то хотя бы порядок цифр. На момент подготовки этого документа ресурс dze.chat насчитывает около 700 публичных чатов (на конец 2020 года их было 958[3]). Больше половины этих чатов приходится на Минск и его агломерацию. Областные города также покрыты чатами в количестве от 20 до 30 штук (выделяется Могилев с низким числом таких чатов — 5). Не все центры районов покрыты подобного рода чатами. При коммуникации с организациями и инициативами, которые работают на развитие и поддержку местных сообществ, также нельзя получить даже ориентировочное количество местных сообществ, в то же время все представители таких организаций говорят о том, что не в состоянии «покрыть» своими услугами все сообщества, контакты с которыми у них есть.

Из опыта взаимодействия с местными сообществами на конец 2021 года, многие из них находятся в «сохранном» режиме и не предпринимают активных действий. В основном их активность заключается в поддержке политических заключенных и их семей в виде сбора средств и оказания материальной помощи,

[3] Локальные телеграм-группы (чаты) в январе-мае 2021 года // Центр европейской трансформации: https://cet.eurobelarus.info/files/userfiles/5/CET/2021_TG_Belarus-IV.pdf.

отправки писем поддержки в места заключения, некоторые их них поддерживают региональные телеграм-каналы. Актуальным для многих сообществ остается проведение «партизанских» акций: размещение национальной символики в публичных местах, анонимные акции с последующей публикацией фотографий в телеграм-каналах. Также важным участники сообществ считают обеспечение безопасности своих членов в сети, и многие организации фиксируют запрос на обучение навыкам цифровой безопасности на протяжении всего времени революции. Оценивая в начале 2022 года данные исследования «Гражданское общество в Беларуси в ситуации политического кризиса: состояние и вызовы»[4], которое проводилось в марте-мае 2021 года, можно субъективно заключить, что наблюдается динамика сужения активностей.

Реже можно встретить сообщества, которые в дополнение к вышеописанному определили свои задачи не только как гражданское сопротивление, но и направили свои усилия на «малые дела» или развитие. К примеру, взаимодействие с коммунальными службами для организации мероприятий по уборке территории, создание беларусскоязычного контента для социальных сетей, помощь другим сообщества в обеспечении цифровой безопасности и безопасности коммуникации.

Стоит также отметить, что постепенно набирают популярность сообщества и телеграм-каналы радикальной направленности с призывами к насильственным действиям по отношению к имуществу приближенных к власти и их здоровью.

## С чем связан «взрыв» местной активности?

Самым простым ответом было бы перечисление причин самой революции: несогласие с итогами выборов, отрицание властями пандемии COVID-19, непрозрачность интеграционных процессов с Российской Федерацией, насилие 9-10 августа 2020 года, а также «дисбаланс в Беларуси между развитием государства, с одной стороны, и развитием общества с другой»[5]. Однако для темы местных сообществ необходимо предложить несколько дополнительных углубленных тезисов.

[4] Гражданское общество в Беларуси в ситуации политического кризиса: состояние и вызовы. Отчет по результатам исследования // SYMPA: https://sympa-by.eu/sites/default/files/library/needs_assessment_full_survey_full_version_rus_0.pdf.

[5] Oksana Shelest. Revolution in Belarus — Faktoren und Werteorientierungen // Laender-Analysen: https://www.laender-analysen.de/belarus-analysen/53/revolution-in-belarus-faktoren-und-werteorientierungen/.

До событий августа 2020 года исследователи фиксировали *кризис институционального и межличностного доверия*[6]. С началом же революции в протестной среде родилась присказка из знаменитой песни российской рок-группы «Сплин» «Мы не знали друг друга до этого лета». Смысл которой заключается в том, что происходящий «бум» революции на начальном этапе породил огромное количество итераций с совсем незнакомыми ранее людьми — соседи по подъездам, люди из разных городов, разных профессий стали переживать совместный эмоционально насыщенный опыт. Для многих из них количество контактов увеличилось в разы. В совокупности с личными экзистенциональными выборами членов сообществ и поиском единомышленников это порождало необходимость объединения.

Беларусский протест отличался высокой степенью самоорганизации и горизонтальностью — частично вынужденной (выдворение из страны или заключение лидеров протеста под стражу). Такая ситуация породила потребность в локальных лидерах и инициативных людях, и это тоже стало одним из факторов развития локальных объединений.

## Что это может дать для «Новой Беларуси»?

«Новая Беларусь» — опять же рожденное в протестной аудитории словосочетание, обозначающие всю совокупность представлений о том, каким образом должна быть устроена страна и каких тоталитарных практик не должно быть в ней.

Те сообщества, которые возникли на волне протестной мобилизации — еще «протосообщества», но имеют потенциал к развитию. Многие активисты сообществ указывают на то, что смена политического режима предоставит возможность ставить новые задачи[7] (трансформироваться в отделения политических партий, НКО, предвыборные штабы кандидатов в разные уровни власти и т.п.).

В Беларуси уже давно назрела необходимость в проведении административно-территориальной реформы, но в дискуссиях экспертов краеугольным камнем является вопрос, каким образом это новое деление страны должно происходить. Рассматриваются разные варианты: наличие городов-драйверов экономики, этнографические границы, численность населения городов и пр.

---

[6] Оксана Шелест: Базовое требование для всех — коренное изменение ситуации // Thinktanks.by: https://thinktanks.by/publication/2020/09/21/oxana-shelest-bazovoe-trebovanie-dlya-vseh-korennoe-izmenenie-situatsii.html.

[7] Гражданское общество в Беларуси в ситуации политического кризиса: состояние и вызовы. Отчет по результатам исследования // SYMPA: https://sympa-by.eu/sites/default/files/library/needs_assessment_full_survey_full_version_rus_0.pdf.

Анализ же феномена новых местных сообществ позволяет всерьез рассматривать их как один из факторов для определения границ административных территорий и установления режима дифференцированного по полномочиям самоуправления.

# Параўнанне выбліскаў грамадскай актыўнасці ў паслявыбарчы перыяд у розных выбарчых кампаніях: роля ключавых сацыяльных партнёраў

Павал Казанецкі

Прайшло 30 гадоў з моманту распаду Савецкага Саюза. Адыходзіць пакаленне, якое сумавала па савецкай стабілізацыі; на пенсію сыходзіць пакаленне, якое цаніла лукашэнкаўскія часы за спакой і гарантыі сацыяльнай бяспекі, параўноўваючы іх з сацыяльнай нестабільнасцю перыяду перабудовы. У 2020 годзе на вуліцу выходзілі людзі, якія не памяталі савецкіх часоў. Незалежнасць Беларусі для іх — відавочнасць. Іх бачанне — гэта хуткае развіццё суседніх краін, напрыклад, Літвы і Польшчы, высокі ўзровень жыцця ў Заходняй Еўропе і, перш за ўсё, велізарнае расчараванне лукашэнкаўскім рэжымам.

## Прэзідэнцкія выбары як барометр палітычнага жыцця ў Беларусі

Аляксандр Лукашэнка ад самага свайго прыходу да ўлады ў 1994 годзе ў выніку дэмакратычных выбараў знішчаў сваіх палітычных канкурэнтаў і імкнуўся да маргіналізацыі іншых палітычных рухаў.

У 1996 годзе ён канчаткова ўмацаваў сваю ўладу праз канстытуцыйны пераварот без згоды парламента. Нягледзячы на кароткі перыяд двоеўладдзя і спробы правесці т.зв. альтэрнатыўныя прэзідэнцкія выбары ў 1999 годзе, дыктатарская сістэма ўзяла канчатковы верх. У тыя часы з Беларусі выехалі многія вядомыя палітыкі, такія як Зянон Пазняк або Сямён Шарэцкі — так быў пакладзены пачатак феномена: хваля эміграцыі лідараў апазіцыі пасля кожнай выбар-

чай кампаніі. Шэраг палітыкаў, асабліва з постнаменклатурных колаў, прапаў без вестак. Да іх належалі экс-кіраўнік МУС Юрый Захаранка, экс-старшыня ЦВК Віктар Ганчар і яго паплечнік Дзмітрый Красоўскі.

Створаныя ў перыяд перабудовы і першыя гады незалежнасці апазіцыйныя палітычныя партыі, хоць і мелі ў двух скліканнях парламента свае клубы і фракцыі, пасля ўвядзення аўтарытарных механізмаў паступова гублялі ўплыў на афіцыйнае палітычнае жыццё. Перад выбарамі 2001 года яны ўтварылі аб'яднаныя дэмакратычныя сілы, якія задавалі тон выбарчых кампаній у наступныя гады. У 2005 годзе на Кангрэсе дэмакратычных сіл быў абраны адзіны кандыдат, падтрыманы шырокім палітычным спектрам — ад камуністаў (Партыя камуністаў Беларуская), сацыял-дэмакратаў (Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя) і лібералаў з Аб'яднанай грамадзянскай партыі (АГП) да незалежніцкіх кансерватыўна-хрысціянскіх партый, як Беларускі народны фронт (БНФ) або Беларуская хрысціянская дэмакратыя, а таксама няўрадавымі арганізацыямі. Аляксандр Мілінкевіч быў грамадскім дзеячам і не быў звязаны ні з адной з партый. Аднак ён стаў, дзякуючы атрыманай у выніку выбараў легітымнасці ўнутры дэмакратычных сіл, сімвалам аб'яднання апазіцыі.

Сумесны фронт, як і ў 2001 годзе, спрабавалі прарваць прарасійскія дзеячы і беларускія журналісты, якія ў якасці кандыдата выставілі былога рэктара Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Аляксандра Казуліна, аднаго з галоўных стваральнікаў лукашэнкаўскай ідэалогіі ва ўніверсітэтах.

Выбары 2006 года дазволілі выявіць лідара апазіцыі, які для заходняга свету стаў тварам дэмакратычнага руху. Мілінкевіч вылучаў праеўрапейскія лозунгі, прапагандуючы змену геапалітычнага вектара развіцця краіны. У перадвыбарнай праграме ён рабіў стаўку на рынкавую эканоміку і дэмакратычную сістэму. Ён быў узнагароджаны прэміяй «За свабоду думкі» імя Сахарава, а беларуская апазіцыя ўпершыню была заўважана за мяжой як партнёр і фактар уплыву на сітуацыю ў краіне.

Аднак гэта былі апошнія выбары, на якіх удалося захаваць адзінства лідараў апазіцыі. Спроба ўмацаваць супрацоўніцтва апазіцыі шляхам стварэння Руху «За Свабоду» не мела поспеху. Больш за тое, падтрымка ў 2010 годзе часткай заходніх краін рускамоўнай часткі апазіцыі і руху «Гавары праўду», які выставіў у якасці кандыдата вядомага беларускага літаратара Уладзіміра Някляева, які сваёй асобай меўся прадухіліць падзел апазіцыі на партыйна-грамадзянскую і постнаменклатурную, прывяла да таго, што Мілінкевіч адмовіўся ад вылучэння сваёй кандыдатуры, што канчаткова разбіла апазіцыю.

На выбарах 2010 года поруч з Някляевым вылучыліся Андрэй Саннікаў, былы намеснік міністра замежных справаў і лідар руху «Еўрапейская Беларусь», Алесь Міхалевіч, адзін з кіраўнікоў БНФ, Яраслаў Раманчук ад партыі АГП, Віталь Рымашэўскі з партыі беларускіх хрысціянскіх дэмакратаў, Рыгор Кастусёў,

старшыня БНФ, Мікола Статкевіч з сацыял-дэмакратычнай партыі. Пасля выбараў усе кандыдаты былі арыштаваны і пасля паступова вызвалены з-пад варты. Большасць сябраў штаба Някляева і Саннікава таксама прайшла праз арышты і судовыя справы або пакінула Беларусь. У эміграцыі апынуліся часова Міхалевіч, а таксама Саннікаў. У той жа час праведзеная кампанія канчаткова скампраметавала апазіцыю ў вачах грамадства, якое не хацела звяртаць увагу на маштабы і жорсткасць рэпрэсій, што напаткалі кандыдатаў.

Разам з гэтымі падзеямі палітычныя партыі канчаткова страцілі сваё значэнне. Вылучаныя імі кандыдаты на наступных прэзідэнцкіх выбарах не былі прызнаны ў грамадстве, а выраз «дэмакратычная апазіцыя» набыў адназначна негатыўнае адценне. Улады навучыліся разыгрываць апазіцыйных палітыкаў адзін супраць аднаго, што толькі паскорыла іх дыскрэдытацыю. Выбары перасталі ўспрымацца як механізм змены ўлады, яны хутчэй разглядаліся партыйнай апазіцыяй як спосаб прасоўвання сябе.

Такая сітуацыя радыкальна змянілася ў выніку падзей 2020 года, калі на сцэну выйшлі новыя кандыдаты, што не бралі дагэтуль удзелу ў палітычным жыцці. Гэта былі Віктар Бабарыка, былы старшыня «Белгазпрамбанка», Валерый Цапкала, былы дыпламат, у тым ліку амбасадар у ЗША, а — што найважней — стваральнік і былы дырэктар беларускага Парка высокіх тэхналогій, т.зв. беларускай «Крэмневай даліны», у якой працавала вялікая колькасць спецыялістаў IT-індустрыі, і нарэшце — Сяргей Ціханоўскі, шырока папулярны блогер.

Шмат для каго ўступленне ў палітычную барацьбу асобаў, якія займалі высокія пасады, было сігналам пра раскол у лагеры Лукашэнкі. Ніводзін з высокапастаўленых беларускіх чыноўнікаў не адважыўся б выступіць супраць Лукашэнкі, не маючы падтрымкі з боку расійскіх уладаў. Пра гэта таксама сведчылі эканамічныя і таварыскія сувязі ўсіх трох кандыдатаў. Ціханоўскі быў, мабыць, найменш важнай палітычнай фігурай. Тым не менш, яго шырокая сетка блогераў была эфектыўным інструментам прапаганды, таму, калі глядзець праз прызму выбарчых тэхналогій, ён быў тэхнічным кандыдатам, адказным за мабілізацыйную кампанію. Арышт Ціханоўскага да таго, як ён паспеў зарэгістраваць сваю кандыдатуру, вымусіў яго штаб схіліць да ўдзелу ў выбарах Святлану Ціханоўскую.

Апроч Ціханоўскага, быў арыштаваны і Бабарыка — паводле абвінавачванняў у фінансавых злоўжываннях падчас сваёй працы ў банку. Ён быў самым моцным праціўнікам Лукашэнкі і сабраў у сваю падтрымку 367179 подпісаў, з якіх Цэнтральная выбарчая камісія прызнала 165744. Але, тым не менш, адмовіла яму ў рэгістрацыі. Трэці з кандыдатаў, Цапкала, падаў 158682 подпісы, з якіх прызналі сапраўднымі 75249, што і стала падставай для яго нерэгістрацыі. Цапкала ўцёк з Беларусі ў Расію, баючыся паўтарыць лёс свайго канкурэнта. Ён таксама напісаў ліст прэзідэнту Пуціну з просьбай умяшацца ў выбарчы працэс у Беларусі. Такім чынам, улады сваімі дзеяннямі аб’ядналі апазіцыянераў,

і Ціханоўская стала ўвасабленнем выбарчага працэсу і нарастаючай мабілізацыі, а затым і сацыяльнага пратэсту.

Ніводзін з кандыдатаў не прадставіў палітычную праграму датычна рэформ дзяржавы і эканомікі і нават не заявіў, якой будзе геапалітычная арыентацыя краіны. Яны пазбягалі любой цаной слоў «Еўропа» або «еўрапейскі кірунак», затое часта ўжывалі добразычлівыя фармулёўкі ў дачыненні да Расіі, а ўжо падчас паслявыбарчых дэманстрацый — заявы пра тое, што яны не антырасійскія. Адзіным лозунгам кандыдатаў было адхіленне ад улады Лукашэнкі, які, са свайго боку, наўпрост сцвярджаў, што абодва галоўныя яго канкурэнты фінансуюцца Расіяй.

Кампанія збору подпісаў у падтрымку кандыдатаў падняла вялікую хвалю мабілізацыі грамадзян. Гэты рух абапіраўся на падтрымку сярэдняга класа ў Мінску, малых і сярэдніх прадпрымальнікаў, працаўнікоў IT-сферы і інтэлігенцыі. Змена сацыяльных настрояў стала ключавым фактарам, які выклікаў такі моцны ўдзел грамадства і рост грамадзянскай актыўнасці. Рэзкае зніжэнне грамадскай падтрымкі Лукашэнкі і змена чаканняў у грамадстве адкрылі ў 2020 годзе поле для кандыдатаў без негатыўнай маркі «апазіцыянер». Спантаннасць сацыяльнага выбуху супраць «крадзяжу» галасоў не дазволіла ўладам правільна ацаніць сітуацыю, і яны ўпершыню стравілі кантроль над выбарчым працэсам.

У выніку дэманстрацый Ціханоўская, якая стала тварам пратэсту, сфармавала Каардынацыйную раду. Рада была аморфным утварэннем, якое вылучала толькі бягучыя пастулаты: правядзенне новых выбараў, вызваленне палітвязняў і пакаранне за зверствы, учыненыя падчас дэманстрацый; аднак яна стварала адчуванне з'яўлення шырокага сацыяльнага прадстаўніцтва. Вываз Ціханоўскай з краіны і арышт галоўных лідараў Каардынацыйнай рады прывялі да яе палітычнага паралічу. Гэта адбывалася поруч з хваляй рэпрэсій беспрэцэдэнтных маштабаў, бачных для ўсяго грамадства, дзе адбылася моцная палітычная палярызацыя. Сам выбарчы працэс завяршыўся паводле звычайнага сцэнару ўладаў. Аднак упершыню ў такім маштабе грамадзянская супольнасць стала палітычным суб'ектам, што запусціла новыя працэсы і стварыла новую сітуацыю ў Беларусі.

## Грамадская мабілізацыя на прэзідэнцкіх выбарах

У 1994 годзе выбарчая кампанія абмяжоўвалася прэзентацыяй кандыдатаў. Яна праводзілася па постсавецкіх перабудовачных стандартах, і ніхто не думаў пра важнасць мабілізацыі грамадства на ўдзел у выбарах. Важнасць мабілізацыйных кампаній прадэманстравала вясна 1996 года і дэманстрацыі супраць змен у Канстытуцыі і фармавання аўтарытарнага рэжыму. Тады высветлілася, што пратэсты абмежаваліся толькі сталіцай, а падтрымка дэмакратычных каштоўнасцяў і Канстытуцыі мінімальная.

У 2001 годзе была ўпершыню падрыхтавана мабілізацыйная кампанія пад лозунгам «Выбірай!» з аптымістычным знакам сонца. Гэта выклікала шмат дыскусій сярод апазіцыі і грамадскіх актывістаў, якія бачылі сэнс у мабілізацыі за кандыдата, але не ў мабілізацыі для ўдзелу ў выбарах. Але гэта была першая спроба выхаду грамадскіх актывістаў у грамадства. Яны выйшлі на кірмашы, у крамы, упершыню сутыкнуўшыся вока ў вока з выбарцамі, якія былі настроены супраць апазіцыі. Кампанію тады каардынавала Асамблея дэмакратычных няўрадавых арганізацый.

Пры гэтым упершыню была падрыхтавана больш радыкальная выбарчая кампанія «ЗУБР», якая, з аднаго боку, насіла характар негатыўнай выбарчай кампаніі супраць Лукашэнкі, а з другога — мабілізавала моладзь на вулічны пратэст. Кампанія сабрала вельмі шмат маладых актывістаў з рэгіёнаў краіны і ў выніку заахвоціла іх прыехаць у дзень выбараў у Мінск для арганізацыі акцыі пратэсту на Кастрычніцкай плошчы. Пратэст быў патушаны апазіцыйнымі палітыкамі, у якіх было адчуванне пройгрышу на выбарах.

Кампанія «Выбірай!» і параза на выбарах, з аднаго боку, адбіла ахвоту ў многіх няўрадавых арганізацый любога ўдзелу ў выбарчых працэсах. З іншага боку, многія актывісты атрымалі досвед для падрыхтоўкі кампаніі 2006 года «За Свабоду», якая стала, нарэшце, станоўчым апазнавальным знакам Мілінкевіча і пад гэтым знакам аб'яднала грамадска-палітычны рух пасля выбараў 2006 года. Паралельна моладзь, арганізаваная ў рух «ЗУБР», падрыхтавала праеўрапейскую кампанію «Джынсавая рэвалюцыя», сімвалам якой павінна было стаць палатно джынсавых штаноў, што мусіла таксама адсылаць да колеру еўрапейскага сцяга. Паралельна была арганізавана негатыўная кампанія «Хопіць!». Вынікам мабілізацыі стаў пратэст моладзі на Кастрычніцкай плошчы і, нягледзячы на ачапленне АМАПу, стварэнне намётавага мястэчка, якое праіснавала два тыдні, па ўзоры ўкраінскага пратэсту Аранжавай рэвалюцыі. На працягу некалькіх гадоў «пляц Кастуся Каліноўскага» быў сімвалам моладзевага пратэсту.

У 2010 годзе жаданне абараніць свае галасы мабілізавала выбарцаў выйсці на дэманстрацыю на плошчы Незалежнасці, дзе многія апазіцыйныя кандыдаты выступілі разам. Частка пратэсту традыцыйна прайшла па Кастрычніцкай плошчы. Аднак жорсткі разгон гэтых дэманстрацый адвярнуў грамадскасць ад выступаў падчас наступных выбарчых кампаній.

У 2020 годзе выбары, якія праходзілі пры зменёных сацыяльных настроях, сталі падставай для ўсеагульнай мабілізацыі і стварэння новых мясцовых грамадскіх асяродкаў, пачынаючы ад дваровых груп, камітэтаў студэнцкага пратэсту і да страйкамаў рабочых. Лозунгам, пад якім першапачаткова аб'ядноўваліся выбарцы, быў «Справядлівасць». Аднак з ходам выбараў важным лозунгам стала патрабаванне сумленных выбараў. Нарастала адчуванне «крадзяжу» галасоў уладамі. Калі сімвалам выбараў сталі тры жанчыны: Святлана Ціханоўская, Вера-

ніка Цапкала і Марыя Калеснікава, аб'яднаўчым лозунгам стала: «Верым, можам, пераможам». Сам пратэст быў вельмі дэцэнтралізаваным. Дэманстрацыі арганізоўваліся спантанна ў розных кропках горада і ў розных гарадах краіны. Велізарныя натоўпы ў цэнтры каля стэлы «Мінск — горад-герой» збіраліся і разыходзіліся спантанна. Яны давалі адчуванне адзінства і сілы, але таксама дэманстравалі адсутнасць каардынацыі. Адбывалася спантанная каардынацыя ў сацыяльных сетках, якія згулялі тут ключавую мабілізацыйную ролю.

Няўрадавыя арганізацыі адмовіліся ад будзь-якога ўдзелу ў выбарчым працэсе, акрамя арганізацый, якія займаліся назіраннем за выбарамі і абаронай рэпрэсаваных. Ды і сама рэвалюцыя стала хутчэй рэвалюцыяй сярэдняга класа, прадпрымальнікаў і прадстаўнікоў свабодных прафесій накшталт работнікаў IT-сферы, ужо прызвычаеных да гарадской культуры і перш за ўсё гатовых браць на сябе грамадзянскую адказнасць. Галоўную ролю тут адыграла паўсталая гарадская сацыяльная тканка. Цікава, што з часам пратэстоўцы ўзнялі нацыянальныя сімвалы — бел-чырвона-белы сцяг і герб «Пагоня», — якія дагэтуль былі хутчэй сімваламі непапулярнай палітычнай апазіцыі.

## Назіранне за выбарамі

У 2001 годзе за арганізацыю назірання адказваў Праваабарончы цэнтр «Вясна» сумесна з сеткай Беларускага аб'яднання рэсурсных цэнтраў — BARC. Сетка спрабавала займацца не толькі парушэннямі выбарчага заканадаўства, але і альтэрнатыўным падлікам галасоў. Гэтыя арганізацыі пасля выбараў былі ліквідаваны і пазбаўлены легальнага статуса. Маніторынг парушэнняў заканадаўства вёў і Беларускі Хельсінкскі камітэт, які афіцыйна ўзначальваў Мечыслаў Грыб, тагачасны дэпутат Вярхоўнага Савета. З 2006 года на працягу ўсіх выбарчых кампаній маніторынг выбараў вёўся праваабарончымі арганізацыямі пад назвай «Праваабаронцы за свабодныя выбары». Справаздачы гэтай назіральнай сеткі сталі падставай для таго, каб міжнародная супольнасць не прызнавала вынікі выбараў усіх папярэдніх выбарчых кампаній.

Да выбараў 2006 года рыхтавалася грамадская сетка назіральнікаў у рамках ініцыятывы «Партнёрства». Аднак пасля парламенцкіх выбараў 2004 года яна была ліквідавана ўладамі, а яе чатыры лідары апынуліся ў турме. Вось чаму з 2006 года палітычныя партыі як зарэгістраваныя, так і палітычныя групоўкі, незарэгістраваныя або зарэгістраваныя як грамадскія аб'яднанні, сфармавалі сумесную групу назірання за выбарамі «Права выбару». Гэта быў адзін з самых важных сумесных праектаў палітычных партый, які пераж‌ыў некалькі выбарчых кампаній і дазволіў захаваць слабыя структуры апазіцыйных партый, стаўшы адзіным з нешматлікіх эфектыўных механізмаў грамадзянскага ўдзелу палітычных структур на

працягу многіх гадоў. Справаздачы гэтай кааліцыі сталі асновай для заяваў палітычных структур у Еўропе.

У 2020 годзе таксама былі створаны грамадскія сеткі назірання за выбарамі, створаны бізнес-коламі. Да іх належала сетка «Сумленныя людзі», якая вяла назіранне за выбарамі без падрыхтоўкі назіральнікаў, але мела вельмі шырокае пакрыццё выбарчых участкаў на месцах па ўсёй краіне. Тады ж таксама паўстала грамадзянская анлайн-платформа «Голас», якая дазваляла кожнаму грамадзяніну вывешваць у інтэрнэце інфармацыю пра парушэнні выбарчага працэсу, а таксама фатаграфію сваёй выбарчай карты, каб дазволіць паралельна падлічваць галасы выбаршчыкаў. Сацыяльныя сеткі аказаліся ўнікальным інструментам, які дае новыя магчымасці для працы. Гэтыя праекты так і не зрабілі поўнага абагульнення вынікаў маніторынгу, аднак аказалі вялікі ўплыў на мабілізацыю грамадзян і пераканалі значную частку грамадства ў тым, што выбары былі сфальсіфікаваны.

## Рэзюмэ

Галоўная рыса падзей 2020 года — гэта абуджэнне беларускага грамадства. На вуліцы Мінска выйшлі сотні тысяч грамадзян. Дэманстрацыі праходзілі ў кожным буйным горадзе Беларусі і большасці раённых цэнтраў. Атрыманне суб'ектнасці ў палітычным працэсе беларускім грамадствам адрознівае выбарчы працэс 2020 года ад папярэдніх 30 гадоў удзелу ў прэзідэнцкіх выбарах. Апошні раз Мінск бачыў такія натоўпы ў перыяд перабудовы. Непасрэднай прычынай незадаволенасці беларускага грамадства, якая падарвала давер да ўлады, стала глыбокае перакананне значнай часткі беларусаў у тым, што выбары былі сфальсіфікаваны. Гэта перакананне ўзмацнілі жорсткія масавыя рэпрэсіі, убачаныя ўсім грамадствам. Праз арышты і рэпрэсіі прайшло каля 35 тыс. чалавек. Больш за 700 няўрадавых арганізацый і ўсіх апазіцыйных палітычных партый былі ліквідаваны, і значная частка прыватнага беларускага бізнесу выйшла за мяжу. Кошт гэтых выбараў для сацыяльнай тканкі краіны велізарны. У краіне распачаліся цалкам новыя працэсы, якія будуць фармаваць новую дынамічную геапалітычную сітуацыю ў Еўропе.

# Выборы 2020 года: упущенные возможности

Александр Отрощенков

## Катастрофа в Беларуси как претекст[1] войны в Украине

Президентские выборы 2020 года стали для Беларуси поворотным пунктом, когда изменилось все. Накануне выборов озвучивались разные прогнозы, но никто из экспертов не мог предположить, что всего через полтора года Беларусь станет изгоем, из нее вынуждены будут бежать сотни тысяч людей, и страна окажется на пороге войны с Украиной.

## Диспозиция перед выборами

Для того чтобы понять, почему в Беларуси произошло то, что произошло в 2020 году, стоит оценить обстановку в стране и вокруг нее накануне событий. Ведь по мнению большинства политологов и экспертов ничего не предвещало такого драматического и трагического исхода. Большинство наблюдателей предвещало очередную «элегантную» победу Лукашенко и дежурное подавление незначительных протестов по примеру президентских выборов 2015 года, за которыми даже те, кому это положено по роду занятий, наблюдали с плохо скрываемой скукой.

Действительно, по многим формальным признакам обстановка для Лукашенко складывалась как никогда благоприятная. «Старая» оппозиция, ориентировавшаяся на национальные символы и европейский выбор Беларуси, была по сути разгромлена еще после избирательной кампании и протестов 2010 года. Пропаганда и многолетние репрессии вытеснили представителей демократического движения из публичного пространства. Часть лидеров физически покинула страну, оставшаяся часть была маргинализована и откровенно неинтересна обществу.

---

[1] Претекст в социальной инженерии и политике — заранее отработанный сценарий, произведенные действия по которому приводят к определенному ожидаемому результату.

Прекрасно дела официального Минска обстояли и на международной арене. К началу 2020 года лоббисты Лукашенко, команда Владимира Макея и многочисленные эксперты разной степени информированности и сознательности после многолетних усилий наконец смогли внедрить в сознание условного «коллективного Запада» тезис о том, что Лукашенко, который безусловно диктатор, является одновременно и гарантом беларусского суверенитета и никогда не отдаст его России, хотя бы и из личных меркантильных интересов. Это не говорит, впрочем, о высоком уровне профессионализма беларусского МИД и его помощников. Сама ситуация в регионе складывалась для Лукашенко как нельзя удачней. Российская агрессия против Украины в 2014 году в значительной степени обнулила злодеяния беларусского режима против собственного народа. Перспектива российских танков в 180 км от Варшавы и в 100 км от Киева заботила западных политиков несравнимо сильнее, чем права человека в Беларуси. Забегая вперед, можно сказать, что события 2022 года показали, что зависимость наличия танков на границе от состояния прав человека в Беларуси намного более прямая, чем многим до этого казалось.

Так или иначе, началась разморозка беларусско-американских отношений. В феврале 2015 года глава МИД Беларуси Владимир Макей встретился с заместителем главы Госдепа США Эриком Рубиным, а в октябре после ряда символических жестов были приостановлены санкции, наложенные после разгрома оппозиции в 2010 году. В последующие годы Лукашенко достаточно ловко использовал свои разногласия с Кремлем для усиления позиций на западном направлении. Так, в августе 2019 года он принял у себя советника президента США по национальной безопасности Джона Болтона, а в феврале 2020 года состоялся первый за 25 лет визит в Минск госсекретаря США. Майк Помпео привез Лукашенко предложение ослабить зависимость Беларуси от российских энергоносителей, причем ничего не требуя взамен.

Результаты этой исторической встречи были более чем осязаемые. Уже 15 мая трейдер United Energy Trading при посредничестве американской компании Getka и польской UNIMOT заключили соглашение, и в Клайпеду поплыли танкеры с американской нефтью для Беларуси[2].

Развивались полным ходом и отношения с ЕС. Санкции были сняты в 2015-2016 годах. Беларусь получала десятки миллионов долларов на модернизацию границы и развитие инфраструктуры в приграничных регионах[3], Европейский банк реконструкции и развития только в 2018-2019 году инвестировал в различ-

---

[2] Глава UNIMOT о поставках нефти из США: Кому-то это не понравится // Reform.by: https://reform.by/glava-unimot-opostavkakh-nefti-iz-usa.

[3] Забытые миллионы. Сколько денег Беларусь получила от Евросоюза на укрепление границы? // Белсат: https://belsat.eu/ru/news/09-07-2021-zabytye-milliony-skolko-deneg-belarus-poluchila-ot-evrosoyuza-na-ukreplenie-granitsy/.

ные инфраструктурные проекты, модернизацию банковской системы и развитие бизнеса не менее 700 млн. евро. В апреле 2020 года вступили в силу соглашения об упрощении визового режима и реадмиссии с Евросоюзом.

Развивались и другие направления. В Минске проводился ежегодный международный форум «Минский диалог», работала трехсторонняя контактная группа по урегулированию ситуации на востоке Украины. Лукашенко заявлял, что Беларусь является «донором стабильности» в регионе, а накануне саммита НАТО в ноябре 2019 года генеральный секретарь альянса назвал Беларусь партнером и заявил, что не видит никакой угрозы со стороны Беларуси.

Сегодня, когда Беларусь участвует в агрессии против Украины, трудно поверить, что такая ситуация имела место всего два года назад. Она настолько всех устраивала, что большинство экспертов было уверено, что Запад закроет глаза на фальсификацию предстоящих выборов 2020 года, признает Лукашенко легитимным президентом и согласится на определенный уровень насилия в отношении беларусского народа[4].

Почему же ошиблись практически все, кто пытался предсказать события в Беларуси и даже должен был их предвидеть в силу занимаемых должностей?

## Изменения в обществе

Все, кто предсказывал унылую бессмысленную кампанию с предсказуемым результатом и незначительными протестами, не учли такой простой фактор, как беларусский народ. Точнее, те изменения, которые произошли с ним со времен выборов 2015-го, 2010-го и особенно 1994-го годов. Между июлем 1994 года, когда беларусский народ на единственных в своей истории относительно свободных выборах подавляющим большинством голосов выбрал Александра Лукашенко, и августом 2020 года прошло 26 лет. Это ровно тот срок, который требуется для смены поколений. Беларусское общество не просто изменилось. Оно физически стало другим.

Изменилась и структура общества. Некоторая экономическая либерализация привела к появлению небольшой прослойки обеспеченных людей. Отдельно стоит остановиться на феномене беларусской «силиконовой долины». 28 марта 2018 года вступил в силу Декрет № 8 «О развитии цифровой экономики», согласно которому зарегистрированные в Парке высоких технологий (ПВТ) компании и индивидуальные предприниматели до 1 января 2049 года освобождены от большинства налогов, включая налог на прибыль. Такая поддержка ИТ-сферы

[4] См., например: Валерий Ковалевский: США хотели признать выборы, если не случится ничего экстраординарного // Reform.by: https://reform.by/230938-valerij-kovalevskij-ssha-hoteli-priznat-vybory-esli-ne-sluchitsja-nichego-jekstraordinarnogo.

привела к тому, что в 2019 году доля ИТ-сектора обеспечила половину прироста ВВП[5]. По состоянию на июль 2020 года в ПВТ было зарегистрировано 886 компаний, в которых работало 65 тыс. человек[6]. Большинство из них жило в Минске и Минском районе. В условиях небогатой по европейским меркам страны появление нескольких десятков тысяч очень неплохо зарабатывающих людей в двухмиллионном городе привело к невероятному эффекту. Произошел быстрый рост мелких и средних бизнесов, обеспечивавших услуги и инфраструктуру для нового среднего и выше среднего классов, бум жилищного строительства. В новых жилищных комплексах нужны были кафе, рестораны, барбершопы, тату-салоны, частные ясли и многое-многое другое. Естественно, большую часть бонусов получила столица и ее пригороды, но эффект распространился и на другие крупные города.

Естественно, описанный выше процесс не мог не иметь общественных и политических последствий. Символом успешного человека в Беларуси стал айтишник — человек, который сам выучился, освоил навыки, непонятные большинству обывателей, и нашел работу в компании, никак не связанной с государством или даже не связанной с Беларусью. Он даже физически не обязательно должен находиться там, где работает. Этот человек-символ обязан собственным успехом лишь своим мозгам, труду и упорству. Точно также чувствовали себя ничем не обязанными государству и мелкие и средние предприниматели из других сфер деятельности. Государство для них было представлено лишь в виде бесконечных инспекций, проверок контролирующих органов и штрафов. Новый средний класс научился нести ответственность за свою жизнь и за свой успех, и было лишь вопросом времени, когда он эмансипируется и захочет нести ответственность, если еще не за свою страну, то хотя бы за организацию своей жизни в ней.

## Движение к катастрофе

Однако картина мира потенциальных кандидатов, отвечающих запросам изменившегося общества, была далека от состояния политической реальности в стране. В мае 2020 года Виктор Бабарико заявил, что не верит в то, что массовые фальсификации выборов в Беларуси будут возможны, если большинство действительно проголосует за альтернативного кандидата[7]. Вплоть до

[5] Айтишники стали драйвером белорусской экономики // Naviny.by: https://www.naviny.media/article/20191007/1570426753-aytishniki-stali-drayverom-belorusskoy-ekonomiki.

[6] В ПВТ приняли 71 компанию. Всего их уже 886 // Onliner: https://tech.onliner.by/2020/07/10/v-pvt-prinyali-71-kompaniyu-vsego-ix-uzhe-886.

[7] Бабарико заявил, что не верит в фальсификации и не является спарринг-партнером Лукашенко // Reform.by: https://reform.by/babariko-zajavil-chto-ne-verit-v-vozmozhnost-falsifikacii-i-ne-javljaetsja-sparring-partnerom-lukashenko.

9 августа (и даже некоторое время после) команда Светланы Тихановской, «заменившей» всех альтернативных кандидатов, придерживалась похожих установок, делая ставку на исключительно законные, правовые способы разрешения ситуации.

Вероятно, в данном случае можно говорить о своего рода разновидности «ошибки выжившего» (survivorship bias), когда люди, добившиеся ранее определенных успехов в бизнесе, культуре, общественной или академической деятельности, автоматически переносили свои представления, видение и бизнес-модели на сферу политической борьбы, рассчитывая на аналогичные результаты. Если в какой-то другой стране такой подход и мог бы принести результат, то в условиях беларусской специфики он не мог привести ни к чему иному, как к катастрофе, которая в итоге и произошла.

Пропаганда вполне уместна в политических кампаниях, она помогает мобилизовать сторонников и повысить активность общества. И качественного креатива было достаточно. В народное сознание глубоко внедрились мемы про 3% сторонников Лукашенко и другие узнаваемые символы кампании. Но опасность пропаганды в том, что в нее можно поверить и самому. И в определенные моменты действительно складывалось ощущение, что ситуативные лидеры кампании и протестов сами поверили в то, что Лукашенко никто не поддерживает, силовики только и ждут момента, чтобы перейти на сторону народа, а для того чтобы сменить власть — достаточно проголосовать, выйти на улицу и сложить пальцы сердечком. Стоит ли удивляться, что в такой ситуации абсолютное большинство протестующих не было готово к такому уровню насилия при разгоне мирных акций протеста и глубине зачистки общества после их подавления? Скорее, нет. Абсолютное большинство участников протестов составляли представители «небитого поколения», которые не испытали на себе жестокость силовиков во время разгонов массовых протестов прошлого в силу возрастных причин либо не знали о них, т.к. ранее были «вне политики».

Мог ли кто-то предупредить этих людей? Теоретически восполнить недостаток опыта в политической жизни и уличной борьбе молодых и амбициозных команд кандидатов могли бы представители «старой оппозиции», но у них в этот момент не оказалось соответствующих инструментов в виде влиятельных СМИ и массовых структур, а главное — авторитета среди молодого поколения и собственных историй успеха. В итоге представители «старой оппозиции» воспринимались «новой» как пропахшие нафталином странные люди с фамилиями из 90-х годов прошлого века, а опытные оппозиционеры смотрели на неофитов как на инфантилов, которые как-то умудрились дожить до 2020 года, не заметив, что в стране диктатура, и говорили, что они не оппозиция, а «нормальные люди». Говорить друг с другом этим группам было до определенного момента не о чем. Однако эти различия моментально стерлись после событий

лета-осени 2020 года. На определенном этапе мировоззрение, представления лидеров о геополитических ориентациях Беларуси, да и их личности вообще перестали иметь значение. Все взаимные претензии и недопонимания утратили актуальность. Протест моментально окрасился в бело-красно-белый цвет. Это единение произошло на улицах, в тюрьмах, в квартирах случайных людей, где участники протестов пережидали зачистки, в очередях родственников, несущих в тюрьмы передачи своим близким и совершенно незнакомым людям. Произошло это единение и в эмиграции, где представители разных волн из Беларуси демонстрируют небывалый уровень единства диаспоры.

## Запланированная жестокость

Существует убеждение, что жестокие и массовые репрессии против протестующих, которые начались еще задолго до дня выборов, но после 9 августа приобрели беспрецедентный масштаб, имели спонтанный характер и стали следствием испуга Лукашенко и его неготовности к такому масштабному протесту. Возможно, массовость протестов и стала для Лукашенко неожиданностью, но жестокие репрессии, по всей видимости, были тщательно спланированы заранее.

Есть версия, что в администрации Лукашенко рассматривался мягкий вариант, который позволил бы ему сохранить власть и добиться признания выборов Западом. Вариант якобы включал оглашение победы Лукашенко с небольшим перевесом (51-55%), электоральное поражение в Минске и второе место Бабарико или другого альтернативного кандидата, возможно, даже приглашение его для работы в правительстве. Это позволило бы избежать массового возмущения. Вероятно, мы никогда не узнаем, на самом ли деле рассматривался такой вариант действий, но вся диспозиция 2020 года говорит о том, что такое окно у Лукашенко было. Но вместо того, чтобы им воспользоваться, минимум с конца мая 2020 года была сделана ставка на максимальное обострение, и власти сделали все для того, чтобы к августу 2020 года спровоцировать массовый протест. Это и циничные аресты ведущих кандидатов, и демонстративное хамство властей, и издевательские 80% якобы проголосовавших за Лукашенко. Пока его оппоненты собирали подписи, проводили митинги и концерты, Лукашенко готовился к силовому варианту. Он объехал все базы спецподразделений, запирал в казармах силовиков и доводил их до состояния озверения, закупал богатый арсенал спецсредств для подавления протестов от производителей по всему миру.

Еще за два месяца до голосования он прямо напомнил о событиях в Андижане и заявил о готовности устроить подобную резню[8]. И он ее фактически устроил. Пусть и с меньшим количеством жертв, но с не меньшим количеством искалеченных судеб, разлученных семей, людей, вынужденных бежать из своей страны. Если о жизнях беларусов Лукашенко никогда не заботился, то его собственное положение также нельзя назвать положением победителя. Его режим не имеет ни малейших шансов отмыться от злодеяний, совершенных против своего народа. Внешнеполитические эскапады в виде захвата самолета авиакомпании Ryanair и рукотворного мигрантского кризиса навлекли на страну беспрецедентные экономические санкции. А отказ от отношений с Западом привел к фактической утрате суверенитета и ситуации, близкой ко внешней оккупации, когда на территории страны находится неограниченное количество российских войск, которые Лукашенко не контролирует.

## Вывод

Нынешнее положение Беларуси обусловлено решениями, принятыми в прошлом. Решения государственного значения далеко не всегда имеют сиюминутные последствия. Голосование за продукт отрицательной селекции советского строя, который не скрывал своих убеждений и своего презрения ко всему беларусскому, стали выбором постсоветских беларусов, за который сегодня платят их дети. Двадцать шесть лет спустя у Лукашенко нет ни только позитивного предложения для Беларуси, но и вообще хоть какого-то. Сегодняшняя Беларусь стоит на пороге войны, тюрьмы переполнены патриотами, а санкции за агрессию против Украины практически неизбежно приведут к тотальному обнищанию населения. К сожалению, эта ситуация была запрограмированна в 1994 году, и значительная часть ныне живущих беларусов не несет за это ответственности. Напротив, в 2020 году беларусы попытались исправить эту ошибку и сделали серьезную заявку на изменение хода истории. Это также был исторический выбор, который будет иметь свои последствия. Они не придут быстро, но ход истории многократно ускорился. Возможно, последствий почина 2020 года не придется ждать новые 26 лет.

[8] Лукашенко: «Забыли, как Каримов в Андижане подавил путч, расстреляв тысячи человек? Ну так мы напомним» // Белсат: https://belsat.eu/ru/news/lukashenko-zabyli-kak-karimov-v-andizhane-podavil-putch-rasstrelyav-tysyachi-chelovek-nu-tak-my-napomnim/.

# Ад паўстання да рэвалюцыі. Беларускі анархісцкі рух і пратэсты ў 2020 годзе

Аляксандр Ланеўскі

## Уводзіны[1]

Паступова нарастаючы ў Беларусі масавы грамадскі пратэст успыхнуў пасля сфальсіфікаваных прэзідэнцкіх выбараў і ў адказ на неўтаймаваную жорсткасць сілавых ведамстваў у жніўні 2020 года. Гэта паклала пачатак доўгатэрміноваму працэсу сацыяльных пераўтварэнняў, які я называю беларускай рэвалюцыяй. Удзельнікі любой, нават самай мірнай, рэвалюцыі пачатку XXI стагоддзя ўжывалі розныя формы гвалту[2]. Падзеі ў Беларусі я разглядаю, аднак, не як чарговую падзею ў серыі каляровых рэвалюцый[3], але як масавую сацыяльную мабілізацыю, якая складаецца адначасова як з мірных дзеянняў (напрыклад, дэманстрацый), так і гвалту, спрабуючы ў адносна кароткія тэрміны ажыццявіць змену палітычнага ладу і міжнародных дачыненняў дзяржавы, а таксама трансфармацыю сацыяльных структур[4]. Пры гэтым я прыпускаю, што адбылося «прыпыненне манаполіі ўлады, якая ажыццяўляецца дзяржавай, як правіла, звязанай са звычкай да паслушэнства»[5]. Слабасць старой апазіцыі і брак сфармаваных структур новай апазіцыі спрычыніліся да таго, што дзеля грунтоўнай змены сацыяльных, эканамічных і палітычных дачыненняў прадстаўнікі розных груп і прафесій (жанчыны,

---

[1] Поўная версія тэкста апублікавана ў польскім часопісе „Sprawy Międzynarodowe", 2021, t. 74, nr 2 ISSN 0038-853x.

[2] J. Chodak, *Rewolucje niezbrojne. Nowe scenariusze polityki kontestacji*, Wydawnictwo Uniwersytetu Marii Curie-Skłodowskiej, Lublin 2019.

[3] H. Giebień, *„Kolorowe rewolucje" na Białorusi — czy powiodą się?*, „Wschodnioznawstwo" 2015, nr 1, s. 181-197.

[4] Гл.: J. Chodak, *Teorie rewolucji w naukach społecznych*, Wydawnictwo Uniwersytetu Marii Curie-Skłodowskiej, Lublin 2012, s. 21.

[5] P. Amann, *Revolution. A redefinition*, „Political Science Quarterly" 1962, vol. 77, No. 1, c. 38.

студэнты, пенсіянеры, лекары, педагогі, рабочыя або прадпрымальнікі) пачалі салідарна аб'ядноўвацца ў шырэйшы рух[6].

Мой тэзіс палягае ў тым, што ў антырэжымных грамадскіх выступах у Беларусі важную ролю адыграў таксама і анархісцкі рух. Пратэсты лета і восені 2020 года былі як кульмінацыяй радыкалізацыі беларускага анархізму, так і экзаменам на сталасць гэтай грамадска-палітычнай плыні. Нягледзячы на тое, што рэвалюцыя не прынесла чаканых вынікаў і анархістаў накрыла хваля жорсткіх рэпрэсій, ім удалося назапасіць пэўны палітычны капітал: узрасла не толькі цікавасць да іх дзейнасці, але і давер да анархістаў як самастойнай грамадска-палітычнай сілы.

У гэтым артыкуле я каротка прадстаўлю дачыненне беларускіх анархістаў да рэвалюцыі, формы і метады іх дзейнасці падчас яе хады і маштабы ўздзеяння на грамадства, а таксама рэакцыю дзяржаўных органаў.

Асноўнымі аналізаванымі крыніцамі сталі вэб-сайты анархісцкіх груп, улёткі і праграмныя тэксты, а таксама рэпартажы, аналітычныя артыкулы і афіцыйныя паведамленні сілавых ведамстваў.

## Нарыс анархісцкай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь

Карані анархізму ў Беларусі сягаюць да канца XIX стагоддзя[7], сучасны ж анархісцкі рух налічвае трыццаць гадоў[8] і з'яўляецца даволі заўважным гульцом на беларускай апазіцыйнай сцэне, асабліва пасля 2010 года, калі міжнародныя праваабарончыя арганізацыі прызналі палітвязнямі ажно пяць яго актывістаў[9]. Да гэтага дзейнасць руху насіла адносна мірны характар з акцэнтам на антыфашызм, незалежную культуру, антываенныя пытанні, экалагічныя праблемы або акцыі салідарнасці. Нягледзячы на тое, што ад самага пачатку ў ім гучалі акцэнты працоўных правоў, за тры дзесяцігоддзі рух не змог стварыць прафсаюзы, якія дзейнічаюць на прынцыпах сіндыкалізму. Затое ладзіліся фестывалі і грамадскія форумы, выдаваліся газеты, улёткі і брашуры, і, нарэшце, анархісты актыўна ўдзельнічалі ў вулічнай пратэстнай дзейнасці.

[6] Гл.: J. Goodwin, *No other way out. States and revolutionary movements 1945-1991*, Cambridge University Press, Cambridge 2001.

[7] Ю.Э. Глушаков, *«Революция умерла! Да здравствует революция!» Анархизм в Беларуси (1902-1927)*, ШSS, Санкт-Петербург, 2015.

[8] Гл.: П. Канавальчык, *Anarchy in BY. Анархістычны рух у Беларусі*, Падручнік рэвалюцыянэра, Менск 2002; А. Ланеўскі, *Ад пратэсту да супраціву: вакол «справы беларускіх анархістаў»*, «Палітычная сфера» 2013, № 20 (1), сс. 99-121.

[9] Гл.: І. Аліневіч, *Еду ў Магадан*, «Беларуская турэмная літаратура», Мінск, 2017; М. Дзядок, *Фарбы паралельнага свету*, 2017.

Пачынаючы прыкладна з 2008 года беларускія анархісты сталі ўкараняць у палітычную практыку такія радыкальныя формы барацьбы, як падпалы і руйнаванне білбордаў, блакаванне дарог або закідванне будынкаў кактэйлямі Молатава. Такога кшталту акцыі — разам з доўгатэрміновымі ініцыятывамі мірнага характару[10] — становяцца сталым элементам іх дзейнасці. Парушэнне дзейнага заканадаўства ўпісваецца ў даўнюю традыцыю анархізму, а ў краіне, дзе нават самыя мірныя формы пратэсту сутыкаюцца з жорсткімі рэпрэсіямі, радыкалізацыя адбываецца натуральным чынам[11]. Бескампраміснасць беларускіх анархістаў была абумоўлена, апроч таго, досведам удзелу ў Еўрамайдане.

Наступным крокам стала атака на арганізацыі, якія аб'ядноўваюць журналістаў, а таксама медыякарпарацыі і інфармацыйныя агенцтвы. У студзені 2021 года былі затрыманы кіраўнічка беларускага «Прэс-клуба» Юлія Слуцкая і праграмная дырэктарка Ала Шарко. Афіцыйнай прычынай стала ўхіленне ад аплаты падаткаў. Былі праведзеныператрусы ў офісе, таксама былі абшуканы кватэры чальцоў кіраўніцтва. 16 лютага 2021 года былі праведзеныператрусы ў офісе Беларускай асацыяцыі журналістаў. Міліцыянты таксама абшукалі кватэры старшыні БАЖ Андрэя Бастунца і ягонага намесніка Алега Агеева. Следчы камітэт паведаміў, што ўзбуджана крымінальная справа «з мэтай устанаўлення абставін фінансавання акцыяў пратэсту»[7].

TUT.BY на працягу многіх гадоў быў самым папулярным незалежным інтэрнэт-парталам у Беларусі. Штодня яго наведвалі ў сярэднім больш за тры мільёны карыстальнікаў. 18 верасня 2020 года Міністэрства інфармацыі падало заяву ў суд аб пазбаўленні TUT.BY статуса СМІ. Для журналістаў партала гэта азначала адсутнасць магчымасці асвятляць пратэсты. Яшчэ ў 2020 годзе крымінальныя абвінавачванні атрымала Кацярыны Барысевіч з TUT.BY. Барысевіч была пакарана за разгалашэнне медычнай таямніцы, бо паінфармавала, што забіты беларускімі міліцыянтамі Раман Бандарэнка не быў п'яны. У траўні 2021 года рэжым закрыў агенцтва. Галоўная рэдактарка партала Марыя Золатава была арыштавана, за краты трапілі і іншыя супрацоўнікі TUT.BY.

Рэпрэсіі закранулі і інфармацыйнае агенцтва БелаПАН. 12 студзеня 2021 года знік экс-намеснік рэдактара агенцтва Андрэй Аляксандраў. Аказалася, што ён знаходзіцца пад вартай. Медыяменеджару было прад'яўлена абвінавачванне ў «грубым парушэнні грамадскага парадку ў Мінску». Пазней падалі інфармацыю, што Аляксандраў нібыта фінансаваў масавыя пратэсты. У офісе БелаПАН правяліператрус і канфіскавалі тэхніку.

Апошнія некалькі гадоў прынеслі велізарны рост папулярнасці інтэрнэт-СМІ. Перш за ўсё, доступ у інтэрнэт з'яўляецца агульным і танным. З гледзішча трансфармацыі інфармацыйна-камунікацыйнай інфраструктуры Беларусь не толькі з'яўляецца лепшай сярод дзяржаў СНД, але ейны ўзровень ацэньваецца вышэй за сярэдні па свеце[8]. Падчас выбарчай кампаніі 2020 года, а таксама ў перыяд адразу пасля выбараў доступ у інтэрнэт рэгулярна блакавалі, асабліва ў час, калі павінны былі праходзіць акцыі пратэсту. З 9-га па 12-е жніўня інтэрнэт у Беларусі

---

[7] "Everything was done to paralyze the work of the organization" // Belarusian Association of Journalists, 11.03.2021, доступ: 15.07.2021: https://baj.by/en/analytics/everything-was-done-paralyze-work-organization

[8] Białoruś 2021: perspektywa zmiany. Raport I // Studium Europy Wschodniej UW, доступ: 15.07.2021: https://studium.uw.edu.pl/wp-content/uploads/2021/04/BWR_Raport_1.pdf.

практычна не працаваў. Каб адсочваць гэтыя абмежаванні, няўрадавая арганізацыя Human Constanta ініцыявала праект «Лічбавыя назіральнікі», у рамках якога валанцёры кантралявалі даступнасць сеткі ў розных месцах краіны.

Інтэрнэт-блакада абыходзілася па-рознаму. Прыкладам можа служыць тэлеканал «Белсат», якому можна было адправіць SMS з пытаннем пра наяўнасць кагосьці ў спісе затрыманых або якой-небудзь інфармацыі, а вядоўцы правяралі лісты і падавалі інфармацыю падчас эфіра. Другім спосабам абысці блакаду стала вяртанне самвыдату. Ахвотныя ўдзельнічаць у распаўсюдзе інфармацыі маглі ў той час, калі інтэрнэт працаваў (гэта значыць звычайна раніцай), спампаваць у фармаце PDF матэрыял, напрыклад, з сайта Agitka 2020[9], а потым раздрукаваць і самастойна распаўсюдзіць яго па пад'ездах.

Важнай тэндэнцыяй некалькіх апошніх гадоў і перш за ўсё 2020 года стала палітызацыя СМІ, перш за ўсё інтэрнэт-сайтаў. Асаблівую ўвагу варта звярнуць на мэсэнджар Telegram, які з'яўляецца інструментам, з дапамогай якога маглі працаваць як блогеры, так і журналісты заблакаваных рэдакцый, і які дазваляў ствараць чаты для абмену інфармацыяй на мясцовым узроўні, а таксама самаарганізацыі пратэстоўцаў і ўзаемадапамогі. У выпадку з Беларуссю сёння нават кажуць пра «тэлеграм-прастору» ці «тэлеграм-СМІ»[10]. 20 верасня 2020 года рашэннем суда Telegram-канал NEXTA быў прызнаны экстрэмісцкім. Акрамя Telegram, YouTube па-ранейшаму грае важную ролю ў стварэнні відэаблогаў, аналітычных падкастаў і інтэрв'ю (напрыклад, канал «Беларусы і рынак»[11]) або інтэрнэт-тэлебачання (Malanka Media[12]).

На фоне агульнай дэпалітызацыі беларускага грамадства СМІ ў 2020 годзе праявілі значна большую мужнасць у паказе палітычных падзей, чым раней. Як вынікае з маніторынгу, праведзенага БАЖ, незалежныя СМІ рэгулярна паведамлялі пра апазіцыйных кандыдатаў на пасаду прэзідэнта і іх праграмы, гучныя выбарчыя і сацыяльныя ініцыятывы, а пазней — пра пратэсты, затрыманні і арышты[13].

---

[9] Agitka2020, доступ: 15.07.2021: https://www.agitka2020.org.

[10] Belarus: Freedom on the Net 2020 // Freedom House, доступ: 15.07.2021: https://freedomhouse.org/country/belarus/freedom-net/2020.

[11] Белорусы и рынок // YouTube, доступ: 15.07.2021: https://www.youtube.com/channel/UCFwGK9959swQPQde8OYn0GA.

[12] Malanka Media // YouTube, доступ: 15.07.2021: https://www.youtube.com/channel/UC5sPqti8bakMgz5T5u6_o6A.

[13] Coverage of the 2020 Presidential Elections in Belarusian Media. Report 2 // Belarusian Association of Journalists, 06.08.2020, доступ: 15.07.2021: https://baj.by/en/analytics/coverage-2020-presidential-elections-belarusian-media-report-2.

Палітызацыя СМІ паўплывала на палітызацыю беларускага грамадства. Даследаванні, праведзеныя PACT[14], паказваюць, што нізкая грамадзянская актыўнасць беларусаў шмат у чым была абумоўлена іх слабым веданнем палітычнай сітуацыі. СМІ адыгралі вялікую ролю ў пераадоленні страху выйсці на вуліцу. Дзякуючы таму, што пратэсты асвятляліся ўжывую, многія беларусы змаглі адчуць сябе часткай больш шырокага руху супрацыву.

Іншым важным феноменам з'яўляецца змена стаўлення да моўных пытанняў. У апошнія гады рашэнне стварыць СМІ на беларускай мове лічылася даволі рызыкоўным. У пэўных сегментах грамадства, сфармаваных пад уплывам расійскай гегемоніі, беларуская мова атаясамлівалася з нацыяналізмам. 2020 год прынёс нацыянальнае абуджэнне, а беларуская мова стала мовай маладога пакалення. Хоць падчас выбарчай кампаніі палітыкі «новай апазіцыі» асцярожна ставіліся да праявы беларускасці, аднак падчас паслявыбарчых пратэстаў людзі спантанна сталі звяртацца да бел-чырвона-белага сцяга або герба «Пагоня». Беларуская мова стала мовай пратэсту. Значная частка т.зв. новых СМІ, якія дзейнічаюць праз сацыяльныя сеткі, гэта менавіта беларускамоўныя каналы.

[14] What Do Belarusians Think? Belarusians have a strong potential to be more civically active, but they lack information and self-confidence // Pact, доступ: 15.07.2021: https://www.pactworld.org/sites/default/files/Article_3_Shraibman_Social%20Activity_EN.pdf.

# Заблокированные и в изгнании. Как изменилось медийное поле в Беларуси

Янина Мельникова

События 2020-2021 года в Беларуси серьезно повлияли на все сферы жизни. Пожалуй, нет такой отрасли экономики, нет таких коллективов или сообществ, которые оставались бы вне политической повестки, вне контекста протестного движения и последовавшего за ним насилия и репрессий.

Несмотря на все усилия властей, беларусы продолжают получать информацию о происходящем в стране через социальные сети, телеграм-каналы, независимые авторские YouTube-каналы. Хотя даже быть подписчиком на них сегодня — занятие небезопасное. Важную роль в распространении альтернативной государственной информационной повестки в Беларуси продолжают играть независимые медиа, подавляющее большинство которых за эти годы столкнулось с небывалым давлением со стороны властей, лишилось юридического статуса, вынуждено было частично или в полном составе покинуть страну.

Новая медийная реальность сегодняшней Беларуси выглядит следующим образом: заниматься журналистикой внутри страны — не просто сложно, но опасно для жизни и здоровья, делать ее из-за границы — хоть и менее опасно, но также сложно (существует большой риск оторваться от беларусских реалий либо стать жертвой целенаправленной дезинформации).

## Ковидная весна

Зима 2020 года ознаменовалось потрясением мирового масштаба — началась пандемия новой коронавирусной инфекции COVID-19. В новостной повестке мировых медиа тема COVID-19 вышла на первые места и держалась там месяцами. Вирус пугал, озадачивал, заставлял испытывать чувство тревоги и растерянности.

Докатившийся до Беларуси COVID-19 также быстро вышел на первые полосы медиа, особенно независимых. В то время как государственная пропаганда

продолжала свою традиционную песню «в Багдаде все спокойно», негосударственные медиа отрабатывали повестку максимально информативно, что на тот момент было делать крайне сложно.

Истории волонтеров, самоорганизовавшихся граждан, которые шьют маски и средства индивидуальной защиты (СИЗ), готовят горячие обеды медикам, помогают одиноким и малоимущим, хлынули на страницы независимых медиа. Они часто и в подробностях рассказывали о малом и среднем бизнесе, домохозяйках, айтишниках, таксистах, студентах, врачах, которые день и ночь вносили свой вклад в борьбу с пандемией.

Все это создавало более доверительные связи медиа с их читателями и зрителями, помогало людям справиться с тревогой, подсказывало, что можно и нужно делать сообща, чтобы максимально защитить себя и других. Позже политологи будут говорить, что первую серьезную ошибку в своей внутренней политике, которая отозвалась в сердцах не только его извечных противников, но также многих сторонников, а вместе с ними и колеблющихся граждан, Лукашенко допустил именно в теме отношения к пандемии и пренебрежительным отношением к первым жертвам новой коронавирусной инфекции.

В конечном итоге, транслируя такое не свойственное славянам пренебрежение к умершим, государственная пропаганда добилась прямо противоположного эффекта: люди окончательно перестали надеяться на власти, достаточно четко увидели, как их обманывают телеканалы и государственная пресса, и пришли к идее объединения ради собственной защиты.

## Президентская кампания-2020

К весне 2020 года беларусы пришли с четким пониманием: «Никто, кроме нас». И это понимание было сформировано в том числе беларусскими независимыми журналистами. Начавшаяся избирательная кампания, которая традиционно оказывалась в фокусе далеко не всех независимых медиа страны, в этот раз стала одним из самых обсуждаемых событий не только в общественно-политических изданиях.

Начиная с мая-июня 2020 года тема предстоящих президентских выборов в беларусских независимых медиа зазвучала в полузабытой в Беларуси тональности. Если предыдущие выборы отражались СМИ как «техническое голосование за Лукашенко», то на этот раз это была прописанная в законодательстве страны важная процедура, в которой должен принимать участие каждый обладающий правом голоса. Журналисты независимых медиа (включая региональные издания, которые традиционно давали о выборах скупые информационные материалы агентств) стали создавать собственный политический контент: портреты кандидатов, репортажи из штабов, со встреч кандидатов в регионах. Градус интереса к политической жизни в стране рос на глазах.

И все-таки к тому повороту событий, который случился в августе 2020 года, не была готова, пожалуй, ни одна редакция. Несколько дней после дня выборов работа медиа выглядела как попытка пробить стену головой: интернет не работал, сайты блокировались, мессенджеры включались через раз. Однако и разгон мирных демонстрантов, и избиение людей в милицейских участках и на Окрестина все-таки прорвались в медиаканалы благодаря как работе самих медийщиков, так и активной помощи пользователей. Эта помощь не прекратилась и позже, когда интернет уже не глушили: даже если журналистов не было на месте событий, редакции узнавали о происходящем в течение нескольких минут. Социальные сети и телеграм-аккаунты медиа превратились в телетайпные ленты, в бесконечные свидетельства очевидцев, которые не нуждались в комментариях и пояснениях.

Мессенджеры и чат-боты, в которые можно было прислать свою информацию, стали новой реальностью беларусских независимых медиа. Их главными продуктами, каналами для распространения и сбора информации.

При этом идеей фикс для силовиков стало желание убрать журналистов с улиц, не дать им возможности снимать, вести стримы, контактировать с редакциями и передавать информацию. В беларусских журналистов стреляли, их превентивно задерживали до окончания акций, присуждали штрафы и сутки административного ареста за якобы участие в несанкционированных акциях. Выполнение журналистами своих профессиональных обязанностей было приравнено к участию в несанкционированных акциях, а после — и к их организации (первой «ласточкой» в этом направлении стал кейс Катерины Андреевой и Дарьи Чульцовой).

## Беларусь как «горячая точка»

Уже к осени 2020 года стало понятно, что обычной «мирной» работы у медиа больше не будет. В стране, охваченной мирными протестами, просто не осталось «безопасных» тем для работы. Пишешь о культуре — попадаешь в поле политики, а значит, в протестное поле. Пишешь о спорте — и вновь ты в протестах. Пишешь об искусстве, образовании, науке, об истории... Этот список можно было продолжать и продолжать.

Профессия журналиста в стране стала самой что ни есть опасной, а «горячая точка», о работе в которой мечтают многие романтики-журфаковцы, переместилась не просто в твой город, а в твой двор, подъезд, а часто и в твою квартиру.

В конечном итоге, медиа пришлось признать, что та социально-политическая повестка, в которой нуждалась их аудитория и которую они так профессионально и всесторонне отрабатывали на своих страницах, в интернете и социальных сетях, была ставкой повышенного риска. По сути, независимые

журналисты, выбрав сторону объективного освещения ситуации (а другого выбора у них попросту не было), поставили на карту все: свои бизнесы, свой юридический статус, свободу своих коллег, свой личный и семейный комфорт.

## Релокация и распределение сил

Многие журналисты, редакторы и редакции уже к концу 2020 года начали думать о временной релокации, которая стала массовой в 2021 году. При чем речь идет не только о национальных изданиях, но также и о региональных коллективах, которые на местах также оказались неугодными властям, под разными предлогами были закрыты, лишены официального статуса, заблокированы. Журналисты становились фигурантами уголовных дел за якобы призывы к государственному перевороту, к участию в несанкционированных протестах и прочее. Стать «экстремистом», работая в беларусских медиа, стало возможным, как говорится, не отходя от компьютера. «Экстремистскими» признавались как отдельные каналы коммуникации медиа с аудиториями, так и целые коллективы, как, например, информационное агентство БелаПАН, которое не лишено юридического статуса, но уже признано «экстремистским».

В этой связи особенно показательны, на наш взгляд, признание «экстремистами», например, спортивных ресурсов. Таких как Tribuna. Ранее никто и помыслить не мог, что специализирующиеся на спортивных событиях журналисты могут быть настолько «опасными», но 2020 год перевернул все с ног на голову. И Tribuna, которая давала слово спортсменам, вставшим на защиту страны от насилия и произвола властей, оказалась в числе первых медиа, признанных «экстремистскими».

Ну и, конечно, даже осенью 2020 года, когда репрессии против журналистов шли полным ходом, никто не мог себе представить того, что случится с крупнейшим национальным интернет-порталом страны TUT.BY. В мае 2021 года в редакцию пришли силовики, которые буквально в течение одного дня не просто разгромили редакцию, не просто задержали ключевых редакторов, журналистов и менеджеров, но физически выключили серверы TUT.BY, тем самым лишив беларусов двадцатилетней истории, в которой была и первая электронная почта, и первые записи на форумах, и новости.

Уже в начале июня оставшаяся на свободе часть команды портала — журналисты и редакторы — презентовали временный проект Zerkalo, который должен был стать сменщиком TUT.BY до того момента, пока он не сможет возродиться.

## Фактчекинг и новая редакционная политика

Отъезд части редакционных коллективов, отсутствие правового статуса у оставшихся, непрекращающееся давление на медиа потребовало от медийщиков и новых навыков, и компетенций, и пересмотра собственных редакционных политики, вплоть до tone of voice (тональность, которой придерживается СМИ в коммуникации с аудиторией), который, конечно же, отличается от тональности в традиционных каналах — на сайтах и страницах печатных изданий. Журналисты и редакторы в срочном порядке осваивали новые инструменты — в том числе и старых социальных сетей.

Из-за репрессий беларусские независимые медиа сегодня хаотично разбросаны по площадкам (от все еще работающих отдельных региональных сайтов до мессенджеров и социальных сетей), а также по странам. Распределенные редакции, в которых часть коллектива находится внутри страны, а часть (чаще всего, бóльшая) — за ее пределами, к концу 2021 года перестали быть чем-то из ряда вон выходящим. Это уже не вызов, не исключение из правил, но способ существования и сохранения работоспособности как команд, так и отдельных их представителей.

Репрессии поставили беларусских независимых журналистов перед серьезным вызовом, связанным с фактчекингом. Вопросы проверки информации, поступающей в редакцию, особенно остро стали перед теми командами, которые релоцировались из Беларуси. Оставшись без «глаз и ушей» в стране, им все сложнее разделять правдивые сообщения и фейки, которые производит государственная пропаганда.

К концу 2021 года беларусская независимая журналистика оказалась в куда большей, чем раньше, зависимости от пользовательского контента, поскольку ее собственные способности оказываться в гуще событий внутри страны сильно ограничены, в том числе и соображениями безопасности оставшихся в стране журналистов. Это сказалось и на качестве контента, и на его уникальности: информаторы часто делятся своими материалами с разными каналами одновременно, а сами каналы, не получая должного количества новостной информации, вынуждены регулярно репостить чужой контент. Таким образом, одна новость в течение 5-10 минут проходит буквально по всем каналам в Telegram, делая их похожими друг на друга как однояйцевые близнецы.

Сегодня мы наблюдаем кризис новостной журналистики, при этом отмечая, что в беларусских медиа становится больше аналитических материалов, а также авторских проектов и собственных уникальных информационных продуктов.

Существует проблема с кадрами в редакциях: с одной стороны, ожидалось, что закрытие крупных редакций подпитает рынок профессионалов, с другой — многие журналисты выгорели, решили сменить профессию, остались в стране, но

не могут найти работу, поскольку выехавшие редакции не хотят подвергаться риску сотрудничества с людьми, находящимися в уязвимом положении.

Впрочем, даже при таком раскладе — слухи о смерти беларусской журналистики сильно преувеличены. Да, большинство независимых изданий общественно-политического (и не только) характера заблокированы, лишены юридического статуса, их работники частично или полностью вынуждены покинуть страну, прятать свои имена и лица, но социальные сети этих медиа в подавляющем своем большинстве продолжают работать. Поставляют на внутренний рынок и новости, и аналитику, и важные human stories (журналистский формат, на русском ближе всего понятие «человеческие истории»), запускают новые продукты. Создаются новые каналы коммуникации с аудиторией, используются новые технологические возможности.

## Оставаться с беларусами

Сегодня беларусские медиа перестраивают свои стратегии, пересматривают свои каналы распространения и коммуникации, учатся заново находить общий язык со своими аудиториями и как никогда нуждаются в поддержке, как моральной, так и материальной. Прежние бизнес-модели разрушены, и сегодня говорить о самоокупаемости беларусских независимых медиа не приходится. Те немногие из них, кто запустил систему донатов, к примеру, через платформу Patreon, пока не могут выйти на серьезную финансовую поддержку аудиторий.

В сухом остатке, сегодня мы видим, что беларусская независимая журналистика, хоть и переживает беспрецедентный профессиональный кризис, все же старается максимально придерживаться профессиональных стандартов, при этом выводя из-под удара как своих коллег, так и свои аудитории. Большинство медиа, которые летом 2020 года интенсивно работали с политической повесткой, не отступили от нее, хотя и стараются давать аудиториям, уставшим от репрессий и давления, различный контент. При этом многие редакции все еще не могут уйти от пропагандистских нарративов, уделяя немало внимания сообщениям пресс-службы Лукашенко, например. Получится ли у них выстроить новую информационную стратегию, покажет лишь время. Однако на сегодняшний день абсолютно очевидно, что несмотря на распределение, переформатирование работы и вызовы безопасности, беларусские журналисты показывают не просто волю к жизни, но желание жить и работать для Беларуси и беларусов, где бы при этом физически они не находились.

# Спіс аўтараў

Аляксандр Атрошчанкаў (Александр Отрощенков), дзеяч беларускай дэмакратычнай апазіцыі, журналіст, былы палітвязень. Сузаснавальнік і аўтар Reform.by, эксперт міжнароднай сеткі па супрацьдзеянню гібрыдным пагрозам iSANS. Прэсс-сакратар, кампаніі «Еўрапейская Беларусь» і кандыдата ў прэзідэнты Андрэя Саннікава.

Паўлюк Быкоўскі (Павел Быковский), беларускі медыяэксперт, журналіст. З 2019 года працуе ў MediaIQ «Прэс-клуба Беларусі». Быў карэспандэнтам Deutsche Welle ў Беларусі. У 1995-2015 гадах кіраваў дэпартаментам сацыяльнай-палітычнай інфармацыі штотыднёвіка «Беларусы і рынак».

Ірына Віткоўская *(псеўданім)*, журналістка, грамадская атывістка.

Марыля Гіліца *(псеўданім)*, незалежная даследчыца. Сфера дзейнасці і інтарэсаў: беларуская мова, культура і літаратура, журналістыка, сацыялагічныя даследаванні.

Мікіта Драчылоўскі (Никита Драчиловский), незалежны даследчык, юрыст, аўтар шэрагу навуковых прац на сацыяльна-прававыя і іншыя тэмы. Фокус даследчых інтарэсаў: сацыяльна-палітычная антрапалогія, прававая нявызначанасць, кампаратывізм у праве, прававое становішча штучнага інтэлекту.

Марына Дубіна (Марина Дубина), бакалаўр міжнароднага права, экалагістка і сацыяльная актывістка. Сфера інтарэсаў: мясцовыя супольнасці, адвокасі, абарона экалагічных правоў грамадзян, удзел грамадскасці.

Павал Казанецкі (Павел Казанецкий), грамадскі актывіст, гісторык і палітолаг, займаецца грамадска-палітычнымі працэсамі ва Усходняй Еўропе, сябра савета Усходнеяеўрапійскага дэмакратычнага цэнтра, каардынатар праектаў падтрымкі грамадзянскай супольнасці ў Беларусі і Украіне.

Елена Конвалле *(псеўданім)*, юрыст, грамадскі дзеяч, эксперт у галіне правоў чалавека.

Генадзь Коршунаў (Геннадий Коршунов), сацыёлаг, кандыдат сацыялагічных навук, дацэнт, старшы навуковы супрацоўнік Цэнтра новых ідэй.

Кацярына Куксо (Катерина Куксо), PhD in Education, даследчыца ў сферы адукацыі.

Аляксандр Ланеўскі (Александр Ланевский), гісторык, спецыялізацыя: гісторыя анархізму ва Усходняй Еўропе; пытанне памяці ў анархісцкім руху; грамадска-палітычная гісторыя Беларусі. Працуе ў Інстытуце гісторыі імя Тадэвуша Мантэйфеля Польскай акадэміі навук, PhD у Ягелонскім універсітэце.

Мірон Лідскі (*псеўданім*), культурніцкі менеджар, журналіст.

Вадзім Мажэйка (Вадим Можейко), даследчык палітычнай трансфармацыі, грамадзянскай супольнасці, палітычных камунікацый у новых медыя. Кандыдат культуралогіі, рэдактар «Беларускага штогодніка». Аналітык Беларускага інстытута стратэгічных даследванняў (BISS, Літва).

Кірыл Мальцаў (Кирилл Мальцев), даследчык Цэнтра еўрапейскай трансфармацыі. У галіне гуманітарных даследаванняў працуе з 2017 года. Фокус даследчых інтарэсаў: грамадзянская супольнасць, культурная палітыка, гісторыка-культурная спадчына, месцы памяці, урбаністыка.

Міхаіл Мацкевіч (Михаил Мацкевич), магістр паліталагічных навук, праваабаронца. З 2014 года працуе ў сферы мясцовага развіцця, мясцовага кіравання і самакіравання па розных тэмах. Фокус даследчых інтарэсаў: мясцовае ўпраўленне і самакіраванне.

Яніна Мельнікава (Янина Мельникова), журналіст, рэдактар, медыяменеджар. У розныя часы супрацоўнічала з друкаванымі і электроннымі незалежнымі медыямі Беларусі. З 2013 года — заснавальнік і галоўны рэдактар праекта Mediakritika.by.

Лявон Морозаў (Левон Морозов), юрыст-міжнароднік, міжнародны сакратар Беларускага нацыянальнага маладзёжнага савета «РАДА», праваабаронца, выкладчык у галіне міжнароднага права і абароны правоў чалавека, магістр юрыдычных навук, эксперт рабочай групы па правах моладзі Еўрапейскага маладзёжнага форума.

Ізабэла Нагавіца (Изабела Ногавица), палітолаг-міжнароднік, аспірантка ў Інстытуце славянскай філалогіі Вроцлаўскага ўніверсітэта. Каардынатарка медыяпраектаў Усходнееўрапейскага дэмакратычнага цэнтра.

Юрий Орловский (*псеўданім*), беларускі правазнавец, спецыяліст у галіне грамадзянскага права, правоў чалавека і менеджменту арганізацый грамадзянскай супольнасці. Выпускнік летняй школы па правах чалавека Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта.

Наталля Рабава (Наталья Рябова), дырэктар Школы маладых менеджараў публічнага адміністравання SYMPA і даследчага цэнтра BIPART. Магістр бізнес-адміністравання, сацыёлаг. Сфера навуковых інтарэсаў: дзяржслужба, грамадзянская супольнасць, сацыяльная псіхалогія.

Вадзім Саранчукоў (Вадим Саранчуков), беларускі грамадскі і палітычны актывіст. Намеснік старшыні Партыі БНФ. Выканаўчы дырэктар Гарадзенскага агенства рэгіянальнага развіцця «Кронан». Каардынатар валанцёрскага руху ByCovid19 у Гродна і міжарганізацыйнай ініцыятывы #kamanda28. Юрыст, памочнік дэпутата Гродзенскага гарсавета 24-га склікання.

Таццяна Чуліцкая (Татьяна Чулицкая), акадэмічны дырэктар Школы маладых менеджараў публічнага адміністравання SYMPA, выкладае на магістарскай праграме «Дзяржаўнае кіраванне і публічная палітыка» факультэта палітычных навук і дыпламатыі Універсітэта Вітаўта Вялікага (Літва). У 2014 годзе абараніла доктарскую дысертацыю аб наратывах сацыяльнай справядлівасці ў Беларусі ў Віленскім універсітэце (Літва).

Ева Чырвоная *(псеўданім)*, журналістка, грамадская атывістка.

Аляксандр Шрамко (Александр Шрамко), праваслаўны святар і блогер, публіцыст. У сане з 1994 года, за публіцыстычную дзейнасць зазнаў царкоўныя дысцыплінарная пакаранні. З 2018 года па цяперашні час — па-за штатам.

Аксана Шэлест (Оксана Шелест), сацыёлаг, кандыдат сацыялагічных навук, старшы аналітык Цэнтра еўрапейскай трансфармацыі. Сфера інтарэсаў: СМД-метадалогія, грамадская думка, грамадзянская супольнасць.



Пікет анархістаў у Мінску. Тры дзяўчыны і два хлопцы ў грыме Джокера выйшлі да гатэля «Марыёт» з плакатам «Мы такія шчаслівыя жыць у дыктатуры». У гатэлі ў гэты момант праходзіў міжнародны форум “Мінскі дыялог”. Адзін з удзельнікаў пікету Вячаслаў Касінераў так пракаментаваў свае дзеянні: «Клоўны не мы, а тыя, хто церпіць дыктатуру, супрацоўнічае з ёй». Фота Надзеі Бужан. Мінск, Беларусь. 10 ліпеня 2019 года.




Пікет анархістаў у Мінску. Тры дзяўчыны і два хлопцы ў грыме Джокера выйшлі да гатэля «Марыёт» з плакатам «Мы такія шчаслівыя жыць у дыктатуры». У гатэлі ў гэты момант праходзіў міжнародны форум “Мінскі дыялог”. Адзін з удзельнікаў пікету Вячаслаў Касінераў так пракаментаваў свае дзеянні: «Клоўны не мы, а тыя, хто церпіць дыктатуру, супрацоўнічае з ёй». Фота Надзеі Бужан. Мінск, Беларусь. 10 ліпеня 2019 года.



Карнавал падчас фестывалю “Vulica Brasil” у Мінску на вуліцы Кастрычніцкая. Удзельнікі карнавалу выступаюць на фоне аўтазаку. Фота Надзеі Бужан. Мінск, Беларусь. 10 жніўня 2019 года.



Дакументальна-мастацкая выстаўка “Праўда пра Курапаты” ў Мінскім Палацы Мастацтваў. Выстава прысвечана гісторыі абароны Курапатаў. Апошнія 20 гадоў ідзе бясконцы працэс абароны мемарыяла, паколькі там адбываецца вандалізм, у тым ліку і дзяржаўны. Суарганізатарам выставы выступіла аб’яднанне “Пагоня” Беларускага саюза мастакоў. Фота Надзеі Бужан. Мінск, Беларусь. 15 лістапада 2019 года..



Вечарына памяці Вацлава Гавела, якую традыцыйна арганізуе рух “За Свабоду”. На яе прыйшлі палітыкі, грамадскія дзеячы і лідары меркаванняў. Фота Надзеі Бужан. 1 кастрычніка 2020 года. Мінск, Беларусь.



Урачыстае адкрыццё абноўленай кнігарні “Логвінаў”, на якой адбылася прэзентацыя кнігі Адама Глобуса “Рыы”. Фота Надзеі Бужан. 4 кастрычніка 2020 года. Мінск, Беларусь.




Дазволены мітынг з патрабаваннем вызваліць асуджаных па наркотычнай артыкуле ў Кіеўскім скверы ў Мінску. Мітынг быў арганізаваны жанчынамі з руху "Матулі 328", чые дзеці асуджаныя за распаўсюд наркотыкаў, а таксама актывісты грамадскай кампаніі "Легалайз Беларусь". Фота Надзеі Бужан. 30 мая 2019 года. Мінск, Беларусь.



Ноч расстраляных паэтаў у Курапатах. Яна праводзіцца ў памяць пра ноч з 29 на 30 кастрычніка 1937 года, калі саветы расстралялі больш за 100 дзеячоў беларускай інтэлігенцыі. Фота Надзеі Бужан. 29 кастрычніка 2019 года. Мінск, Беларусь.



Ноч расстраляных паэтаў у Курапатах. Яна праводзіцца ў памяць пра ноч з 29 на 30 кастрычніка 1937 года, калі саветы расстралялі больш за 100 дзеячоў беларускай інтэлігенцыі. Фота Надзеі Бужан. 29 кастрычніка 2019 года. Мінск, Беларусь.



Каталіцкі арцыбіскуп Тадэвуш Кандрусевіч, святар Фёдар Поўны разам з актывістамі праўладнай арганізацыі БРСМ моляцца ля помініку загінулых ва ўрочышчы "Курапаты". Гэтая нетыповая малітва адбылася паводле праўладнай акции «Аднаўленне святыняў. Крыніцы Беларусі». Гэта ініцыятыва БРСМ, якую арганізацыя праводзіць ужо даўно і аднаўляе штосьці кожны год: то касцёлы, то крыніцы, то помнікі. Адметна, што гэтае мерапрыемства вырашылі спалучыць з візітам у Курапаты. Фота Надзеі Бужан. 19 верасня 2019 года. Мінск, Беларусь.



Вечарына, прысвечаная Таварыству Беларускай мовы. фота Надзеі Бужан. 9 чэрвеня 2019 года. Мінск, Беларусь.



Пісьменнік Ілля Сін падчас узнагароды літаратурнай прэміі імя Ежы Гедройца ў прасторы ZAL#2 мінскага Палацу мастацтваў. У 2019 годзе ягоная кніга “Libido” стала пераможцам прэміі. Фота Надзеі Бужан. 25 верасня 2019 года. Мінск, Беларусь.



Цырымонія перапахавання ўдзельнікаў паўстання Кастуся Каліноўскага, пакараных у 1864 годзе. Фота Надзеі Бужан. 22 лістапада 2019 года. Вільня, Літва.




Свята «Мова Фэст» да Міжнароднага дня роднай мовы ў мінскім культурным хабе “ОК 16”. Фота Надзеі Бужан. 22 лютага 2020 года. Мінск, Беларусь.



Традыцыйны мірны нядзельны марш нязгодных з вынікамі Прэзідэнцкіх выбараў. Гэты марш называўся "Марш Партызан", бо праходзіў па партызанскім праспекце ў Мінску. Фота Надзеі Бужан. 18 кастрычніка 2020 гады. Мінск, Беларусь.



Святлана Ціханоўская падчас прэзідэнцкай кампаніі прыехала на сустрэчу з Брэстам, дзе сабралася каля 20 тыс. чалавек. Аб’яднаны штаб адправіўся ў тур па гарадах. Нават у райцэнтрах іх мітынгі збіралі тысячы чалавек. Фота Надзеі Бужан. 2 жніўня 2020. Брэст, Беларусь.



Першы і самы масавы нядзельны марш супраць фальсіфікацый выбараў прэзідэнта Беларусі ў 2020 годзе. Гэты марш назвалі “Марш за свабоду”. На сёмы дзень пратэстаў у Мінску на вуліцу выйшла каля 200 тыс. людзей нязгодных з вынікамі галасавання. Яны выступалі за мірныя перамены і патрабавалі спыніць гвалт. Фота Надзеі Бужан. 16 жніўня 2020. Мінск, Беларусь.



“Марш за свабоду” - другі нядзельны марш супраць фальсіфікацый выбараў прэзідэнта Беларусі ў 2020 годзе. Фота Надзеі Бужан. 23 жніўня 2020 года. Мінск, Беларусь.



Мінак вітае мірную калону пратэстоўцаў, якая рухаюцца ў бок дома Ураду і плошчы Незалежнасці, каб паказаць сваю нязгоду з падлікам галасоў на выбарах прэзідэнта Беларусі ў 2020 годзе. Фота Надзеі Бужан. 13 жніўня 2020 года. Мінск, Беларусь.




Дзяўчаты ў белым з кветкамі заклікаюць уладу і сілавікоў спыніць гвалт. Жанчына стаяць на фоне дома Ураду і ачаплення з сілавікоў. Фота Надзеі Бужан. 13 жніўня 2020 года. Мінск, Беларусь.



Ніна Багінская нясе бела-чырвона-белы сцяг на суботнім жаночым маршы супраць гвалту і фальсіфікацый выбараў прэзідэнта Беларусі перад калоный з сілавікоў. Удзельніцы горача яе віталі, скандавалі яе імя. Фота Надзеі Бужан. 29 жніўня 2020 года. Мінск, Белраусь.



Мужчына з бел-чырвона-белым сцягам на спіне стаіць перад вадамёт. Вадамёт выйшаў са строю падчас спробы разгону ўдзельнікаў мірнага нядзельнага маршу нязгодных з вынікамі прэзыдэнцкіх выбараў. Фота Надзеі Бужан. 4 кастрычніка, 2020 года. Мінск, Беларусь.



Жанчыны ляглі на дарогу перад сілавікамі падчас нядзельнага маршу. Беларусь ахапіла хваля мірных пратэстных акцый і маршаў, дзе людзі выказвалі сваю нязгоду з падлікамі галасоў на выбарах Прэзідэнта Беларусі ў 2020 годзе. Фота Надзеі Бужан. 30 жніўня 2020. Мінск, Беларусь.




Сілавікі і пратэстоўцы падчас аднаго з мірных нядзельных маршаў. Беларусь ахапіла хваля мірных пратэстных акцый і маршаў, дзе людзі выказвалі сваю нязгоду з падлікамі галасоў на выбарах Прэзідэнта Беларусі ў 2020 годзе. Фота Надзеі Бужан. 30 жніўня 2020.



Дзяўчыны нясуць бела-чырвона-белы сцяг падчас аднаго з мірных нядзельных маршаў. Беларусь ахапіла хваля мірных пратэстных акцый і маршаў, дзе людзі выказвалі сваю нязгоду з падлікамі галасоў на выбарах Прэзідэнта Беларусі ў 2020 годзе. Фота Надзеі Бужан. 30 жніўня 2020.



Дзяўчаты цалуюцца на фоне “сцяны” з сілавікоў. Фота зроблена падчас традыцыйнага мірнага нядзельнага маршу нязгодных з вынікамі прэзідэнцкіх выбараў. Фота Надзеі Бужан. 30 жніўня 2020. Мінск, Беларусь.




АМАП затрымлівае студэнтаў падчас іх шэсця па горадзе. Студэнты выйшлі на сваю першую пратэстную акцыю супраць фальсіфікацыі выбараў у Дзень ведаў (У Рэспубліке Беларусь 1 верасня - гэта свята пад назвай “Дзень ведаў”). Пасля пачаліся сядзячыя пратэсты ў холах і на прыступках універсітэтаў. Фота Надзеі Бужан.1 верасня 2020 года. Мінск, Беларусь.



Традыцыйны мірны нядзельны марш нязгодных з вынікамі Прэзідэнцкіх выбараў. Гэты марш называўся “Марш Партызан”, бо праходзіў па партызанскім праспекце ў Мінску. Фота Надзеі Бужан. 18 кастрычніка 2020 гады. Мінск, Беларусь.



Супрацоўнік АМАПу аказвае першую дапамогу жанчыне, якая пацярпела падчас разгону мірных дэманстрантаў нязгодных з вынікамі прэзыдэнцкіх выбараў. Людзі выйшлі на вуліцы ў дзень, калі Аляксандр Лукашэнка правёў таемную інаўгурацыю. Фота Надзеі Бужан. 23 верасня, 2020. Мінск, Беларусь.



Дзень выбараў. Мужчына стаіць на каленях перад ачапленнем сілавікоў. Людзі выйшлі ў той вечар на вуліцу, каб выказаць сваю нязгоду з папярэднімі вынікамі галасавання. Фота Надзеі Бужан. 9 жніўня 2020. Мінск, Беларусь.



Дзень выбараў Пратэстуючы спрабуе спыніць аўтазак, які на хуткасці заехаў у людзей ззаду. Сілавікі выкарыстоўвалі светлашумавыя гранаты і гумовыя кулі для разгону дэманстрантаў. Адзін з аўтазакаў заехаў у натоўп ззаду. У апошні момант людзі зразумелі, што на іх едзе вайсковая машына. Некаторыя адбегліся. Іншая частка натоўпу спрабавала спыніць машыну і заскочыць на яе. Гэта ўсё адбывалася на хуткасці. Аднаму з пратэстуючых удалося забрацца на кабіну і павіснуць спераду перад вадзіцелем. Пазней ён упаў пад колы машыны. Хлопец атрымаў траўмы, але застаўся жывы. Фота Надзеі Бужан. 9 жніўня 2020. Мінск, Беларусь.



На фота група вайскоўцаў адціскае пратэстуючых з дапамогай стральбы і светлашумавых гранат. На вуліцы ў той момант знаходзіцца было небяспечна. Было зусім незразумела, якой логікай кіруюцца сілавікі пры затрыманні людзей. Фота Надзеі Бужан. 10 жніўня 2020. Мінск, Беларусь.



Эмоцыі дзяўчыны, якая толькі што пабачыла жорсткія затрыманні пратэстоўцаў, якія выйшлі на вуліцы, каб паказаць сваю нязгоду з вынікамі прэзыдэнцкіх выбараў. Людзі выйшлі на вуліцы ў дзень, калі Аляксандр Лукашэнка правёў таемную інаўгурацыю. Фота Надзеі Бужан. 23 верасня, 2020. Мінск, Беларусь.



Дзяўчына вітае ўдзельнікаў “Маршу за свабоду”. Гэта быў другі нядзельны марш супраць фальсіфікацый выбараў прэзідэнта Беларусі ў 2020 годзе. Фота Надзеі Бужан. 23 жніўня 2020 года. Мінск, Беларусь.



Вольга Севярынец чакае свайго мужа Паўла каля цэнтра ўтрымання пад вартай на вуліцы Акрэсціна. Фота Надзеі Бужан. 22 чэрвеня 2020 года. Мінск, Беларусь. Паўла Севярынца трымалі пад вартай з 7 чэрвеня, і ягоная сям’я даведалася, што яго збіраюцца вызваліць. Вольга чакала каля будынку турмы дзве гадзіны, але Паўла не вызвалілі. Павал Севярынец - палітык ад хрысціянскіх дэмакратаў і вядомы палітычны актывіст. Ён з’яўляецца адным з заснавальнікаў Маладзёжнага фронту, маладзёжнага руху ў падтрымку грамадзянскай супольнасці, заснаванага на хрысціянска-дэмакратычных прынцыпах і свабодным рынку, а таксама ўтварэння моладзі для адраджэння беларускай нацыянальнай культуры і мовы. Ён быў арыштаваны падчас збору подпісаў у падтрымку кандыдатаў, якія павінны былі выступіць супраць прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі, які прэтэндуе на шосты прэзідэнцкі тэрмін запар. Лукашэнка знаходзіцца ва ўладзе з 1994 года. СМІ празвалі яго “апошнім дыктатарам Еўропы”, ён часта душыў апазіцыю, і на пяці папярэдніх выбарах яму не было кінута сур’ёзнага выкліку. Amnesty International лічыць Паўла Севярынца вязнем сумлення. У пачатку 2021 года ён усё яшчэ знаходзіўся ў турме, часткова ў адзіночнай камеры і не меў магчымасці сустрэцца з адвакатам. Яму адмовілі ў доступе да кніг і тэлебачання, а Біблію ў яго адабралі.



Стыхійная жаночая акцыя з мэтай спыніць гвалт у дачыненні да пратэстоўцаў нязгодных з падлікам галасоў на выбарах Прэзідэнта Блеарусі ў 2020 годзе. Фота Надзеі Бужан. 13 жніўня 2020 года, Мінск, Беларусь.



Мужчына трымае бела-чырвона-белы сцяг падчас мірнага нядзельнага маршу нязгодных з вынікамі прэзыдэнцкіх выбараў у Беларусі. Фота Надзеі Бужан. 4 кастрычніка, 2020 года. Мінск, Беларусь.



На волю з турмы выходзяць затрыманыя падчас першых трох дзён пратэстаў. Людзі, якія былі затрыманыя ў першыя пару дзён пратэстаў, расказвалі шакуючыя гісторыі зместу. Іх жорстка збівалі, не давалі піць ваду і здзекаваліся маральна. Частку людзей з ізалятара вывозілі на хуткіх адразу ў рэанімацыю. Фота Надзеі Бужан. 13 жніўня 2020. Мінск, Беларусь.



Мужчына раздае кветкі мінакам у знак салідарнасці з пратэстоўцамі, якія заклікаюць уладф і сілавікоў спыніць гвалт. Фота Надзеі Бужан. 13 жніўня 2020 года.



Жанчыны-удзельніцы суботняга мірнага жаночага марша супраць гвалту патрабуюць адпусціць затрыманых дзяўчат, якіх жорстка затрымалі ў ты дзень - іх цягалі за валасы, кідалі ў аўтазак. Фота Надзеі Бужан. 12 верасня 2020 года, Мінск, Беларусь.



Дзяўчына з кветкай стаіць каля аўтазаку, у якім трымаюць яенага хлопца, якога пару хвілін таму затрымалі сілавікі. Падзеі адбываюцца на мірным жаночым маршы, дзе пратэстоўцы заклікалі спыніць гвалт і паказвалі сваю нязгоду з падлікамі галасаоў на выбараз Прэзідэнта Беларусі ў 2020 годзе.  Фота Надзея Бужан. 29 жніўня 2020 года. Мінск, Беларусь.



Нядзельны марш супраць фальсіфікацый выбараў прэзідэнта Беларусі ў 2020 годзе. Гэты марш назвалі “Марш за свабоду”. На сёмы дзень пратэстаў у Мінску на вуліцу выйшла каля 200 тыс. людзей нязгодных з вынікамі галасавання. Яны выступалі за мірныя перамены і патрабавалі спыніць гвалт. Фота Надзеі Бужан. 16 жніўня 2020. Мінск, Беларусь.



Развітанне з палітзняволеным Вітольдам Ашуркам. Ён быў асуджаны да пяці гадоў пазбаўлення волі і памёр у шклоўскай калоніі пры нявысветленых абставінах. Паводле афіцыйнай версіі, у палітвязня спынілася сэрца. Вядома, што апошнія дні яго трымалі ў ШІЗА. Вітольда пахавалі ў роднай Бярозаўцы пад бел-чырвона-белым сцягам. Фота Надзеі Бужан. 26 мая 2021 года. Бярозаўка, Беларусь.



Дзяўчына ляжыць на бела-чырвона-белым сцяге напрыканцы нядзельнага маршу супраць фальсіфікацый выбараў прэзідэнта Беларусі ў 2020 годзе. Гэты марш назвалі "Марш за свабоду". На сёмы дзень пратэстаў у Мінску на вуліцу выйшла каля 200 тыс. людзей нязгодных з вынікамі галасавання. Яны выступалі за мірныя перамены і патрабавалі спыніць гвалт. Фота Надзеі Бужан. 16 жніўня 2020. Мінск, Беларусь.

Гэты зборнік першапачаткова задумваўся як традыцыйны агляд стану і развіцця беларускай грамадзянскай супольнасці за папярэдні перыяд. У фокусе ўвагі павінны былі быць 2015-2020 гады — параўнальна спрыяльны перыяд як для трэцяга сектара, так і для эканамічнага і сацыяльнага развіцця Беларусі ў цэлым. Сёння, у 2022 годзе, відавочна, што ні трэці сектар, ні Беларусь, ні ўвесь рэгіён ніколі не вернуцца ў былы стан рэчаў. Падзеі 2020-2021 гадоў у Беларусі і вайне, развязаныя ў лютым 2022 г. ва Украіне, так ці інакш прывядуць да значных змен, прынамсі ў Еўропе.

Таму першая частка зборніка прысвечана суб'ектам, працэсам і тэндэнцыям у сферы арганізацый грамадзянскай супольнасці ў 2015-2020 гадах. Акрамя аналізу развіцця грамадскіх арганізацый і ініцыятыў у традыцыйнай логіцы тэматычных напрамкаў дзейнасці (экалогія, сацыяльныя праекты, культура, нацыянальныя меншасці і да т.п.), у гэтым раздзеле мы паспрабавалі таксама закрануць некаторыя аспекты і інфраструктурныя працэсы, якія ствараюць новыя ўмовы для развіцця АГС.



Другая частка зборніка прысвечана спробе хаця б часткова апісаць і асэнсаваць уласна падзеі 2020-2021 года — іх перадумовы, характарыстыкі, маштабы. Тэксты ў гэтай частцы могуць быць даволі дыскусійнымі і нават правакацыйнымі, але мы спадзяемся, што яны стануць унёскам не толькі ў фіксацыю, але і ў разуменне і інтэрпрэтацыю складаных і супярэчлівых працэсаў гэтага этапу беларускай гісторыі.